№ 44 (546) 29 лістапада 2007

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

# Дэбаты: Вячорка, Івашкевіч і Міхалевіч

Зьезд Партыі БНФ, на якім адбудуцца выбары старшыні партыі, адрадзіў публічную палітычную дыскусію. Карэктная і адначасова напружаная — яна прыцягнула ўвагу да альтэрнатываў палітычнае тактыкі. На пытаньні чытачоў сайту nn.by у рэжыме рэальнага часу адказалі палітыкі **Вінцук Вячорка, Віктар Івашкевіч** і **Алесь Міхалевіч. Старонка 3.**



## Лявон Вольскі: «Ніхто з тых музыкаў на гандаль ня пойдзе»

Вольскі, Кульлінковіч, Хаменка, Супрановіч расстаўляюць кропкі над «і» пасьля выкліку да шэф-ідэоляга лукашэнкаўцаў.

**Старонка 27.**

## У НУМАРЫ

**Юшчанка заклікаў прыбраць ленінаў**

24 лістапада Ўкраіна ўшанавала памяць Галадамору — штучнага голаду, арганізаванага камуністычнаю ўладаю ў 1932—1933 гг. **Старонка 12.**

**Лукашэнка заклаў капсулу пад магілёўскую Ратушу**

сымбаль гарадзкой вольнасьці і эўрапейскай прыналежнасьці гораду на Дняпры будзе адноўлены. **Старонка 14.**

**Зьміцер Вайцюшкевіч**

прэзэнтаваў альбом на вершы Генадзя Бураўкіна. **Старонка 17.**

# Дзе Ірына Кужэльная?

Трагедыя беларускай вёскі праз драму адной дзяўчынкі зь вёскі Алекшыцы Лагойскага раёну.

Ірына Кужэльная зьнікла 23 лістапада. Сямігадовая дзяўчынка пасьля ўрокаў, каля 13.30, выйшла са школы, але дахаты так і не прыйшла. Адлегласьць ад школы, што ў вёсцы Бяларучы, да дому ў вёсцы Алекшыцы — кіляметры два. Маці надта не перажывала... **Старонка 24.**



## Сустрэча з рэдактарамі «Arche» і «Нашай Нівы» ў Занарачы і ў Берасьці

**30 лістапада ў вёсцы Занарач (Мядзельшчына)** будзе сустрэча з рэдактарам «Arche» Валер’ем Булгаквым і рэдактарам «НН» Андрэем Скуркам. Даведкі: 314–93–45 (Зьміцер). **6 сьнежня** Булгакаў, Скурко і пісьменьніца Наталка Бабіна наведаюць **Берасьце (вул. Маладагвардзейская, 16/1)**. Даведкі: 660–57–41, 724–21–16 (Зьміцер).

## ПАКУЛЬ ВЯРСТАЎСЯ НУМАР

### Ван дэр Ліндэн заклікаў Лукашэнку адмяніць тры сьмяротныя прысуды

Прэзыдэнт Парлямэнцкай асамблеі Рады Эўропы Рэнэ ван дэр Ліндэн заклікаў беларускія ўлады замяніць на больш мяккія сьмяротныя прысуды верхаводам гомельскай «банды Марозава» — Сяргею Марозаву, Ігару Данчанку і Валер’ю Гарбатаму. Ван дэр Ліндэн заклікаў А.Лукашэнку абвясьціць мараторый на выкананьне сьмяротных пакараньняў у якасьці яснага і пэўнага кроку ў кірунку набліжэньня Беларусі да Рады Эўропы.

**Радыё «Свабода», СМ**

### Пасол Грузіі ў найбліжэйшы час прыбудзе ў Менск

Давід Залкаліяні прызначаны надзвычайным і паўнамоцным паслом у Беларусі ў верасьні. Асаблівы ўпор у сваёй працы ён мае намер зрабіць на разьвіцьці эканамічных сувязяў. Д.Залкаліяні — кар’ерны дыпламат. Працаваў у Аўстрыі і ЗША, Узбэкістане і Таджыкістане. Са студзеня 2007 — дырэктар дэпартамэнту глябальных адносін МЗС.

**ІА «Новости-Грузия»**

**Шаноўныя людзі!**

«Наша Ніва» шукае распаўсюднікаў для продажу газэты на вуліцах і ў электрычках. Справа выгадная і надта патрэбная.

Продаж ажыцьцяўляецца на аснове дамоваў.

Зьвяртацца праз тэл.:
(017) 284–73–29, (029) 260–78–32, (029) 618–54–84

**Андрэй Хадановіч**

Першая аўдыёкніжка *з музычным суправаджэньнем*

з сэрыі

«Дыскарня «Наша Ніва»

Рэжысэр Дзьмітры Дзьмітрыеў







шукайце ў незалежных распаўсюднікаў

## КАМЭНТАР РЭДАКЦЫІ

# Комплекс уласнай непаўнавартасьці рокераў

Беларусы маюць заніжаную самаацэнку. Комплекс уласнай непаўнавартасьці — гэта даўняя нацыянальная хвароба, вынік працяглага каляніяльнага прыгнёту і самаадрачэньня. Чарговы раз гэта выявілася ў нашых музыках.

Раз іх запрасіў Праляскоўскі, значыць, улады неабыяк маюць патрэбу ў іх. З добрае душы гэты не пакліча. Гадамі выразалі любую згадку пра Вольскага, пісалі пасквілі, а тут расчуліліся. Кракадзілавы сьлёзы! Напэўна, значным тут быў чыньнік «Белсату». Лукашэнкаўцы сьвята вераць у магічную сілу ТВ. Хутка свабодныя музыкі стануць ня толькі чутныя, а й бачныя беларусам.

Пры таталітарным рэжыме любы зварот да ўладаў павышаў ступень абароненасьці дысыдэнтаў. Большасьць людзей у Беларусі працягвае дзейнічаць у праекцыі на савецкі час. Вось жа, музыкі пайшлі да чалавека, які ўзначальвае неканстытуцыйную, нават антыканстытуцыйную «ідэалягічную вэртыкаль» — фактычна, сыстэму сачэньня за грамадзтвам, здушэньня іншадумства і абслугоўваньня інтарэсаў аднае палітычнае групоўкі, фінансаваную зь дзяржаўнай кішэні.

Запрошаныя музыкі маглі дыктаваць свае ўмовы, ставіць любыя патрабаваньні. А яны разгубіліся перад псыхолягам з КГБ. Які ўжыў тактыку, правераную яшчэ на савецкіх дысыдэнтах: спачатку давесьці да роспачы, на тры гады пазбавіць легальнага заробку, а пасьля прапанаваць «дыялёг». Чалавек растае перад такой адэкватнасьцю…

Ды толькі ня ўсё, што спрацоўвала ў савецкі час, працуе ў эўрапейскай Беларусі. Грамадзтва ўспрыняло візыт музыкаў да Праляскоўскага зь вялікай цікавасьцю. Кракадзілавым сьлязам даўно ніхто ня верыць. Камэнтары аб тым, што ўлады захацелі дыялёгу, але апазыцыя на яго ня здольная, нікога не ашукаюць. А вось факт чарговага падману: паабяцаць дазвол канцэртаў і ня даць — будзе мець водгук. Больш за тое, кожнае такое спатканьне навучае беларускіх дзеячоў мудрасьці і прадбачлівасьці, здольнасьці адэкватнага дзеяньня. Яны разьвітваюцца з уласнымі комплексамі.

Калі дзьверы Праляскоўскага замкнуліся, самі музыкі і іхныя прадусары сталі асэнсоўваць: што ж адбылося.

Паўсталі рэфлексіі, цікавыя часам культурна, а часам і палітычна. Віталь Супрановіч: «Ніколі не кажы ніколі» — старонка 29. Лявон Вольскі: «Ніхто з музыкаў на гандаль ня пойдзе» — старонка 27. Аляксандар Кульлінковіч: «На нас вылілі багата г..на» — старонка 28.

# Дэбаты он-лайн: Вінцук Вячорка, Віктар Івашкевіч і Алесь Міхалевіч

Зьезд Партыі БНФ, на якім адбудуцца выбары старшыні партыі, адрадзіў публічную палітычную дыскусію. Карэктная і адначасова напружаная — яна прыцягнула ўвагу да альтэрнатываў палітычнае тактыкі. 22 лістапада з 12:00 па 14:00 на пытаньні чытачоў сайту www.nn.by у рэжыме рэальнага часу адказвалі палітыкі **Вінцук Вячорка**, **Віктар Івашкевіч** і **Алесь Міхалевіч**.

Нагадаем, што 8—9 сьнежня ў Палацы культуры МАЗ пройдзе чарговы справаздачна-выбарчы зьезд ПБНФ. На старшынства ў партыі прэтэндуюць сёньняшні кіраўнік БНФ Вінцук Вячорка, а таксама ягоныя намесьнікі Віктар Івашкевіч і Алесь Міхалевіч.



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Вінцук Вячорка** нарадзіўся 7 ліпеня 1961.

У 1983 г. скончыў філялягічны факультэт БДУ, у 1986 г. асьпірантуру пры Інстытуце мовазнаўства Акадэміі навук. З 1986 г. выкладаў у Менскім дзяржаўным пэдагагічным інстытуце (цяпер Беларускі дзяржаўны пэдагагічны унівэрсытэт). З 1990 г. працаваў выкладчыкам у Беларускім гуманітарным ліцэі, быў намесьнікам рэдактара часопісу «Спадчына». Аўтар абноўленага зводу правілаў клясычнага правапісу беларускай мовы. Быў адным з заснавальнікаў «Майстроўні» (1979—1984), ініцыятараў стварэньня «Талакі» (1986—1989).

У 1988 г. стаў адным з заснавальнікаў «Беларускага Народнага Фронту» за перабудову «Адраджэньне». Два гады (1996—1998) пражыў пад крымінальнай справай за арганізацыю маніфэстацыяў у абарону незалежнасьці ў 1996. З 1999 г. — старшыня Партыі БНФ.

Мае трое дзяцей — Радаславу, Франака і Ружану — і ўнука Даніка. Ягоны сын Франак ужо й сам бярэ актыўна ўдзел у палітыцы і грамадзкім жыцьці.

**Віктар Івашкевіч** нарадзіўся 21 верасьня 1959 г.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Пачынаў працоўны шлях на чыгунцы, дзе адпрацаваў восем гадоў. Скончыў завочна факультэт журналістыкі БДУ (1991). У пачатку 1980-ых браў актыўны ўдзел у моладзевых арганізацыях «Майстроўня» і «Талака».

З 1997 г. — галоўны рэдактар газэты «Рабочы». У кастрычніку 2002 г. быў асуджаны да двух гадоў абмежаваньня волі за публікацыю артыкулу «Злодзей павінен сядзець у турме», у якім пракуратура ўбачыла паклёп на прэзыдэнта. Адбыў пакараньне ў Баранавічах, працуючы кур'ерам мясцовай газэты «Intex-press». Намесьнік старшыні Партыі БНФ з 1999 г.

Жанаты, мае сына Стася, які навучаецца ва ўнівэрсытэце ў Чэхіі.

**Алесь Міхалевіч** нарадзіўся 15 траўня 1975 г.

У ліку першых выпускнікоў скончыў Беларускі гуманітарны ліцэй (1992). Скончыў юрфак Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту (1999). Узначальваў Задзіночаньне беларускіх студэнтаў (1995—1999).

Намесьнік старшыні Партыі БНФ з 2003 г. Адзіны з прэтэндэнтаў быў дэпутатам — Пухавіцкага райсавету (2003—2007). Каардынаваў дзейнасьць Асамблеі дэпутатаў мясцовых саветаў.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Жанаты, гадуе дачку Лесю-Стэфанію. Адзіны з прэтэндэнтаў вядзе ўласны жывы дзёньнік.

Усе трое далі ці даюць дзецям беларускамоўную адукацыю. Усе трое ня раз арыштоўваліся за беларускую дзейнасьць.

**— Хто ў вас бацькі? Зь якіх сем'яў вы? Адкуль ваш род? іван**

**Вінцук Вячорка:** Ведаю продкаў да пятага калена. Мяшчане з Гарадной і Давыд-Гарадка. Дзед Мікалай з сынамі ў міжваенны час адваяваў у балота кавалак зямлі на Мярлінскіх хутарох. У 1960-м зямлю забралі «саветы» пад авіяцыйны палігон. Нябожчык бацька — спэцыяліст па макраэканоміцы, працаваў на дзяржаўных пасадах, у канцы 1980-х — аўтар Канцэпцыі эканамічнага суверэнітэту Беларусі. Маці — пэдагог.

**Віктар Івашкевіч:** Па бацькоўскай лініі прадзед Антон Івашкевіч зь безьзямельнай каталіцкай шляхты, быў упраўляючым заводу ў Менску. Дзед Іван Івашкевіч працаваў рабочым на заводзе ў Менску. Бацька Антон працаваў інжынэрам-энэргетыкам, цяпер на пэнсіі. Па мацярынскай лініі, дзед Вікенці з праваслаўных сялянаў Віленскай губэрні, з 1914 па 1920 г. ваяваў за цара, за Часовы ўрад, за расейскі Ўстаноўчы сход, за Калчака, за бальшавікоў. Потым працаваў рабочым у Менску. Маці — інжынэр-фізык. Жонка Алена Радкевіч — карэспандэнтка радыё «Свабода». Сын Стані-

**Працяг на старонцы 4.**

# Дэбаты он-лайн: Вінцук Вячорка, Віктар Івашкевіч і Алесь Міхалевіч

**Працяг са старонкі 3.**

слаў — студэнт Вышэйшай эканамічнай школы ў Празе. Унуку — Марку — 1 год.

**Алесь Міхалевіч:** Бацька з Пухаўшчыны, маці са Станькава — на Койданаўшчыне. Бацька з праваслаўнай сям'і, маці — з каталіцкай. Нарадзіўся ў Менску, усім бабулям і дзядулям пашчасьціла атрымаць вышэйшую адукацыю. Дзяды загінулі падчас Другой сусьветнай.

**— Чаму эфэктыўнасьць акцыяў ПБНФ вельмі нізкая? Kandratowic**

**ВІ:** Па-першае, у пытаньні трэба было ўказаць, якога пэрыяду БНФ. У 1990—1991 гг. БНФ фактычна кіраваў рабочымі страйкамі і антыкамуністычнымі маніфэстацыямі. Але заўсёды пасьля рэвалюцыйнай хвалі ў грамадзтве наступае спад. Фронт вытрымаў яго і зьяўляецца на сёньня самай вялікай партыяй. Усе масавыя акцыі ў гэтым годзе ўзначальваюцца БНФ, а іншых няма. Я перакананы, што ў наступным годзе БНФ удадуцца нашмат больш масавыя акцыі, каб прабіць стварэньне фракцыі БНФ у палаце прадстаўнікоў.

**АМ:** Большасьць нашых прыхільнікаў ня бачыць пасьпяховасьці масавых акцыяў, таму для пачатку трэба знайсьці іншыя эфэктыўныя формы, сканцэнтравацца на данясеньні інфармацыі да людзей, і тады ў пэўны момант акцыі стануць па-сапраўднаму масавымі.

**ВВ:** Такія акцыі, як «Адзіны кандыдат-2006»: Фронт мае рэальны патэнцыял. Адміністрацыя сапраўды апошнім часам хібіла. Маючы досьвед, раблю прапановы.

Для новаабраных намесьнікаў старшыні трэба загадзя вызначыць сфэры адказнасьці, каб не было як цяпер (некаторыя не адказваюць і самі не бяруцца ні за які кірунак, але ходзяць са статусам намесьніка старшыні). Гэтыя сфэры: арганізацыйна-праўныя пытаньні й выбарчыя кампаніі; рэгіянальная палітыка; ідэалягічна-інфармацыйны кірунак; палітычныя кампаніі.

Як бачу сваю ролю як старшыні ў гэтым падзеле працы?

Быць гарантам ідэйнай цэласьці БНФ як незалежніцкай сілы. Годна прадстаўляць Фронт у перамовах з калегамі-кааліцыянтамі, іншаземцамі, а калі даможамся — то і з уладай. Курыраваць міжнародную палітыку. Умацоўваць традыцыйныя сувязі з нацыянальнай навуковай і творчай элітай, бо ведаю іхныя каштоўнасьці й патрэбы. Нарошчваць удзел у кіроўных органах БНФ моладзі. Я гарантую галоўнае: незалежніцкая партыя і надалей будзе незалежнай у сваіх рашэньнях.

Ад пачатку свайго старшынства я няўхільна аднаўляю унутрыпартыйную дэмакратыю. Ніводнае рашэньне цяпер не прымаецца адвольна, а толькі калектыўна. Я і надалей не дапушчу, каб у БНФ упаўзла плесьня карупцыі, каб нехта казаў: «Дам вам грошы, а вы рабіце тое і тое, галасуйце за таго, а на тую пасаду пастаўце таго».

Што будзе новае? Запрашу вярнуцца ў БНФ тых, хто з розных прычынаў адышоў, але паводле поглядаў і маральных якасьцяў застаўся фронтаўцам.

Кіраўнікі арганізацыяў БНФ у абласцях і буйных гарадах будуць зьбірацца разам са старшынём і намесьнікамі што два тыдні — для стратэгічнага й тактычнага пляняваньня, падрыхтоўкі палітычных рашэньняў. У выязных паседжаньнях Сойму і Ўправы будуць браць удзел усе фронтаўцы тае мясьціны, куды едзем.

**— На сайце nn.by цытавалі сп.Беленькага: «Мы прапаноўвалі: дайце нам маленькі пакойчык ва Ўправе. Нават на гэты крок яны не пайшлі. Пра што тады казаць? Літаральна месяц назад я размаўляў зь Вячоркам і зноў падымаў гэтае пытаньне. Ізноў адмова». У мяне пытаньне да кожнага з кандыдатаў (Вячоркі, Івашкевіча і Міхалевіча) — ці гатовыя яны даць магчымасьць КХП займаць «маленькі пакойчык»? Калі так, дык на якіх умовах? р-і**

**ВВ:** Чыстую праўду напісаў Беленькі, акрамя двух момантаў. 1) Гэта ня ён са мной, а я зь ім размаўляў. 2) І не пра пакойчык, а пра 600 тысячаў рублёў. А ў астатнім чыстая праўда: ізноў адмова. Толькі не мая, а Беленькага: ён адмовіўся аддаць нам тыя грошы, хоць гэта штраф, які выпісалі КХП, а плаціць вымушалі нас.

І больш ня буду адказваць на пытаньні-заклінаньні зь віртуальнага сьвету пра КХП ды іхныя камунальныя свары. Лепш зьберагу час для пытаньняў пра рэальныя справы й праблемы.

**ВІ:** Сёньня другі раз нам прыходзіць, што суд здымае з рахункаў Партыі БНФ грошы за пакрыццё штрафаў КХП-БНФ. Ужо такіх было на 800 даляраў. Мы зьвярталіся да сп. Беленькага, каб ён нам вярнуў грошы, але мы ня хочам падаваць у суд на КХП-БНФ, каб ня ўцягваць дзяржорганы ў нашыя фінансавыя спрэчкі. Што тычыцца ідэалягічна-арганізацыйнай працы, то мы заўсёды запрашаем сяброў КХП на ўсе акцыі, якія мы ладзім. І большасьць зь іх бяруць удзел у нашых мерапрыемствах. Мы разам удзельнічалі ў арганізацыі шэсьця на Дзяды. І буду прапаноўваць сп. Беленькаму сустрэцца, каб абмеркаваць нашыя акцыі на сьвяткаваньне 25 сакавіка 2008 г.

**АМ:** Гуртаваньне ўсіх нацыянальных сілаў — на грунце салідарнасьці і ўзаемадапамогі, на грунце ясных справаў я ўважаю сваёй асноўнай мэтай на пасадзе старшыні партыі. Калі нічога не перашкаджае маёй дачцэ і дачцэ Юрася Беленькага навучацца разам у адной клясе беларускай гімназіі, дык нішто не зашкодзіць і мне зь ім працаваць для Беларусі па адным адрасе. І пакойчык, і заля, калі трэба — ад 10 сьнежня запрашаю.

**— Як кожны з кандыдатаў ставіцца да Пазьняка і ягонай цяперашняй дзейнасьці? sid**

**АМ:** Гісторыя ня ведае ўмоўнага ладу, але дазволю сабе дапусьціць, што калі б не Пазьняк — Беларусь магла б і не здабыць незалежнасьці ў пачатку 1990-х. Ужо адно гэта не дазваляе мне крытыкаваць яго тут і цяпер. Талент Пазьняка — натхняць і пераконваць людзей, нават працiўнікаў. Менавіта з пачутага ад Пазьняка — падлеткам яшчэ — я пачаў свой шлях у нацыянальным руху. Гэты талент не саслаб, здаецца, і сёньня. Як і талент стратэгічнага аналізу. Рэжым ведае, што робіць, калі ізалюе Пазьняка ў выгнаньні.

**ВІ:** Мы разам з Пазьняком развальвалі Савецкі Саюз і змагаліся з камуністычнай дыктатурай і ў 1988—1992 гг.

маршыраваць да перамогі на чале зь ім было адно заданьненьне. Сёньня мне цяжка даць ацэнку таму, чым займаецца Пазьняк, бо пра ягоную дзейнасьць я нічога ня ведаю.

**ВВ:** Пра цяперашнюю дзейнасьць ведаю слаба. А як постаць гістарычная, як чалавек, з чыім імем зьвязанае адкрыцьцё Курапатаў, стварэньне БНФ і яго фракцыі ў Вярхоўным Савеце — ён заслужыў на вечную ўдзячнасьць тых, каму дарагая незалежная Беларусь.

**— Дзе, па-вашаму, у сёньняшняй РБ павінна пралягаць мяжа карыстаньня агульнапрынятым для эфэктыўнага кансэрватыўна-нацыянальнага палітыка? (Маю на ўвазе дзьвюхмоўе, «клясычны» правапіс, адносіны з РФ і г. д.) Наколькі далёка Вы гатовы пайсьці на тактычныя саступкі большасьці дзеля стратэгічнай перамогі? За Беларусь!**

**ВІ:** Для стратэгічнай перамогі ПБНФ павінна ініцыяваць стварэньне шырокага руху, такім рухам можа быць кампанія «Эўрапейскі марш». Гэты рух павінен адбывацца пад бел-чырвона-белым сьцягам і эўрапейскім сьцягам, дзе эўрапейскі сьцяг павінен выканаць ролю шчыта і абароны ад рэпрэсіяў.

**ВВ:** Надыходзіць новы палітычны час. Бальшыня беларусаў — да 90 % — лічаць незалежнасьць каштоўнасьцю. Рассыпаюцца старыя абвінавачаньні ды ярлыкі. І нашае пасьлядоўнае незалежніцтва, вернасьць каштоўнасьцям — наш плюс. Што да мовы — ня бачу праблемы камунікацыі з грамадзтвам па-беларуску.

**АМ:** Для перамогі няма патрэбы адмаўляцца ані ад мовы, ані ад незалежнасьці. Калі мы будзем моцныя, мы пераможам з захаваньнем усіх нашых атрыбутаў. Калі будзем слабымі — ніхто не захоча з намі дзяліцца ўладай, нават калі мы адмовімся ад самага сьвятога.

**— Як кожны з кандыдатаў ставіцца да «пэрформансу» з высьціланьнем газэты «Товарищ» на падлозе падчас «Антыкамуністычнага форуму» і ўвогуле да супрацы з ПКБ. sid**

**ВІ:** Заяўляць аб сваіх антыкамуністычных пазыцыях трэба на Кастрычніцкай плошчы, а не ў сядзібе БНФ подленька таптацца па газэтах. На сёньня ёсьць праблема дыктатуры, а не ўяўная пагроза з боку ПКБ.

**ВВ:** Я за канкурэнцыю ідэяў, а не за паленьне вогнішчаў. Нашая нацыянальная ідэя, ідэя свабоды нагэтульки моцныя, што не патрабуюць абразьлівых пэрформансаў. Шкада, арганізатарам не хапіла адказнасьці ад пачатку прадухіліць такія прыкрасьці.

**АМ:** Я супраць высьціланьня газэтаў на падлозе. Што да партыі Калякіна, у некаторых тактычных момантах магчымая супраца, напрыклад, вылучэньне людзей у камісіі падчас выбараў. У той жа самы час трэба памятаць, што Калякін, знаходзячыся на пасадзе старшыні адміністрацыі Савецкага раёну Менску, меў найгоршыя паказальнікі па колькасьці беларускамоўных школаў. Упэўнены, што ў такіх пытаньнях людзі не зьмяняюцца.

**— Ці лічыце вы мэтазгодным ісьці на выбары ў наступным годзе? Актывіст**

**АМ:** Лукашэнка доўгі час зьяўляўся «заканадаўцам моды», а мы адказвалі на ягоныя дзеяньні. Трэба быць гатовым да асымэтрычных адказаў. Калі вылучэньне ў палатку будзе адпавядаць мэтам нашай партыі (без спадзяваньняў атрымаць дэпутацкія месцы падчас г. зв. «лахатрону»), то ў іх можна ўзяць удзел. Але пакуль нельга адназначна заяўляць ані пра ўдзел, ані пра байкот.

**ВІ:** Партыя БНФ на сваім зьезьдзе павінна агучыць ультыматум: мы будзем удзельнічаць у выбарах толькі тады, калі нашых людзей уключаць ва ўчастковыя і акруговыя выбарчыя камісіі, нашых кандыдатаў зарэгіструюць і выпусьцяць усіх палітвязьняў. Калі мы даможамся гэтых трох пунктаў, ёсьць рэальная магчымасьць стварыць фракцыю БНФ у палаце прадстаўнікоў. Лічу памылковым заявы аб удзеле ў выбарах пры любых умовах.

**ВВ:** Улады плянуюць чарговы фарс пад такой назвай. Мы плянуем палітычную кампанію, мэта якой — узьняць сьвядомасьць грамадзтва, каб заявіла пра свае правы, каб фарс пертварыўся ў рэальнае волевыяўленьне.

**— Што канкрэтна вы (пытаньне да кожнага) зрабілі і робіце для беларускай справы? Kasia**

**ВВ:** Дзякуй, Касечка, за строгае пытаньне. Лію ваду на беларускі млын ужо 28 год. Так, па дробязях. То «Майстроўню» ствару, то бел-чырвона-белы сьцяг публічна рэабілітую (1988), то праграму й чытанку для дашкольных установаў укладу (1989, так што, магчыма, Вы па маёй праграме ў садку займаліся), то БНФ засную, то правапіс упарадкую. Далучайцеся, будзе лягчэй:).

**ВІ:** Ня буду зараз пералічваць усё, чым я займаўся ў беларускай справе, хачу толькі сказаць, што дзякуючы мітынгу 19—25 жніўня 1991 г. на плошчы Леніна, якім я кіраваў, Вярхоўны Савет 12-га скліканьня — большасьць дэпутатаў была камуністамі — прагаласаваў за забарону кампартыі і за незалежнасьць Беларусі. Калі б я зрабіў толькі гэта адно, то ўжо б сёньня лічыў, што жыцьцё прайшло недарэмна.

**АМ:** У студэнцкія часы ўзначальваў Задзіночаньне беларускіх студэнтаў, дапамагаў вялікай колькасьці студэнтаў у выданьні беларускамоўных газэтаў і часопісаў, арганізацыі акцыяў. Сотні беларускамоўных людзей па краіне ацэньваюць маю дзейнасьць пазытыўна. А асноўныя мае справы яшчэ наперадзе.

**— Усіх трох прэтэндэнтаў на пасаду старшыні (уключна з дзейным старшынём) яднае тое, што яны абяцаюць пэўныя зьмены ў кіраваньні ПБНФ. Як, на ваш погляд, зьменіцца ўнутрыпартыйнае жыцьцё ў ПБНФ, калі на пасаду старшыні заступіць нехта з Вашых канкурэнтаў? лоер**

**ВІ:** Калі абяруць не мяне, я буду намагацца, каб Партыя БНФ усё роўна рэалізоўвала пераможныя сцэнары. Чым і займаўся ўвесь гэты год, ініцыюючы і арганізоўваючы ўсе масавыя сёлетнія акцыі.

**АМ:** За восем гадоў кіраваньня партыяй Вінцук Вячорка з Віктарам Івашкевічам шмат чаму навучыліся. Упэўнены, у любым выпадку дзейнасьць партыі будзе паляпшацца. Але толькі маё абраньне дасьць магчымасьць у хуткім часе прыйсьці да ўлады.

**ВВ:** Спадару Міхалевічу, як паказала практыка, цяжка браць на сябе адказнасьць і дзейнічаць адкрыта, а не кулюарна.

**— Ці застанецца пад кіраўніцтвам Міхалевіча фронт Беларускім і Народным? Рытарычнае пытаньне**

**АМ:** Пад маім кіраўніцтвам фронт застанецца Беларускім і стане яшчэ больш Народным.

**— Пытанне да сп. Вячоркі: Якой будзе у выпадку Вашай перамогі палітыка БНФ у галіне правапісу канчаткаў роднага склону назоўнікаў мужч. роду і прыназоўніка з перад наступнымі мяккімі зычнымі? Нараней дзякую. сп. Ільніцкі**

**ВВ:** Сп. Ільніцкі! Магу Вас запэўніць, што ў разе маёй перамогі палітыка БНФ у галіне правапісу канчаткаў роднага склону назоўнікаў мужч. роду і прыназоўніка з перад наступнымі мяккімі зычнымі будзе жорстка ўвязаная з палітыкай дывэрсыфікацыі паставак энэрганосьбітаў!

Працяг на старонцы 6.

# Дэбаты он-лайн: Вінцук Вячорка, Віктар Івашкевіч і Алесь Міхалевіч

Працяг са старонкі 5.

**— Ці ня лічыце вы, што прыйшоў час зьмены пакаленьня палітычных лідэраў? Як**

**ВІ:** Зьмена лідэраў павінна адбывацца, але не паводле прыкметы ўзросту, а паводле наяўнасьці ініцыятываў і энэргіі для іх выкананьня. Сёньняшні час патрабуе лідэраў, здольных на адкрытую барацьбу, а не кулюарныя інтрыгі.

**ВВ:** Вы пра якое пакаленьне? Скажам, я маладзейшы за Мілінкевіча роўна нагэтульки, наколькі старэйшы за цяперашніх 30-гадовых. Мы адно пакаленьне, два ці тры? У Партыі БНФ няма процістаяньня пакаленьняў. У маёй камандзе людзі ўсіх узростаў, і яднае нас клопат пра зьберажэньне й перамогу фронтаўскіх каштоўнасьцяў.

**АМ:** Дэлегаты зьезду Партыі БНФ будуць галасаваць за мяне, таму што я больш прафэсійны, а ня толькі таму што я больш малады.

**— Пытаньне да ўсіх трох галоваў Зьмея Гарынавіча: якія першачарговыя крокі зробіць БНФ, калі атрымае давер народу і здолее адабраць уладу ў партнамэнклятуры? Якую дзяржаву пачне будаваць? Як пляніе пазьбегнуць татальнай крыміналізацыі эканомікі расейскага кшталту, наўмыснага банкруцтва прамысловасьці, стварэньня алігархічных клянаў? Ці ёсьць расклад тэрмінаў уваходжаньня ў NATO й Эўрасаюз? omu**

**ВІ:** Інтэграцыя Беларусі з Эўрасаюзам і прымяненьне эўрапейскіх стандртаў і мэханізмаў пры рэфармаваньні беларускай эканомікі ёсьць пэўнай гарантыяй ад дзікіх расейскіх прыкладаў.

**АМ:** Імклівая беларусізацыя ВНУ, грунтоўныя рынкавыя рэформы, уступленьне ў NATO пасьля шырокай інфармацыйнай кампаніі. Плян уступленьня ў NATO ёсьць. ЭС — гэта хутчэй стратэгічны выбар, кірунак, у якім трэба ісьці.

**ВВ:** Па-першае, з прысутных годнае імя Зьмея Гарынавіча маю права насіць толькі я — бо мой род з-над Гарыні :). Па-другое. Першыя рашучыя крокі трэба будзе рабіць для забесьпячэньня вяршэнства закону (алігархі гэтага моцна ня любяць, і будзе цяжка, і будуць нават праблемы з калегамі-дэмакратамі). Прынцыпова — увесьці роўныя законныя рамкі для замежнага бізнэсу. Многім расейскім структурам будзе цяжка ў іх працаваць. Праграма збліжэньня з NATO й Эўрасаюзам пачынаецца неадкладна, а далей ужо ня толькі ад нас залежыць. Прафэсіяналаў-эканамістаў, сэнсоўных мэнэджэраў, якія цяпер змушана працуюць на гэтую ўладу (і не дапусьцілі пакуль што эканамічнага развалу) трэба запрасіць да супрацы.

**— 1. Раскажыце, што вы зрабілі для беларускае культуры й навукі. 2. Якія ў кожнага з вас міжнародныя кантакты? Якіх замежных палітыкаў вы асабіста ведаеце, хто ёсьць вашым Lobby? tymbark**

**ВІ:** 1. Усе тры прэтэндэнты маюць вышэйшую адукацыю і ніводзін ня мае навуковых ступеняў. Акрамя палітычнай дзейнасьці я пяць год выдаваў газэту «Рабочы», якая выходзіла штотыдня. Забесьпячэньне выхаду газэты, арганізацыі працы рэдакцыі, распаўсюд, гэта значны кавалак працы, якія патрэбна ўмець рабіць.

2. Падчас падрыхтоўкі «Эўрапейскага маршу» я рэгулярна сустракаўся з усімі амбасадарамі эўрапейскіх краінаў і іхная дапамога была відавочнай. У той жа час лічу недапушчальным правалам адсутнасьць прадстаўніка БНФ у плянаванай паездцы лідэраў аб’яднаных дэмсілаў у ЗША. Лічу, што зьезд ня можа быць перашкодай паслаць аднаго з кіраўнікоў БНФ у такую важную міжнародную камандзіроўку. Буду настойваць, каб кіраўніцтва фронту даручыла гэту паездку сп-ру Хадыку, які не баляцуецца на пасаду старшыні Партыі БНФ.

**ВВ:** 1. Ужо адказваў Касі (гл. вышэй). 2. Сустракаўся з бальшынёй лідэраў суседніх і ня толькі эўрапейскіх краінаў. Называю тых, з кім кантактаваў рэгулярна: прэзыдэнт Эўрапарлямэнту Ганс-Герт Пётэрынг, прэм’еры Швэцыі, Чэхіі, Польшчы Фрыдэрык Райнфэльд, Мірэк Тапалянэк, Дональд Туск, генэральны сакратар ХДЗ Рональд Пофала, сэнатар Джон МакКейн, будучы прэм’ер Брытаніі Дэвід Кэмэран, Вітаўтас Ландсбяргіс і Андрус Кубіліюс, Барыс Тарасюк, Бэніта Фэрэра-Вальднэр, Зьбігнеў Бжэзінські, польскія міністры Радаслаў Сікорскі і Богдан Кліх, Мікулаш Дзурында…

**АМ:** 1. Кіраўніком партыі БНФ павінен быць эфэктыўны палітычны лідэр і мэнэджэр. Дзякуючы маёй дзейнасьці ў Моладзевым інфармацыйным цэнтры дзясяткі маладых беларускамоўных людзей абаранілі дысэртацыі.

2. Я маю працоўныя кантакты зь дзясяткамі дэпутатаў краінаў ЭС і Эўрапарлямэнту.

**— У чым вы бачыце прычыны паразаў БНФ? Дарык**

**АМ:** Трэба ў першую чаргу клапаціцца пра еднасьць сілаў нацыянальных, па-другое, дэмакратычных. У нас было наадварот.

**— У выпадку прэзыдэнцкіх выбараў каго вы будзеце падтрымоўваць і прапаноўваць на пасаду адзінага кандыдата? нол**

**ВВ:** Гэтым разам БНФ будзе вылучаць прэтэндэнта на адзінага кандыдата з шэрагу сябраў партыі.

**АМ:** Зьмены прыйдуць да 2011 году, у выпадку выбараў буду падтрымліваць Мілінкевіча. Часу і магчымасьцяў «раскруціць» іншага ня маем.

**ВІ:** Будучы прэзыдэнт будзе дэпутатам палаты прадстаўнікоў выбараў 2008 г.

* * *

**Вінцук Вячорка:** Дзякую «Нашай Ніве» за ўвагу да Партыі БНФ. Хацелася б, каб гэтая ўвага мела вынікам ваша далучэньне да практычнае беларускае справы — у шэрагах БНФ. Пад маім кіраўніцтвам у наступныя два гады Партыя БНФ узмоцніць сваю лідэрскую пазыцыю — як незалежніцкая сіла, якая бароніць беларускую ідэю ды беларускі нацыянальны інтарэс.

**Віктар Івашкевіч:** Чытачам «Нашай Нівы» я б хацеў пажадаць сьмеласьці не хавацца за псэўданімы і далучыцца да актыўнай дзейнасьці ў ПБНФ з мэтай найхутчэйшага набліжэньня тых часоў, калі Беларусь будзе і незалежнай, і эўрапейскай.

**Алесь Міхалевіч:** Вельмі ўдзячны за пытаньні, пераможа Фронт, мы пераможам!

# Перадзьездаўскія дыскусіі

Вечарам у пятніцу адбылося паседжаньне менскай гарадзкой арганізацыі Партыі БНФ. Удзел у паседжаньні ўзялі ўсе тры кандыдаты на пасаду старшыні Партыі — Вінцук Вячорка, Віктар Івашкевіч і Алесь Міхалевіч. Вёў паседжаньне кіраўнік менскай гарадзкой арганізацыі Аляксей Кавалец.


PHOTO.BYMEDIA.NET

Кожны з кандыдатаў меў невялікі дзесяціхвілінны выступ, пасьля чаго прысутныя маглі задаць ім свае пытаньні. Сход пачаўся з прыемнай навіны, што была нарэшце зарэгістраваная віцебская абласная арганізацыя Партыі БНФ.

Вінцук Вячорка сказаў, што наступны год стане годам абароны беларускай незалежнасьці.

«Налета найбольш магутна і актуальна загучаць незалежніцкая ідэя. Для партыі прыйшоў час умацоўваць свае пазыцыі ў краіне і за яе межамі… Я не хацеў, каб гэта чулі прадстаўнікі СМІ, але няхай. У адным буйным горадзе Берасьцейшчыны мне сказалі, што рэальных сябраў БНФ у горадзе засталося тры чалавекі. Нашы прыхільнікі павінны далучыцца і вярнуцца ў Партыю — гэта першасная задача на наступны год… Налета да 90-годзьдзя БНР мы плянуем правесьці форум «За незалежнасьць», які будзе мець мноства панэляў і сэкцыяў… Пакуль я зьяўляюся старшынём БНФ, гарантую, што партыя застанецца сапраўды незалежнай», — сказаў В.Вячорка.

Віктар Івашкевіч засяродзіўся на праблеме эўрапейскай інтэграцыі і парлямэнцкіх выбараў.

«Наша памылка — ісьці на выбары бяз пэўных патрабаваньняў ад улады. Калі яны хочуць, каб мы ішлі на выбары і стваралі фасад дэмакратычнасьці, то трэба настойваць на вызваленьні палітвязьняў, вяртаньні ў шапікі і падпіску незалежных газэтаў, спыненьні перасьледу недзяржаўных арганізацыяў. Асабіста я лічу амаральным ісьці на парлямэнцкія выбары, калі сядзіць Дашкевіч і Фінькевіч… Трэба арганізаваць шырокі рух за далучэньне краіны да Эўрасаюзу. Разам з тым, эўрапейскую тэматыку неабходна зьвязваць і з сацыяльнай. Эўрапейскі сьцяг сёлета абараніў нас ад дубінак АМАПу… Нам трэба палявыя камандзіры, якім мы будзем і даваць канкрэтныя задачы, і чакаць іх выразнэньня. У Фронце сёньня мала людзей, якія здольныя нестандартныя ўчынкі і рашэньні», — лічыць В.Івашкевіч.

Алесь Міхалевіч гаварыў пра нацыянальную кааліцыю.

«Я ўступіў у БНФ у 1993, калі Партыя мела ясную праграму. Сёньня яе няма. Людзі помняць брэнд БНФ хутчэй па інэрцыі, а ня дзякуючы нам. Калі я стану старшынём, то найперш аднаўлю выхад партыйнай газэты. Пачну масавы выпуск інфармацыйных матэрыялаў, каб данесьці людзям альтэрнатыўную думку… У Беларусі не такая дрэнная сытуацыя, каб мяняць Лукашэнку на каго папала… Патрэбная шырокая нацыянальная кааліцыя з удзелам Паўла Севярынца, Вячаслава Сіўчыка, КХП-БНФ, руху «За Свабоду», прыхільнікаў, праваслаўных, каталіцкіх і пратэстанцкіх актывістаў, моладзі, рабочых вялікіх прадпрыемстваў. Толькі ў такім выпадку мы пакажам людзям альтэрнатыву», — мяркуе А.Міхалевіч.

Вінцук Вячорка, адказваючы на пытаньні сказаў, што ня будзе заставацца ў кіраўніцтве Партыі, калі пераможа Алесь Міхалевіч. «Я не магу станавіцца закладнікам невядомай мне палітыкі», — сказаў ён. Віктар Івашкевіч паабяцаў, што ў выпадку ягонай перамогі пасады намесьнікаў будуць прапанаваныя, як Міхалевічу, так і Вячорку. У сваю чаргу Алесь Міхалевіч паведаміў, што незалежна ад вынікаў зьезду з Партыі ён нікуды ня сыдзе.

Аляксей Кавалец таксама паведаміў, што ўсе менскія гатэлі пакуль адмаўляюцца прадставіць месцы для дэлегатаў зьезду. Пакуль мяркуецца, што рэгіяналаў разьмесьціць па дамах менскіх актывістаў Партыі.

**Зьміцер Панкавец**

## АПЫТАНЬНЕ НА NN.BY

**За каго з кандыдатаў у старшыні Партыі БНФ прагаласавалі б Вы, каб былі дэлегатам?**

| | |
|---|---|
| Вячорка | 102 (23.5%) |
| Івашкевіч | 76 (17.5%) |
| Міхалевіч | 256 (59.0%) |

Усяго прагаласавала 434

**Вынікі галасаваньня за 22–23 лістапада (з 24 лістапада невядомыя пачалі атаку, каб накруціць галасы).**

# Orange цікавіцца рынкам сувязі ў Беларусі

Беларусь наведалі прадстаўнікі France Telecom Group, аднаго зь вядучых сусьветных апэратараў сувязі (TM orange). У часе сустрэчы з кіраўніцтвам Мінсувязі вялося пра зацікаўленасьць FTG у інвэстыцыях у беларускі рынак.

Беларускі бок прадставілі міністар сувязі і інфарматызацыі Мікалай Панцялей і ягоны намесьнік Мікалай Струкаў. Яны распавялі гасьцям аб стане разьвіцьця электрасувязі і інфарматызацыі ў Беларусі, а таксама азнаёмілі іх з асноўнымі падыходамі дзяржаўнай палітыкі ў дадзенай вобласьці. У сваю чаргу віцэ-прэзыдэнт FTG па разьвіцьці ў Эўразіі, Жан-Мішэль Сэр распавёў пра працу France Telecom Group, а таксама паведаміў пра яе зацікаўленасьць у дзейнасьці на тэрыторыі Беларусі. Пра канкрэтныя інтарэсы групы ў Беларусі ў часе сустрэчы наўпрост не паведамлялася. Пры гэтым пацьвердзілася зацікаўленасьць бакоў у прыцягненьні групы France Telecom у якасьці інвэстара да разьвіцьця арганізацыяў электрасувязі Беларусі.

У France Telecom Group «Нашай Ніве» не пракамэнтавалі акалічнасьці перамоваў, адзначыўшы, што камэнтар будзе магчымы толькі пасьля канкрэтных дзеяньняў бакоў — падпісаньня дамовы аб супрацоўніцтве ў пэўнай галіне.

Памочнік міністра сувязі Натальля Аляшкевіч паведаміла, што перамовы мелі папярэдні і агульны характар, пра канкрэтную сфэру зацікаўленасьці France Telecom Group пакуль не вялося.

Зважаючы на падрыхтоўку да дэманапалізацыі Белтэлекаму, не выключаецца вэрсія, што кампанія мае зацікаўленасьць найперш у сэктары шырокапалосных інтэрнэт-паслугаў (ADSL), паведамляе it.tut.by. FTG можа зацікавіць таксама рынак сотавай сувязі, і інтарэс гэты найперш падагрэты нядаўнім выхадам на беларускі Telekom Austria. Мяркуецца, што патэнцыйнымі аб'ектамі зацікаўленасьці францускай кампаніі могуць быць БеСТ і БелСел, зважаючы на тое, што сваю долю ў мясцовым МТС кіраўніцтва Беларусі наўрад ці саступіць камусьці, акрамя расейскага сузаснавальніка. Сытуацыя вакол перамоваў з францускай кампаніяў вонкава нагадвае акалічнасьці продажу VELCOM, калі пра падрабязнасьці стала вядома дэ-факта пасьля продажу кампаніі.

**Сямён Печанко**

**France Telecom Group**

**адзін з вядучых сусьветных апэратараў сувязі. Паводле стану на 30 чэрвеня 2007 ён абслугоўваў больш за 163 мільёнаў абанэнтаў на пяці кантынэнтах, Зь іх дзьве трэція — пад брэндам Orange. Агульны аб'ём продажаў групы склаў 51,7 млрд эўра ў 2006 і 25,9 млрд эўра на 1 верасьня 2007. 30 чэрвеня 2007 група налічвала 102,5 млн абанэнтаў мабільнай сувязі і 10,5 млн карыстальнікаў ADSL.**

## СЬЦІСЛА

### Малако падаражэла

Узьлёт цэнаў у Мінэканомікі тлумачаць ростам выдаткаў на вытворчасьць і сусьветных цэнаў. У Беларусі літар малака каштуе $0,53, у Маскве — каля $1,26. Сп. Адашкевіч фактычна прызнаў, што павышэньне ў лістападзе пэнсіяў тарыфнай стаўкі першага разраду ёсьць кампэнсацыяй за рост цэнаў на прадукты харчаваньня. Нагадаем, што з 1 лістапада працоўная пэнсія па ўзросту павышаная ў сярэднім на 9,3 % і складае BR345,3 тыс., а тарыфная стаўка першага разраду павышаная да BR70 тыс. — на 7,7 %.

Малако, сьмятана, тварог нізкай тлустасьці падаражэлі на 5,5 %, а малочная прадукцыя больш высокай тлустасьці — на 14,8 %. За тры месяцы закупныя цэны на малако ўзрасьлі на 44 %, а розьнічныя цэны на малако 3,2—3,5 %-най тлустасьці вырасьлі на 23 %.

### Мільярд даляраў у цені

Штогадовыя ценевыя прыбыткі ў будаўнічай галіне складаюць каля мільярда даляраў, паведамляе «Экономическая газета». Найбольш праблемнымі сэгмэнтамі застаюцца малапавярховае будаўніцтва і аказаньне паслугаў насельніцтву па рамонце. Працу спэцыялізаваных фірмаў робяць нявыгаднай шабашнікі, чые паслугі, праз іх якасьць і адносную таннасьць, больш папулярныя ў насельніцтва.

### Ня бойцеся дэвальвацыі

Нацбанк ня бачыць падставаў для паўтарэньня ў канцы году праблемнай сытуацыі на валютным рынку, што ўзьнікла пры канцы 2006 г., паведаміў першы намесьнік старшыні праўленьня Нацбанку Павал Калавур. Ён патлумачыў, што цяпер магчымасьцяў супрацьстаяць нэгатыўным наступствам ад пераходу на новыя ўмовы замежнага гандлю і павышэньня цэнаў на імпартаваныя энэрганосьбіты значна больш. Акрамя таго, у гэтым годзе істотна павялічаныя золатавалютныя рэзэрвы Беларусі.

Міжнародныя рэзэрвовыя актывы Беларусі, разьлічаныя паводле мэтодыкі МВФ, узрасьлі за гэты пэрыяд на 55,8 % да $2154,8 млн.

### Беларусь пляную рост спажываньня газу

Спажываньне газу ў Беларусі да 2020 году ў адпаведнасьці з пэрспэктыўным балянсам складзе 23—25 млрд кубамэтраў у год, ці на 20 % больш чым сёлета. Аб гэтым паведаміў першы намесьнік міністра энэргетыкі Эдуард Таўпянец на Менскім форуме. Пры гэтым доля іншых відаў паліва будзе расьці яшчэ хутчэй. Да 2020 году плянуецца рост ВУП у 2—2,5 разы. Акрамя таго, працягнецца праграма газіфікацыі чарнобыльскіх тэрыторыяў.

**СП; БЕЛТА**




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Разгон антыпуцінскага «Маршу нязгодных» у Маскве. Болей пра сёньняшнюю Расею – у камэнтары Віталя Тараса на старонцы 10.**

## СЬЦІСЛА

### Беларусь і чалавечы патэнцыял

Беларусь увайшла ў групу краінаў з высокім індэксам разьвіцьця чалавечага патэнцыялу. Аб гэтым паведаміў намесьнік міністра замежных справаў Віктар Гайсёнак на прэзэнтацыі дакладу аб разьвіцьці чалавека 2007/2008 «Барацьба са зьмяненьнем клімату: чалавечая салідарнасьць у падзеленым сьвеце».

Усе краіны ў сьпісе падзяляюцца на тры групы — з высокім, сярэднім і нізкім узроўнем разьвіцьця чалавечага патэнцыялу. Беларусь займае 64-е месца сярод 177 краінаў. Пры вызначэньні рэйтынгу бярэцца пад увагу працягласьць жыцьця, узровень пісьменнасьці дарослага насельніцтва, ВУП на душу насельніцтва. Кіраўнік Цэнтру Мізэса Яраслаў Раманчук настроены скептычна: «На пачатку 1990-х мы стаялі ў рэйтынгу побач з Эстоніяй, Літвой, Польшчай. Цяпер Польшча на 37-м месцы, Літва — на 43-м, Эстонія — на 44-м, а мы на 20 пунктаў ніжэй».

### Турмы пяройдуць у юрысдыкцыю Мін'юсту

Беларусь адзіная краіна ў СНД, дзе гэта ня зроблена. Міністар юстыцыі Віктар Галаванаў паведаміў, што пытаньне ў бліжэйшы час будзе вырашана. Ён таксама раскрытыкаваў дзейнасьць МУС па амністыях. На яго думку, амністыі ў Беларусі адбываюцца толькі пасьля перанаселенасьці турмаў. «Кіраваца мы найперш павінныя мэтазгоднасьцю знаходжаньня за кратамі злачынцы. Спадзяёмся, што ў хуткай пэрспэктыве так і будзе», — сказаў міністар.

### Памірай, а крэдыт аддавай

У Беларусі з 2008 году будзе страхавацца жыцьцё і здароўе пазычальніка, які атрымлівае ў банку кароткатэрміновы крэдыт. Шмат якія грамадзяне выступаюць даручнікамі для сваіх знаёмцаў і сваякоў пры атрыманьні імі крэдыту ў банку. У выпадку сьмерці ці страты здароўя пазычальніка даручнікі нясуць адказнасьць за вяртаньне крэдыту. Каб зьмякчыць адказнасьць, і мяркуецца страхаваць жыцьцё і здароўе крэдытаатрымальніка.

### Візыт у Вашынгтон

З 1 па 10 сьнежня будзе адбывацца візыт у Вашынгтон дэлегацыі беларускай апазыцыі зь сямі чалавек, у складзе якой будуць Аляксандар Мілінкевіч, Анатоль Лябедзька, Павал Севярынец, Сяргей Калякін, Анатоль Ляўковіч, Зьміцер Хведарук і Эніра Браніцкая. Сустрэчу арганізавала Хэльсынская камісія бясьпекі і супрацоўніцтва ў Эўропе Кангрэсу ЗША. Яна вядзе маніторынг выкананьня ўмоваў «Заключнага акту нарады аб бясьпецы і супрацоўніцтве ў Эўропе (Хэльсынскага пагадненьня) 1975 году, якія на сябе ўзялі краіны-члены АБСЭ. Цяпер Камісіяй кіруе Элсі Хастынгс.

**ЗП, БЕЛТА, Радыё Свабода, Zautra.by**

# Заторы на дарогах

Віталь Тарас вярнуўся з камандзіроўкі ў Маскву.

## У ГУМе ля фантану

Трохі дзіўна апынуцца ў Маскве ў ролі замежнага турыста. Асабліва калі ты быў там апошнім разам гадоў дзесяць таму ў камандзіроўцы, цягам некалькіх гадзінаў. Гэтым разам выпала так, што заставаўся час і на тое, каб трохі прайсьціся вуліцамі расейскай сталіцы. Але так толькі падавалася. Насамрэч, Масква ў міжсэзон, з дажджом, які пераходзіць у сьнег, і сьнегам, які пераходзіць у дождж, зь нейкай бруднай мешанінай пад нагамі нават у адносна чыстым цэнтры — не найлепшае месца для шпацыру. А яшчэ ж да цэнтру трэба дабрацца.

Аўтамабільныя заторы на дарогах — гэта першае, з чым сутыкаесься, калі прыбываеш у Маскву. І яны цябе не адпускаюць са сваіх абдымкаў. Фактычна ўвесь гэты мэгаполіс амаль у любы час сутак ёсьць адным вялікім заторам. Плянаваць больш як адну сустрэчу ці мерапрыемства ў дзень тут няма сэнсу, асабліва, калі мерапрыемствы ў розных канцах гораду. Тут ніхто ня будзе прасіць прабачэньня за тое, што спазьніўся на гадзіну ці на дзьве — проста скажуць: «заторы». Куды б ты ні ехаў на машыне, ніколі ня ведаеш, колькі часу зойме дарога.

Куды больш надзейна ехаць у мэтро. Вось тут і адчуеш сябе сапраўдным замежнікам. Турыстычнай інфармацыі, як правіла, нуль. Колькі каштуе праезд на мэтро (цяпер тут не жэтоны, а спэцыяльныя электронныя карткі) можна высьвятліць толькі эмпірычным шляхам, калі атрымаеш у касе рэшту з купюры ў сто рублёў.

Але маскоўскія мінакі дарогу паказваюць даволі ахвотна.

Вось і Крэмль. На Краснай плошчы прыемна ўражваюць адносная цішыня і спакой. Ніякіх машынаў. Ніякіх натоўпаў. Амаль няма міліцыянтаў. Адзін толькі стаіць каля службовага ўваходу ў Спаскую браму. Ясна, што Красная полошча прастрэльвецца, што называецца, навылёт усялякімі відэкамэрамі ды іншай апаратурай сачэньня. Але прадстаўнікі спэцслужбаў тут калі і ёсьць, дык не вытыркаюцца перад табой на кожным кроку. І гэта ўжо прыемна і крыху нязвыкла. Мінін і Пажарскі загорнутыя ў цэляфан, як загортваюць мэблю перад рамонтам кватэры.

Сама плошча выглядае неяк сьціпла і нават падаецца маленькай. Эфэкт, відаць, выкліканы тым, што частка яе адгароджаная пад навагодні кірмаш, дзе з драўляных канструкцыяў узводзіцца нейкі гарадок, накшталт Крамлю.

Даводзіцца доўга аглядацца навокал, пакуль не зразумееш, чаго яшчэ бракуе ў звыклым краявідзе — гатэлю «Расея». На яго месцы пакуль будаўнічая пустэча.

Добрая схованка ад непагадзі й слаты — ГУМ. Тут таксама няма колішніх натоўпаў ашалелых савецкіх людзей, якія прыяжджалі сюды на пару гадзінаў па «дэфіцыт». Тут цяпер чыста й сьветла. Зьзяюць раскошай і сучасным дызайнам дарагія фірмовыя крамы. Шрыфтам 1940-х гадоў мінулага стагодзьдзя надпіс: «Камбінат добрага харчаваньня». Стылістыка, так бы мовіць, футурыстычнай мінуўшчыны, калі да камунізму было рукой падаць. І ў цэнтры — той самы фантан.

У цэлым цяперашні ГУМ нагадвае тыповы мол, якія раней можна было бачыць толькі на Захадзе.

## Варшаўская шаша

Але вернемся да сёньняшніх маскоўскіх дарог. Знаёмыя масквічы супакойвалі — нічога, у выходныя будзе лягчэй. У суботу ўвечары на Варшаўскай шашы, на выезьдзе з гораду ледзь рухаемся ў заторы…

Дарэчы, наконт асаблівасьцяў маскоўскай тапанімікі. Для мяне, як і для многіх, застаецца загадкай, чаму называецца Варшаўскай шаша, па якой ніякім чынам ня выедзеш у бок Польшчы. Гэтаксама, як былая Сімфэрапальская шаша зусім не вядзе ў бок Крыму. А чаму адна з найбольш буйных — Кашырская шаша — мае назву невялікага мястэчка? (Асаблівасьці менскай тапанімікі тут кранаць ня будзем.)

Куды ж усе ехалі з Масквы ў вечаровы час, у слату і туман — за горад? На лецішчы? Не, аказваецца, у мэгастор (раней казалі «гіпэрмаркет») на закупы.

Высьветлілася, што ў Маскве ёсьць нават начныя заторы. У раёне Цьвярской а 2-й гадзіне немагчыма праехаць праз агромністую колькасьць аўтаўладальнікаў, якія едуць у начныя клюбы.

Часам ствараецца ўражаньне, што Масква — гэта адзін суцэльны затор. Свайго роду сьмяротны тромб у сыстэме кровазвароту мэгаполісу, які можа некалі яго спаралюшаваць аднойчы і назаўсёды.

У аўтамашынах у заторах ідзе сваё, нябачнае сьвету жыцьцё. Нехта чытае, нехта слухае музыку, нехта размаўляе, вырашае бізнэс-справы праз тэлефон альбо ўладкоўвае сямейныя праблемы. Мінакам звонку горш. Ня толькі таму, што ў салёне цяплей. Паспрабуйце перайсьці — ды не, якое там перайсьці! — перабегчы вуліцу ў гадзіну пік у раёне Беларускага вакзалу. Нават калі рабіць гэта на рэгуляваным сьвятлафорам скрыжаваньні, рызыка для жыцьця застаецца высокай. Ніхто зь кіроўцаў і не падумае саступіць мінаку.

А праблема ўскладняецца яшчэ тым, што ў горадзе літаральна на кожным кроку сутыкаесься з будаўніцтвам. Прычым забудоўнік імкнецца заняць сваёй будоўляй як мага большую прастору. У выніку, праз шматлікія загародкі мінакам даводзіцца часта выходзіць з ходніка на дарогу, саступаць якую ніхто з аўтамабілістаў не зьбіраецца.

Будоўляў, вядома, шмат у любым эўрапейскім горадзе. Але, па-першае, там будаўнікі імкнуцца прыносіць як мага меней клопату гарадзкім жыхарам. Тут на гэта ніхто не зьвяртае ўвагі — у тым ліку, на пастанову маскоўскага ўраду аб датрыманьні цішыні ў начны час. Кропкавая будоўля ў маскоўскіх дварох практычна ніколі не спыняецца. І што цікава — вельмі мала аб'ектаў, будаўніцтва якіх набліжаецца да завяршэньня. У пераважнай большасьці выпадкаў толькі-толькі закладзены нулявы цыкль.

Часта пачынаюць будаваць адно, а ў выніку выходзіць зусім іншае. Напрыклад, у культурным цэнтры «Маскавіт», які заснаваў Іосіф Кабзон, цяпер — казіно.

На нядаўна пабудаваным Цэнтры беларускай культуры, які нагадвае чымсьці Цэнтар Пампіду ў Парыжы, пакуль ніякіх шыльдаў. І ніякіх прыкметаў жыцьця. Удзень ніхто не ўваходзіць і не выходзіць з будынку, увечары гарыць толькі дзяжурнае сьвятло.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Калі бачыш шматлікія катлаваны на кожным кроку, міжволі ўзьнікае пачуцьцё, што забудоўнікі проста пазначаюць такім чынам свае ўчасткі — як некалі золаташукальнікі. А можа, спадзяюцца на тое, што распачатую справу, у якую ўкладзена столькі грошай, цяжэй будзе спыніць уладам?

Бо якая яна будзе, тая новая ўлада, і чаго ад яе чакаць — ніхто ня ведае. Нягледзячы нават на «плян Пуціна».

## «Свобода слова нам дана...»

Нават у цэнтры Масквы мала што нагадвае пра выбары ў Думу 2 сьнежня. Праўда, на некалькіх цэнтральных праспэктах і на Цьвярской вісяць расьцяжкі на гэтую тэму. Адна зь іх: «Масква галасуе за Пуціна». І амаль на кожным слупе плякат: «Сьпіс № 10». Гэта сьпіс «Адзінай Расеі», які ўзначальвае Пуцін. Рэклямы іншых выбарчых сьпісаў, хоць бы дзеля праформы, у цэнтры практычна няма. На ўскраінах давялося, праўда, бачыць рэклямныя плякаты партыі Жырыноўскага і «Справядлівай Расеі». Ля мэтро «Чартанаўскае» нейкі добраахвотнік раздаваў газэту «Патриоты России». Хвілінаў за пятнаццаць газэту ў яго ўзялі пару маладзёнаў (на добрым падпітку), хлопец-інвалід, пара пэнсіянэраў і бомж. Інтэлігентнага выгляду бацька сямейства, да якога быў зьвярнуўся актывіст, адмахнуўся са сьмехам: «Мы не патрыёты!»

Перад гэтым міліцэйская машына забрала маладую жанчыну — з выгляду з Карэі. Таксама, відаць, на прадмет высьвятленьня ступені патрыятызму.

Агітацыю за партыі давялося бачыць яшчэ толькі ў адным месцы — ва Ўсерасейскім выставачным цэнтры, што на тэрыторыі былой ВДНГ. Там працавала выстава прэсы. Такія буйныя газэты, як «Известия», «Комсомольская правда», «Коммерсант» чамусьці прадстаўленыя не былі. Былі такія розныя выданьні як «Московский комсомолец», «Московская правда», «Пионерская правда», «Новая газета», газэты з розных рэгіёнаў Сібіры, Паволжа, Чачэніі.

Ля стэнду камуністычнай газэты «Правда» ішла агітацыя за КПРФ. Вакол «Правды» тупалі некалькі пэнсіянэраў.

На стэндзе «Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расеі» у самым цэнтры выставы можна было бачыць цэлыя стосы «Советской Белоруссии», «Рэспублікі», «Знамени юности», «Народной газеты», а таксама выданьня парлямэнцкага сходу «Союзное вече» (Вось, дарэчы, цікавая пара загалоўкаў зь першай паласы газэты: «Калі козы загавораць па-чалавечаму?» і «Калі вернуцца расейцы дамоў?»). На тле чорна-белага саюзнага выданьня «СБ» і «Рэспубліка» вылучаліся крэйдавай паперай і глянцавымі каляровымі здымкамі. Разьбіраць іх ніхто з наведнікаў не сьпяшаўся. Толькі нейкая жанчына сярэдняга веку зацікавілася «Звяздой». Пагартала, потым схавала і хутка пайшла. Відаць, забаялася — а раптам небясплатна?

У адрозьненьне ад Беларусі, незалежных выданьняў у Маскве — і на выставе, і ў кіёсках з надпісам «Прэса» — пакуль хапае. Толькі ніхто за імі ў чаргу не выстройваецца і адказаў для сябе там, відаць, не шукае. Падобна, што мала хто ў расейскай сталіцы, у тым ліку і сярод інтэлігенцыі, сумняваецца ў выніках выбараў 2 сьнежня. Як і ў выбары Расеі на бліжэйшую будучыню.

А ўсё-такі ў паветры вісіць нейкае нэрвовае напружаньне. Ці яно ідзе ад вялікай колькасьці маскоўскай міліцыі на вуліцах, якая ў сувязі з выбарамі пераведзеная на ўзмоцнены рэжым. Ці ад змрочнага восеньскага надвор’я. Позна ўвосень ці на перадзімку ж у расейскай гісторыі нічога добрага звычайна не здаралася…

Калі едзеш на пару дзён у сталіцу іншай дзяржавы і амаль не заўважаеш зьменаў у навакольнай абстаноўцы (напрыклад, у маўленьні людзей) — гэта яшчэ нічога. Горш, калі вяртаесься на радзіму і адчуваеш сябе так, быццам нікуды і не ад’яжджаў.

# Украіна ўшанавала памяць Галадамору

Юшчанка заклікаў прыбраць помнікі таталітарызму.

24 лістапада Ўкраіна ўшанавала памяць ахвяраў Галадамору — штучнага голаду, выкліканага камуністычнаю ўладаю ў 1932—33 г. Сёлета Дзень памяці ахвяраў галадамораў ды палітычных рэпрэсіяў упершыню адзначаўся на ўсёй тэрыторыі краіны. Удзельнікі памінальных мітынгаў а 16-й запалілі сьвечкі, якімі выклалі сымбалічныя крыжы на зямлі й ушанавалі мільёны загінулых людзей хвілінай маўчаньня.

У Севастопалі была адкрытая мэмарыяльная дошка, а ў вёсцы Камінтэрнаўская на Адэшчыне — мэмарыяльны комплекс памяці ахвяраў Галадамору. У Палтаве ды Жытоміры сьвятары розных канфэсіяў адслужылі паніхіды па іх. Сьвечкі былі запаленыя таксама на шасьці мастох праз раку Збруч, што да 1939 г. была мяжой паміж Заходняй і Цэнтральнай Украінай, то бок паміж Польшчаю ды СССР. Праз Збруч заходнеўкраінскія сяляне пераплаўлялі на плытах збожжа, каб ўратаваць ад сьмерці ўкраінцаў з супрацьлеглага берагу.

У Кіеве мітынг памяці адбыўся 24 лістапада на Міхайлаўскай плошчы, побач з адзіным у сталіцы невялічкім помнікам ахвярам Галадамору. Прэзыдэнт Украіны Віктар Юшчанка, які напярэдадні ўказам абʼявіў 2008 г. годам памяці ахвяраў Галадамору, заклікаў дэмантаваць помнікі таталітарнага рэжыму.

Раніцай 24 лістапада дворнікі ў некаторых раёнах Кіева разносілі па кватэрах сьвечкі, прапануючы запаліць іх на падваконьні а 16-й. Вечарам у маім 45-кватэрным доме ў цэнтры гораду сьвечкі гарэлі ў вокнах трох кватэраў.

**Віталь Панамароў, Кіеў**

# Кітай замаўляе АЭС французам

Кантракт коштам 8 мільярдаў эўра на пабудову двух сучасных рэактараў трэцяга пакаленьня быў падпісаны ў часе візыту Нікаля Сарказі ў Кітай.

Француская дзяржаўная энэргетычная кампанія Areva пабудуе іх для Кітайскай ядзерна-энэргетычнай кампаніі «Гуандун». Спраектаваныя фірмай Framatome, што належыць да групы Areva, рэактары будуць мець супольную магутнасьць 3400 мэгават. Яны пачнуць працу ў 2014 годзе, на паліве, якое будзе пастаўляць Areva, прычым пастаўка паліва закантрактаваная да 2026 году.

Як вядома, лукашэнкаўцы маюць намер даручыць пабудову беларускай АЭС расейцам. «Мы ўпэўненыя на 99 %, што партнэрам у будаўніцтве атамнай электрастанцыі ў Беларусі будзе Расея», — заявіў намесьнік старшыні прэзыдыюму НАНБ Уладзімер Цімашпольскі тыдзень таму. На думку намесьніка кіраўніка НАНБ, «у тэхнічна-эканамічных парамэтрах расейскае абсталяваньне не саступае двум іншым вытворцам, пры гэтым яно больш таннае». «Акрамя таго, пры выбары расейскіх пастаўшчыкоў мы будзем мець агульнасьць мовы і тэхналёгіяў, магчымасьць у межах саюзнай дзяржавы атрымліваць крэдыты, рыхтаваць спэцыялістаў у расейскіх ВНУ», — дадаў Цімашпольскі.

Кітайцы, як бачым, кіруюцца іншай лёгікай.

У часе візыту Сарказі былі падпісаныя кантракты на дзясяткі мільярдаў эўра. Самы вялікі зь іх — закуп кітайцамі 160 самалётаў «Аэробус».

**Буг**

# Туск абяцае стрыманую беларускую палітыку

Сёньня прэмʼер польскага ўраду Дональд Туск зьвярнуўся да парлямэнту краіны з праграмнай прамовай, у якой прадставіў плян працы свайго ўраду. Выступ доўжыўся тры гадзіны.

Адносна Беларусі кіраўнік польскага ўраду сказаў: «Задача нашай палітыкі ў дачыненьні да Беларусі — пераканаць усе палітычныя колы ў гэтай краіне, што варта зрабіць стаўку на дэмакратыю».

Паводле кіраўніка польскага ўраду, Польшча «мае абгрунтаванае імкненьне быць адной са стваральніцаў палітыкі Эўрасаюзу ў дачыненьні да яго ўсходніх суседзяў».

**Буг; радыё «Свабода»**

## СЬЦІСЛА

### Польскія гіпэрмаркеты перайшлі на беларускую

Напярэдадні Калядаў маркеты сусьветнай сеткі Tesco ўпершыню распачалі рэклямную акцыю па-беларуску. Для беларусаў у Tesco раздаюць рэклямкі «Для Цябе, для Сямʼі», у якіх нагадваецца, што хутка сьвята Сьвятога Мікалая, таму гасьцей чакаюць добрыя зьніжкі на шпроты, каркавіну сьвіную без касьцей, усе навагоднія цацкі, CD і DVD, экалягічныя торбы на ўсё жыцьцё, ялавічыну для смажанкі, пыласосы і іншыя тавары. «Праспэкт прыйшоўся даспадобы нашым наведнікам зь Беларусі. Амаль кожны зь іх з задавальненьнем карыстаецца буклетам пры выбары падарункаў», — сказала прадавачка Tesco ў Саколцы Малгажата Новак.

### Ня хоча быць разам з Лукашэнкам

Кандыдат на пасаду прэзыдэнта Грузіі ад апазыцыі бізнэсовец Леван Гачэчыладзэ выступае за выхад краіны з СНД. Л.Гачэчыладзэ зазначыў, што Грузія магла б знаходзіцца ў СНД, калі б Садружнасьць «была свабоднай». Пры гэтым грузінскі палітык падкрэсьліў, што «нельга знаходзіцца ў арганізацыі, у якой ёсьць прэзыдэнт Беларусі Аляксандар Лукашэнка».

— Асабіста я не хачу знаходзіцца ў СНД, але я — кандыдат ад абʼяднанай апазыцыі, і рашэньне аб гэтым пасьля маёй перамогі будзе прымацца камандна, — заявіў Л.Гачэчыладзэ.

**Радыё «Рацыя»**

# Ідзіце і глядзіце

**Наталка Бабіна** пабывала на выставе рассакрэчаных дакумэнтаў аб Галадаморы. Выстава падрыхтаваная Службай бясьпекі Ўкраіны і будзе праходзіць у Музэі гісторыі і культуры да 30 лістапада.

Выстава архіўных дакументаў «Рассакрэчаная памяць», прысьвечаная Галадамору ва Ўкраіне ў 1932—1933 гадах, уражвае многім.

Тым, што ТАКОЕ магло быць.

Што гэта зрабілі НАЎМЫСНА.

Што выставу пра тыя падзеі зладзіла ўкраінская Служба бясьпекі — аналяг нашага КДБ.

Рэгулярныя цікавыя выставы — моцны бок Музею гісторыі і культуры. Звычайна ходзіш на іх зь вялікім задавальненьнем, а на гэтую я ішла літаральна са страхам. Я баялася, ці вытрымаю. Прыкладна ўяўляла, што пабачу, і рыхтавала сябе. Вядома, гэта цяжка. Ёсьць мяжа, за якой ня хочацца гаварыць. Такой мяжою для мяне на выставе стаў пратакол допыту сялянкі, у якой дзіця памерла ад голаду. Яна закапала ягонае цельца на агародзе, а на другі дзень дастала зь зямлі...

Але цьвёрда параджу ўсім паглядзець гэтую выставу.

Выставу арганізавала Служба бясьпекі Ўкраіны. Тут прадстаўленыя толькі дакумэнты, якія захоўваліся пад грыфам «сакрэтна», а таксама схаваныя дакумэнты. Фатаграфіі, якія часьцей за ўсё рабіліся схавана, бо за іх можна было трапіць у турму, дзёньнікі, за якія траплялі ў турму, вершы на пажоўклых лісточках, за якія траплялі ў турму... Справаздачы мясцовых органаў (колькі хлеба забралі, колькі чалавек памерла, колькі пасадзілі), пратаколы допытаў... Законы, апублікаваныя ў тагачасных газэтах... Пранізьлівыя сьведчаньні.

Пазнаёміцца з выставай мне дапамагаў спадар Аляксандар Ішчук, супрацоўнік дзяржаўнага архіву СБУ, які непасрэдна яе рыхтаваў.

— Як Вы выносіце гэтую працу? Зь якім пачуцьцём адбіралі дакумэнты? — спытала я яго.

— З пачуцьцём, што гэта наша гісторыя. Гісторыя, якую ад нас вельмі хавалі. Але мы павінны данесьці праўду да людзей. У грамадзтве ёсьць пэўны давер да органаў бясьпекі.



Ці дачакаемся, што КДБ Беларусі падрыхтуе выставу, прысьвечаную Курапатам?

На ўкраінскую мову сп. Ішчука паступова падцягаліся іншыя наведвальнікі выставы. Пажылая жанчына, сп. Галіна Ткачэнка, дзед з бабуляй якой падчас голаду жылі ў Палтаўскай вобласьці, узрушаная пабачаным, стала расказваць пра тое, што чула ад іх: як забіралі са стала апошні гаршчэчак з фасоляй, як ляпалі ад ветру дзьверы хатаў у вёсцы — ніхто не ацалеў, як галодны хлопец прасіў хоць нешта паесьці, але нічога не было, і ён памёр на вачох дзеда, як звар’яцела і пайшла ў сьвет суседка, пакінуўшы ў хаце маленькага сына. Як дзед узяў хлопчыка да сябе, і як, упаўшы, цалавала ягоныя ногі суседка, калі вярнулася: яна выжыла, і сын яе выжыў... Як потым адзін зь дзедавых сыноў ажаніўся з дачкой таго чалавека, які забіраў апошні гаршчэчак фасолі... «Послухайтэ, послухайтэ», — яна кратала за рукаў сп. Ішчука і ўсё расказвала, расказвала.

Той папрасіў яе запісаць аповед: адна з мэтаў выставы — працяг збору сьведчаньняў пра той жудасны час.

Я разглядала твары на фатаграфіях. Усё пра чалавека напісана на ягоным твары, і ўсё можна пабачыць адразу. Твары сялянаў, такія значныя і магутныя, твары партыйных лідэраў. Чэкісты. Касіёр. Дзеці, якія на каленках зьбіраюць мерзлую бульбу і... сьмяюцца. Голад ня можа адолець сілу шчасьця дзяцінства... Я разглядала фатаграфіі і думала: такіх твараў цяпер няма. Мы, людзі нашага часу, абсалютна іншыя. І сяляне, і партыйныя лідэры, і чэкісты, і дзеці. Чаму мы іншыя? Для сябе я знайшла адказ.

Зазірніце і вы ў гэтыя твары. Проста ідзіце і глядзіце.

Выстава прайшла ў Кіеве і ва ўсіх абласных гарадах Украіны. За гэты час яе паглядзелі 80 000 чалавек. У Маскве яна пацярпела ад нападу маладзёнаў з «Эўразійскага саюзу моладзі», якія зрывалі і таптalі нагамі стэнды з фатаграфіямі людзей, памерлых ад голаду. У Менску выстава арганізаваная дзякуючы пасольству Ўкраіны, дырэкцыі музэю і ўкраінскай дыяспары.



# Лукашэнка заклаў капсулу пад магілёўскую Ратушу


Праект магілёўскай ратушы.

**Ратушу зруйнавалі саветы ў 1957 годзе. Зараз сымбаль гарадзкой вольнасьці і эўрапейскай прыналежнасьці гораду на Дняпры будзе адноўлены.** За цырымоніяй з удзелам А. Лукашэнкі назіраў адзін з чытачоў нашага сайту. Ён даслаў нам свой рэпартаж пра гэта.

Тое, чаго так упарта дамагалася магілёўская апазыцыя ад самага пачатку незалежнасьці нашай краіны, нарэшце адбылося. Пачатак аднаўленьня ратушы сёньня ўрачыста адзначыў Аляксандар Лукашэнка.

Спачатку было яе барбарскае зьнішчэньне ў 1957-м. Потым, ад пачатку 1990-х, аднаўленьне ратушы стала адным з асноўных патрабаваньняў мясцовых прадстаўнікоў апазыцыі БНФ да гарадзкіх уладаў. Намер адбудаваць ратушу быў афіцыйна агучаны магілёўскай адміністрацыяй у 2005-ым («НН» пісала пра гэта), аднак справа замарудзілася праз адначасовае будаўніцтва ў горадзе віядуку над былой Віленскай вуліцай. Ці быў гэты намер вынікам актыўнасьці мясцовых грамадзкіх актывістаў (зборы подпісаў за аднаўленьне ратушы спарадычна вяліся ў горадзе аж да мінулага году) сказаць цяжка. У любым выпадку, важна, што вось ужо некалькі тыдняў на месцы старой ратушы растуць чырвоныя сьцены. Першы паверх ужо быў завершаны, калі дайшла чарга да… урачыстага закладаньня капсулы з пасланьнем нашчадкам у падмурак.

**Пятніца, 23 лістапада.** А палове адзінаццатай натоўпікі студэнтаў паволі падпаўзаюць да месца мерапрыемства. Марознае, вільготнае паветра. Галалёд. Групам студэнтаў, прыведзеных сюды выкладчыкамі, раздаюць — не, не гарачую гарбату — сьцяжкі. Адным дзяржаўныя, другім гарадзкія. Адначасова на другім канцы плошчы блякуюць пару дзясяткаў машынаў з шарыкамі — вясельныя картэжы. Ім давядзецца тут адстаяць да канца. А калі канец? І калі пачатак? Гэта сакрэтная інфармацыя — адгукаюцца на любыя пытаньні на гэты кшталт людзі з ачапленьня. Праз гадзіну нарэшце праходзіць пагалоска па натоўпе — чакаць яшчэ гадзіну. Бліжэй да дванаццатай зьяўляюцца «хуткія дапамогі» — дзьве студэнткі страцілі прытомнасьць. Астатнія стаяць. Вясельныя картэжы таксама стаяць. Час ад часу бібікаюць.


Так ратуша выглядала на пачатку XX ст.

**12.20.** Натоўп ажыўляецца — бачныя першыя машыны картэжу. І хутка ўжо з чорнага «мэрсэдэсу» выходзіць кіраўнік дзяржавы, з усьмешкай ківаючы ў абодва бакі натоўпу. І цішыня. Аўтару гэтых радкоў давялося стаяць у такой жа ўрачыстай вітальнай грамадзе годзе ў 95-ым. Калі кіраўнік дзяржавы выйшаў са сваёй машыны тады, натоўп узарваўся крыкамі.

Традыцыйная дзяўчынка з кветкамі, поціск рук нейкім людзям, падобным на ганаровых будаўнікоў, і прэзыдэнт зьнікае ў натоўпе. Што там адбываецца далей, можна зразумець па ледзь чутным мармытаньні з дынамікаў, ну альбо з «Панарамы». Тэкст капсулы нашчадкам зачытвае дыктар — «Дорогие потомки…» «А чаму па-расейску? — чуецца сьмяшок у натоўпе — Пашкадавалі б нашчадкаў, можа яны расейскую разумець ня будуць».

Мерапрыемства як бы скончылася, але з паводзінаў прэзыдэнта бачна, што яму чагосьці бракуе. Нейкай упэўненасьці, што яго тут успрынялі адэкватна, напэўна — усё ж такі прыгнятае гэтая цішыня паўжывога з халадэчы натоўпу. А. Лукашэнка падыходзіць да першага лепшага студэнта, загаворвае зь ім. Адыходзіць.

«Хай бы ён да мяне падышоў, — кажа студэнтка побач і азіраецца на свайго выкладчыка. — Я б у яго пра льготы спытала. Можна, Аляксандар Пятровіч?» «Ага, я табе спытаю, — сьмяецца чалавек у акулярах. — І мяне з працы звольняць, і рэктара». Дзяўчына таксама сьмяецца.

Прыглядаючыся да твараў, прэзыдэнт тым часам абводзіць позіркам людзей. Выбірае кагосьці, падыходзіць зноў. Чорны «мэрсэдэс» торгаецца за ім, спыняецца, потым ад'яжджае яшчэ далей, да канца натоўпу. Прэзыдэнт адрываецца ад ахвяры сваёй цікаўнасьці і пераходзіць дарогу — там у грамадзе ён выбраў сабе маладога хлопца з чырвона-зялёным сьцяжком, каб пагаварыць. Цяпер размова доўгая, на некалькі хвілінаў. У маладзёна незадаволены твар, ён неяк рэзка жэстыкулюе.

«Пра што пытаўся?» — перапытваюць адно аднаго студэнты, разбрыдаючыся па дамох. «Ці ходзім мы ў тэатар». «Пра льготы сказаў». Спытаў-такі хтосьці.

**Алесь Цюбакоўскі, Магілёў**

# Дарогамі слуцкіх паўстанцаў

Памяць удзельнікаў паўстаньня ў абарону Беларускай Народнай Рэспублікі 24 лістапада ўшанавалі ўдзельнікі паездкі па мясьцінах, дзе адбываліся гістарычныя падзеі. Выправу арганізавалі Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры і Партыя БНФ.

Маршрутам Грозава — Семежава (Капыльскі раён) — Красная Слабада (Салігорскі раён) — Слуцак — Старыя Дарогі праехалі каля ста чалавек.

Пасьля гэтага ў Старых Дарогах, у прыватным музэі Анатоля Белага, быў адкрыты памятны знак героям Слуцкага збройнага чыну.




Ён уяўляе сабой выцінанку па мэталe памерам 3 на 2,5 мэтры, усталяваную на даху музэю. На крыж Эўфрасіньні накладзеная выява паўстанца. Ён памірае, але затуляе герб «Пагоня», зьмешчаны ў цэнтры пячаткі «Часовай рады Случчыны Беларускай Народнай Рэспублікі». Унізе знаку напісана: «Тым, хто пайшоў паміраць, каб жыла Бацькаўшчына».

На наступны дзень, 25 лістапада, у Слуцку каля будынку музэю актывісты Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ правялі свой мітынг разам з маладафронтаўцамі. Удзел у ім узялі 60 чалавек. Прадстаўнікі Таварыства беларускай мовы раздавалі буклеты пра падзеі 1920 году, калі больш за 10 тысячаў паўстанцаў змагаліся супраць бальшавікоў за незалежнасьць Беларусі.

Увечары ж у Слуцку зазьзяла і зазіхцела. За будынкам музэю быў зладжаны фаервэрк, а пасьля маладзёны прайшлі шэсьцем пад сьцягамі да скрыжаваньня вуліцаў Жукава й Леніна. Адказнасьць за падзеі ўзяў на сябе «Правы альянс».



**БТ**

## СЬЦІСЛА



### Беларусь як чацьвертая краіна Балтыі

Стварыць Міжпарлямэнцкую асамблею рэгіёну Балтыі, у якую увайшлі б і прадстаўнікі дэмакратычных сілаў Беларусі, прапанаваў міністар замежных справаў Літвы Пятрас Вайцякунас. Гэтую ініцыятыву ён агучыў у Рызе на канфэрэнцыі «Палітыка добрасуседзтва Эўрасаюзу: па шляху да Эўропы з супольнымі каштоўнасьцямі». Нашу краіну на форуме рэпрэзэнтаваў Аляксандар Мілінкевіч.

### Статкевіч наноў стварае Народную Грамаду

У нядзелю ў Менску ў сядзібе БНФ адбылася першая сэсія ўстаноўчага зьезду «Народнай грамады» (Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі). На ёй ухваленыя праграма і статут, абранае кіраўніцтва. Старшынём цэнтральнага арганізацыйнага камітэту стаў Мікола Статкевіч, а ягонымі намесьнікамі — Алесь Арастовіч, Аляксей Гаўруцікаў і Сяргей Кулініч. Другую сэсію зьезду вырашана правесьці не пазьней як праз два гады.

Перад зьездам прайшлі сем рэгіянальных канфэрэнцыяў. Дэлегатамі былі абраныя 128 чалавек, у працы зьезду ўзялі ўдзел 104 дэлегаты. Паводле арганізатараў, праз невялікай залі давялося скараціць квоту.

### Мінкульт: у Курапатах няма помнікаў

Гэтак Мінкульт адказаў на ліст грамадзкасьці ў сувязі з апошнімі актамі вандалізму ва ўрочышчы Курапаты, якое занесенае ў Дзяржаўны сьпіс гісторыка-культурных каштоўнасьцяў як месца пахаваньня ахвяраў палітычных рэпрэсіяў 1930—1940-х. У лісьце, падпісаным намесьнікам міністра культуры Ўладзімерам Грыдзюшкам, даецца спасылка на пункт 2 арт. 20 закону «Аб абароне гісторыка-культурнай спадчыны». Паводле яго мэмарыяльныя знакі, усталяваныя грамадзкасьцю ва ўрочышчах, быццам бы ня могуць быць занесеныя ў Дзяржаўны сьпіс гісторыка-культурных каштоўнасьцяў.

### Зачыняюць «Віцебскі кур’ер»

Віцебскі аблвыканкам адклікаў свой дазвол на перарэгістрацыю ЗАТ «Выдавецкі дом «Віцебскі кур’ер», які даваў у кастрычніку. Прычынамі названыя адсутнасьць узгадненьня «зь мясцовым выканаўчым і распарадчым органам», неадпаведнасьць памяшканьня, а таксама неадпаведнасьць «патрабаваньням Дырэктывы прэзыдэнта РБ «Аб мерах па ўзмацненьні грамадзкай бясьпекі і дысцыпліны» ды інш.

**Буг; радыё «Свабода»**

# Жыцьцё як у іншых

Фільм з крытыкай нямецкага КДБ заваяваў прыз глядацкіх сымпатыяў на кінафэстывалі «Лістапад».



На XIV Менскім міжнародным кінафэсьце «Лістапад» галоўны прыз заваявала драма «Жыцьцё іншых» нямецкага рэжысэра Флярыяна Хэнкель фон Данэрсмарка. Дзеяньне фільму разгортваецца за пяць гадоў да падзеньня Бэрлінскага муру. Той час меў свае матэрыяльныя прыкметы: партрэты Хонэкера ў кабінэтах і «трабанты» на вуліцах. І нематэрыяльныя: адчуваньнем унутранага страху прасякнуты кожны кадар гэтага кіно. Страху перад Сыстэмай і перад яе авангардам — усёмагутнай спэцслужбай «Штазі», клонам КДБ.

Капітан «Штазі» Герд Візьлер — узорны вінцік таталітарнай машыны. Нават выгляд мае ўзорны — сустрэнеш у натоўпе, ні за што не запомніш. Драматург Георг Драйман, наадварот, зух-мужчына, зь «вяршкоў» мастацкай эліты ГДР, драматург, аблашчаны ўладай. Але ягоная грамадзянская жонка, акторка, спадабалася міністру культуры — выхадцу з «Штазі». Таму Візьлеру загадана знайсці на Драймана кампрамат. Візьлер уладжваецца на гарышчы дому, дзе разьмешчаная кватэра драматурга, і пачынае «праслушку». І тут вінцік раптам выпадае з «машыны». Спэцыяліст па праслухоўваньні пачынае жыць жыцьцём сваіх падапечных…

Культавы расейскі музычны крытык Арцём Троіцкі ўпэўнівае, што «Жыцьцё іншых» ніколі не пакажуць у сучаснай Расеі. І «што ён раіць глядзець гэты фільм дома, зашмаргнуўшы фіранкі». Але ў сучаснай Беларусі фільм паказалі.

Сымптаматычна, што галоўны прыз фэсту «Лістапад», прыз глядацкіх сымпатыяў, заваяваў фільм, закліка784ны абудзіць у гледача пратэст супраць грамадзкага ладу, дзе кіруюць страх і дыктатура.

**Буг; паводле charter97.org**

## СЬЦІСЛА

### Ліквідуюць Інстытут літаратуры

Прэзыдыюм Акадэміі Навук прыняў пастанову аб далучэньні Інстытуту літаратуры імя Янкі Купалы да Інстытуту мовазнаўства імя Якуба Коласа і стварэньні адзінага Інстытуту мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы. Базавым пры гэтым будзе Інстытут мовазнаўства.

### Новыя выданьні «Кнігазбору»

Выйшлі выбраныя творы Якуба Коласа, Адама Мальдзіса і Зарыяна Далэнгі-Хадакоўскага. Томік Якуба Коласа падрыхтаваў доктар філялягічных навук Міхась Тычына. Выданьне складаецца зь вершаў, паэмаў «Новая зямля» і «Сымон-музыка», аповесьці «У палескай глушы», апавяданьняў і публіцыстыкі пад назвай «Клопат пра родную мову». Выданьне Мальдзіса з прадмовамі Генадзя Кісялёва і Вячаслава Чамярыцкага ўключае ягоную першую кнігу «Творчае пабрацімства», прысьвечаную беларуска-польскім літаратурным сувязям, скарочаны варыянт дасьледаваньня «Беларусь у люстэрку мэмуарнай літаратуры XVIII ст.», апісаньні пошукаў і знаходак, а таксама нарысы. Творы этнографа З.Далэнгі-Хадакоўскага (Адама Чарноцкага; 1784—1825) упершыню друкуюцца па-беларуску. Сярод твораў — «Славяншчына да хрысьціянства», фальклёрныя запісы, а таксама ліставаньне і ўспаміны пра З.Далэнгу-Хадакоўскага. Кніга выйшла дбаньнямі Леаніды Мілаш.

### Фонд падтрымкі нонканфармісцкай культуры

Адбылося паседжаньне Рады эўрапейскай інтэграцыі — структуры, створанай з ініцыятывы Аляксандра Мілінкевіча з мэтай выпрацоўкі стратэгічнага бачаньня інтэграцыі Беларусі ў Эўропу. На гэтым паседжаньні сярод чатырох прыярытэтных кірункаў быў названы культурніцкі. Прагучала прапанова стварыць фонд падтрымкі нонканфармісцкай культуры.

## IN MEMORIAM

### Памерлі мітрапаліт БАПЦ Ізяслаў і грамадзкі дзеяч Кастусь Мерляк



Гэта здарылася ў адну ноч, 26 лістапада. Мітрапаліт Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы на эміграцыі Ізяслаў (Бруцкі) нарадзіўся 22 студзеня 1926 у Белавушы (сёньня Столінскі раён Берасьцейскай вобл.) у сялянскай сям'і Данілы й Марыі Бруцкіх–Стампкоўскіх. Быў трэцім сынам у сям'і, якая мела 25 гектараў зямлі.

Пасьля прыходу ў Заходнюю Беларусь саветаў бацька быў арыштаваны і вывезены ў Казахстан. Потым трапіў у Армію Андэрса. Янка Бруцкі ў траўні 1943 быў вывезены на прымусовыя працы ў Нямеччыну.

Па капітуляцыі Нямеччыны апынуўся ва ўкраінскім лягеры ў Гановэры. Улетку 1947 выехаў у Канаду, адпрацаваў паводле кантракту дрывасекам у правінцыі Антарыё, потым перабраўся ў правінцыю Манітоба ў горад Вініпэг. Скончыў Манітобскі ўнівэрсытэт на інжынэра–будаўніка. У 1954 пераехаў у Таронта, быў актывістам Згуртаваньня беларусаў Канады (ЗБК), прыходу сьв. Кірылы Тураўскага БАПЦ. У 1957—1959 быў старшынём ЗБК.

У 1962 г. выехаў у ЗША. У 1979 быў высьвячаны на сьвятара, а ў 1981 хіратанізаваны ў япіскапы БАПЦ з манаскім імем Ізяслаў. Хіратанізацыі не прызнаў уладыка Мікалай (Мацукевіч), што прывяло да расколу ў БАПЦ, які трываў два дзесяцігодзьдзі. Ізяслаў падаў у сьвецкі суд на непакорныя прыходы і часткова адсудзіў сабе іх маёмасьць. Гэта вельмі сумная старонка ў гісторыі беларускай эміграцыі.

Апошнія некалькі гадоў Ізяслаў правёў у доме для састарэлых, слаба разумеючы навакольную рэчаіснасьць.



Кастусь Мерляк нарадзіўся 25 сьнежня 1919 г. у в. Дзетамля (Наваградчына). Ад 1944 г. на выгнаньні. У 1947 г. пераехаў у Буэнас–Айрэс, дзе стварыў Згуртаваньне беларусаў Аргентыны.

Ад 1954 г. жыў у ЗША. Узначальваў Сэктар Рады БНР, у 1959—63 г. — старшыня БАЗА, у 1970–х — віцэ–прэзыдэнт БККА. Адзін зь ініцыятараў куплі будынку для парафіі Кірылы Тураўскага ў Брukліне. У 1968 г. заснаваў прыход сьв. Кірылы Тураўскага ў раёне Рычманд–Гіл. Будынак царквы быў узьведзены ў 1983 г. У 1992 г. выйшлі яго ўспаміны: «Дзейнасьць Кастуся Мерляка: праніклівасьць і грунтоўны падыход».

# Уладзімер Савіч — новы старшыня Саюзу мастакоў

28 лістапада ў канцэртнай залі «Менск» адбыўся 19-ты справаздачна-выбарчы зьезд Саюзу мастакоў Беларусі. Галоўным пунктам праграмы зьезду было абраньне новага старшыні Саюзу. Уладзімер Басалыга сыходзіў з гэтай пасады, бо займаў яе ўжо цягам двух тэрмінаў. Трэці не прадугледжваўся статутам арганізацыі.

Сябар творчай суполкі «Пагоня» мастак Алесь Марачкін быў непакоіўся, што зьезд будзе мець «тусовачны» характар. Трэба адзначыць, што на зьезд амаль не пусьцілі журналістаў, калі не лічыць карэспандэнтаў такіх выданьняў, як «Культура» і «Мастацтва».

«На мінулых зьездах квота ўдзельнікаў была наступнай: адзін дэлегат ад трох сябраў Саюзу, сёньня — адзін ад пяці. Робіцца гэта ў той час, калі колькасьць сябраў арганізацыі пастаянна расьце. Скараціўся час зьезду: калі ён раней праходзіў цягам двух дзён, то цяпер толькі адзін. Былое кіраўніцтва не пераставала ставіць сабе ў заслугу, што Саюз мастакоў не разваліўся, як многія іншыя творчыя арганізацыі. Разам з тым не заўважаліся відавочныя праблемы. У Палацы мастацтваў — найбольшай выставачнай залі краіны — не працуе ніводны мастацтвазнаўца. Некаторым мастакам няма дзе выставіць свае творы. Згадваецца, як перад наведваньнем Лукашэнкам новай прыбудовы Нацыянальнага мастацкага музэю з экспазыцыі зьнялі багата твораў. Нас спрабуюць зноў загнаць у рэзэрвацыю мінулага часу. Сёньня нельга творцаў дзяліць на «сваіх» і «чужых», бо гэта ня мае пэрспэктываў. Нядаўняя сустрэча Праляскоўскага з рок-музыкамі толькі пацьвердзіла гэта», — казаў А. Марачкін.



**Уладзімер Савіч**
нар. у 1952 у вёсцы Хатавічы, Меншчына. Графік, ілюстратар, пэдагог. Скончыў школу-інтэрнат імя І. Ахрэмчыка (1970), Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1976), дзе й застаўся выкладаць. Заслужаны дзяяч мастацтваў Беларусі. Ад 1996 прафэсар. Творы зьберагаюцца ў калекцыях Беларусі, Польшчы, Фінляндыі, Расеі й Славаччыны.

Уладзімер Басалыга адносна зьезду сказаў наступнае: «Прыйшоў час зьмены пакаленьняў. Мне ўжо 67 гадоў, трэба саступаць дарогу маладзейшым. Напэўна, што з прыходам новага пакаленьня ў кіраўніцтва Саюзу зьменяцца яго задачы і погляды. Беларусь мае сапраўды добрых мастакоў, якія неаднаразова рабіліся ляўрэатамі розных міжнародных прэміяў».

На старшынства прэтэндавала дзевяць чалавек. Паводле вынікаў першага туру галасаваньня ў другі выйшлі мастак Уладзімер Савіч і скульптар Аляксандар Дранец. У другім туры зь перавагай усяго ў два галасы перамог Савіч.

Алесь Марачкін вітае абраньне на старшынства Савіча: «Гэта самадастатковы чалавек, які думае пра будучыню выяўленчага мастацтва. Задаволены, што не перамаглі скульптары».

Сам Уладзімер Савіч сваё абраньне пракамэнтаваў так: «Уся мая перадвыбарчая кампанія грунтавалася на павазе і пашане да творчасьці і мастацтва. Спачатку вельмі хацеў узначаліць Саюз, а цяпер нават троху спалохаўся. Цяпер буду вывучаць сытуацыю, каб ведаць, якая спадчына мне засталася».

**Зьміцер Панкавец**

# Вайцюшкевіч прагне драйву

У продажы зьявіўся дзясяты альбом Зьмітра Вайцюшкевіча і WZ-Orkiestra — «Лірыка» на вершы Генадзя Бураўкіна.

Дзясятым альбомам музыка зачыняе сэрыю праектаў на творы вядомых паэтаў. Дагэтуль зьявіліся альбомы на словы Леаніда Дранька-Майсюка, Рыгора Барадуліна, Алеся Камоцкага, Уладзімера Някляева. Вайцюшкевіч плянуе зьвярнуцца да творчасьці маладых паэтаў: «У Беларусі шмат маладых і таленавітых творцаў, чые вершы просяцца на музыку». Але ён не выключае магчымасьці супрацы і з ранейшымі ўдзельнікамі праектаў. Дранько-Майсюк напісаў цудоўны хіп-хопавы верш, які, магчыма, прагучыць на традыцыйным калядным канцэрце ў студзені». «Я не лічу заганнай практыку напісаньня альбомаў штогод, не зважаючы на тое, што ў нашым асяродку пануе звычай рабіць альбомы раз на 3—4 гады» — кажа Зьміцер.

«Лірыка» выйшла рокавая. Сам музыка тлумачыць гэта тым, што хоча энэргіі — і для сябе, і з тым, каб падзяліцца ёй з слухачамі: «Мы здольныя на вялікія канцэрты, і ў тым ліку на вольным паветры».

2 сьнежня ў клюбе «Фартуна» адбудзецца канцэрт З.Вайцюшкевіча і WZ-Orkiestra. Сьпявак пэўны, што праграма задаволіць як «паненак у гадах», так і «маладое пакаленьне». І абяцае паказацьсваё новае амплюа. На імпрэзу запрошаны Генадзь Бураўкін.

Беларуская глыбінка прагне канцэртаў, пра што сьведчаць поўныя залі ў Капылі, Белаазёрску, ды іншых гарадах, сабраныя Аляксандрам Саладухам. «Трэба й нам працаваць у гэтым кірунку, думаю, што нашая творчасьць там таксама будзе запатрабаваная», — адзначыў Зьміцер Вайцюшкевіч.

**Сямён Печанко**

### 19 лістапада

### Не задаволілі скаргу «Народнай волі»

Рэдакцыя газэты марна спрабавала аспрэчыць рашэньне Ленінскага раённага суду, які задаволіў пазоў кіраўніка ідэалягічнага ўпраўленьня Адміністрацыі прэзыдэнта **Алега Праляскоўскага** да «Народнай волі» і яе супрацоўніцы **Марыны Коктыш**. Нагадаем, 1 кастрычніка суд вырашыў спагнаць на карысьць чыноўніка 25 млн рублёў з газэты і 2 млн з журналісткі. Нагодай для пазову стаў артыкул М. Коктыш «Уладзімер Холад па-ранейшаму знаходзіцца ў СІЗА», у якім згадваўся А. Праляскоўскі. Прэтэнзіі ў чыноўніка выклікаў фрагмэнт, у якім ішла гаворка пра чуткі ва ўладных калідорах, паводле якіх У. Холад браў грошы нібыта не для сябе, а для начальства.

### 23 лістапада

### Пратэстанты не пускаюць чыноўнікаў

Вернікі пратэстанцкай царквы **«Новае жыцьцё»** Аб'яднаньня суполак хрысьціянаў поўнага Эвангельля прынялі рашэньне часова прыпыніць наведваньне свайго храма менскімі чыноўнікамі, пакуль ня будзе вырашанае пытаньне вернікаў у Вышэйшым гаспадарчым судзе. Пра гэта пастар царквы **Вячаслаў Ганчарэнка** папярэдзіў кіраўніка аддзелу ў надзвычайных сытуацыях Маскоўскага раёну Менску **Мікалая Бараноўскага**.

### Дапыталі мазырскіх школьнікаў

Супрацоўнікі КДБ у Мазыры наведваюць школьнікаў і студэнтаў, якія ўдзельнічалі ў акцыі пратэсту 16 лістапада. Яны патрабуюць назваць прозьвішчы арганізатараў акцыі. Нагадаем, што ў той дзень міліцыянты затрымалі 25 чалавек на плошчы Леніна, сярод якіх былі 12-гадовыя школьнікі. Студэнта пэдунівэрсытэту **Хведара Чаранкова** супрацоўнікі КДБ наведалі пасьля таго, як паразмаўлялі зь ягонымі сябрамі. На бацьку Хведара Юрася спрабуюць ціснуць праз адміністрацыю на працы.

### КДБ цікавіцца «Белсатам»

У Гомелі супрацоўнікі КДБ затрымалі на ўласнай кватэры і адвезьлі ва ўправу КДБ сябра Беларускай асацыяцыі журналістаў **Сяргея Падсасоннага**. Супрацоўнікі не назваліся. Яны дапытваліся, ці мае спадар Падсасонны дачыненьне да незалежнага тэлеканалу «Белсат».

### 24 лістапада

### Адчапіліся ад маладафронтаўцаў

УКДБ па Гомельскай вобласьці прыпыніла папярэдняе сьледзтва па крымінальнай справе ў адносінах да незарэгістраванай арганізацыі «Малады фронт». Сябра арганізацыі **Андрэй Цянюта**, які праходзіў па гэтай справе ў якасьці падазраванага, атрымаў ліст за подпісам сьледчага УКДБ па Гомельскай вобласьці Дзьмітрыя Седлярова. У ім сказана, што папярэдняе сьледзтва па крымінальнай справе прыпынена «празь немагчымасьць правядзеньня сьледчых дзеяньняў, безь якіх ня можа быць прынятае рашэньне аб завяршэньні папярэдняга сьледзтва».

### 25 лістапада

### Мірон узьняў сьцяг у гонар Караткевіча

Напярэдадні ўгодкаў Уладзімера Караткевіча ў Віцебску каля помніка творцу на будаўнічых рыштаваньнях зьявіўся бел-чырвона-белы сьцяг. На ім, паводле словаў **Барыса Хамайды**, была замацаваная цыдулка з наступным зьместам: «Да народзінаў чараўніка беларускага слова Ўладзімера Сямёнавіча Караткевіча. Хрыстос прызямліўся ў Віцебску». І подпіс: «Мірон».

### Павіншавалі Казуліна

Палітвязьню **Аляксандру Казуліну** споўнілася 52 гады. Каля калёніі «Віцьба-3» сабраліся каля 30 ягоных сяброў і калегаў зь Віцебску, Менску і Наваполацку. Ад уладаў палітвязень таксама атрымаў «віншаваньне» — Генэральная пракуратура адмовілася апратэстоўваць прысуд экс-кандыдату ў прэзыдэнты. Пра гэта абаронцу А. Казуліна паведамілі ў лісьце з Генэральнай пракуратуры. Адвакат Зьміцер Гарачка больш як два месяцы таму падаў скаргу ў пракуратуру з просьбай апратэставаць прысуд, які летась вынес А. Казуліну Маскоўскі раённы суд — пяць з паловай год зьняволеньня за арганізацыю масавых акцыяў пратэсту супраць фальшаваньня вынікаў прэзыдэнцкіх выбараў 2006 г.

### 26 лістапада

### Сяргей Панамароў пад сьледзтвам пяты раз за год

Памочнік клецкага пракурора **Валянціна Лябедзька** адмяніла рашэньне ад 17 верасьня аб прыпыненьні крымінальнай справы супраць выдаўца «Бойкага Клецку» **Сяргея Панамарова**. На працягу году супраць яго чатыры разы распачыналі і прыпынялі крымінальную справу паводле ч.2 арт. 188 КК РБ (паклёп у друкаваных сродках). Нагодай для завядзеньня справы стала нататка ў «Бойкім Клецку» пра кіраўніцу Клецкай юрыдычнай кансультацыі **Натальлю Семашкевіч**.

**СП**

### 28 лістапада

### Салігорцаў аштрафавалі на 5 млн рублёў

Камісія па справах непаўналетніх пад старшынствам **Жанны Карпец** аштрафавала салігорскіх актывістаў апазыцыі **Івана і Ільлю Шылаў** і **Крысьціну Самойлаву**. Паседжаньне камісіі праходзіла ў будынку салігорскага гарвыканкаму. На 16-гадовую Крысьціну Самойлаву было складзена чатыры адміністрацыйныя пратаколы. Дзяўчыну абвінавачвалі ва ўдзеле ў несанкцыянаваных акцыях 16 кастрычніка і 7 лістапада, а таксама ў супраціве міліцыі пры затрыманьні. Агулам Крысьціна Самойлава атрымала 2 мільёны 480 тысяч рублёў штрафу. Івану Шылу далі 1 млн 860 тыс. руб. штрафу. Паколькі Ільля Шыла ня мае 16 гадоў, штраф у 620 тыс. руб. выпісалі ягоным бацькам. Андрусю Тычыну далі папярэджаньне.

**ЗП**



CHARTER97.ORG

**27 лістапада, у гадавіну Слуцкага збройнага чыну, моладзь вывешвала ў Менску сьцягі.**



У вёсцы Студзёнцы пад Барысавам перапахавалі парэшткі 223 напалеонаўскіх жаўнераў. Пахаваньне суправаджалася касьцюмаванай бітвай.

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## У Іванаўскім раёне на памінках забілі ўдаву

На саракавіны па мужы з самаробнага пісталета забілі 48-гадовую ўдаву. Трагедыя адбылася 25 лістапада ў вёсцы Кляшчы (Кобрыншчына). Тры нецьвярозыя мужчыны (23, 24 і 28 гадоў) зьявіліся на саракавіны нязваныя. Госьці пачалі абурацца, завязалася бойка. У выніку стрэлам з самаробнага пісталета, зараджанага кавалачкам сьвінцу, была забітая гаспадыня. Бандзюкі затрыманыя, сканфіскаваны пісталет.

## Кіроўца маршруткі выпіў дзьве бутэлькі і сеў за руль

У Віцебскай вобласьці ДАІ затрымала нецьвярозага кіроўцу маршруткі, у крыві якога знайшлі 3,6 праміле сьпірту (прыкладна ён выпіў 1 літар гарэлкі).

## Карла Маркса зашкляць

Алеі, фантаны, лаўкі, крамы, сувэнірныя крамкі, кавярні — такой бачаць архітэктары менскую вуліцу Маркса ў недалёкай будучыні. Кавалак ад вуліцы Валадарскага да вуліцы Леніна будзе закрыты для машынаў. Тут разьмесьціцца зона адпачынку і забавак. На першых паверхах дамоў разьмесьцяцца кавярні, крамы, а ня офісы. Самай грандыёзнай часткай перабудовы мае стаць зьяўленьне шклянога пасажу. Ён злучыць дом № 17 і новы будынак, які пабудуюць на месцы гаражоў. У пасажы размесьцяцца кавярні, крамы.

## Аляксандар Глеб — найлепшы футбаліст Беларусі 2007 году

Згодна з традыцыйным апытаньнем газэты **«Прессбол»**, найлепшым футбалістам Беларусі 2007 г. прызнаны паўабаронца лёнданскага «Арсэналу» і нацыянальнай зборнай Аляксандар Глеб, які набраў 818 балаў. Глеб прызнаны найлепшым пяты раз за апошнія шэсьць гадоў. Другое месца заняў галкіпер ФК «Масква» і зборнай Беларусі Юры Жаўноў, на трэцім месцы Раман Васілюк — форвард «Гомеля».

## Беларусы згуляюць у адной групе з Англіяй, Харватыяй, Украінай!

У Дурбане прайшло лёсаваньне адборачных групаў да чэмпіянату сьвету па футболе, што пройдзе ў 2010 г. у Паўднёва-афрыканскай рэспубліцы. Супернікамі зборнай Беларусі па шостай адборачнай групе стануць: Харватыя, Англія, Украіна, Казахстан, Андора.

Гульні пройдуць у 2008—2009 гадах. З кожным супернікам беларусы згуляюць дома і ў гасьцях. На чэмпіянат сьвету выходзіць каманда, якая зойме 1-е месца, каманда, якая зойме другое месца, правядзе стыкавы матч.

## Мірны разьвёўся з Б'ёркманам

Пра гэта ў інтэрвію «КП в Беларуси» заявіў Мікалай Мірны — бацька вядомага тэнісіста. Б'ёркман (15-ы рэйтынг сярод парных гульцоў) зараз будзе выступаць у пары зь ня менш вядомым зымбабвійцам Кевінам Ульетам (10-ы рэйтынг). Макс Мірны (1977 г.н.) цяпер займае 16-е месца ў рэйтынгу парных тэнісістаў. У пачатку чэрвеня 2003 г. ён быў на першым месцы. У індывідуальным рэйтынгу Асацыяцыі тэнісістаў-прафэсіяналаў Мірны знаходзіцца ажно на 151 месцы. У чэмпіёнскай гонцы 2007 г. ён — 88-ы. Падзеньне працягваецца.

**Буг, ЗП; Ул. інф., БелаПАН, Эўрарадыё «Минский Курьер», pressball.by**

## Дзень герояў Беларусі

**Дарагія Суродзічы,**

11-га лістапада трыццаць тысяч Канадыйцаў сабраліся ў сталіцы Канады кругом помніка маладым змагаром, якія «ПАЙШЛІ ПАМІРАЦЬ ЗА НАШУЮ ВОЛЮ». Гэтыя словы былі на вуснах усіх прысутных. Шмат людзей плакалі. Увесь край з удзячнасьцю глядзеў, як найвышэйшыя асабістасьці Канады і прадстаўнікі краінаў усяго сьвету клалі вянкі на магіле невядомага жаўнера Канады.

У лістападзе 1920 г. у Беларусі нашыя слаўныя Случчакі таксама пайшлі паміраць — «ПАЙШЛІ ПАМІРАЦЬ, КАБ ЖЫЛА БАЦЬКАЎШЧЫНА». З гэтымі словамі, вышытымі на штандары, дзесяць тысяч змагароў, войска зьнямоканай ужо бальшавікамі Беларускай Народнай Рэспублікі, узялі ў рукі зброю, каб бараніць свой народ ад новае няволі.

Рэспубліка Беларусь, аднак, ня будзе адзначаць гэтага гераічнага збройнага чыну. Толькі аднадумцы Случчакоў аддадуць ім чэсьць, як гэты мы робім ува ўсім сьвеце кожны год.

Дарагія Сябры, вітаю ўсіх Вас з слаўным чынам нашых Слуцкіх герояў. Ганаруся імі. Ганаруся сваім народам, які, абвясьціўшы незалежнасьць Беларусі пасьля доўгае няволі, знайшоў у сабе сілу і мужнасьць, каб бараніць сваю маладую дзяржаву.

Заклікаю ўсіх Вас належна адзначыць наш слаўны Дзень Герояў і з удзячнасьцю прыпомніць тых, хто пайшоў паміраць, каб жыла Бацькаўшчына.

Жыве Беларусь!

**Івонка Сурвілла, Старшыня Рады БНР**

## Бел-чырвона-белы Эўраньюз

**25 лістапада па Эўраньюз паказвалі жараб'ёўку Чэмпіянату сьвету па футболе 2010 году.**

У табліцы, дзе паказвалі групу, у якую патрапіла Беларусь, насупраць назвы Belarus быў намаляваны бел-чырвона-белы сьцяжок!

**Scooter**

## Геаграфічны лікбез для беларускіх патрыётаў

**36-гадовы выкладчык геаграфіі з Воранаўскага раёну Віталь Куплевіч паражыў звальненьне з працы, паспытаў арыштаў ды розных жыцьцёвых нягодаў.** Мы сустрэліся зь ім пасьля адбыцьця чарговага пакараньня і пагутарылі. Віталь добра валодае літоўскай і польскай мовамі, ён займаецца дасьледчай працай у архівах у Варшаве, Кракаве і Беластоку, піша кнігу.

Настаўнік паходзіць зь мястэчка Радунь. Геаграфіі яго вучыў Іван Фаценка, краязнаўца, які стварыў народны гісторыка-краязнаўчы музэй. Вучыўся Віталь на геаграфічным факультэце ў Берасьцейскім унівэрсытэце, дыплём абараняў на тарашкевіцы. У 1991, убачыўшы бел-чырвона-белыя сьцягі ў цэнтры Берасьця, герб Пагоню, даведаўся пра дзейнасьць БНФ. Потым пазнаёміўся з працамі Зянона Пазьняка пра трагічны лёс нашых суайчыньнікаў.

Некаторы час Віталь Куплевіч выкладаў геаграфію Літвы на літоўскай мове ў беларускай гімназіі ў Вільні. Ён працаваў пад кіраўніцтвам дырэктаркі Галіны Сівалавай, энэргічнай завадатаркі і арганізатаркі беларускага навучаньня. Легендарная жанчына, сапраўдны генэратар ідэяў, моцна на яго паўплывала. Сустракаўся ён зь Сержуком Вітушкам, заснавальнікам «Талакі», і слухаў ягоныя гутаркі.

У 1998 годдзе Віталь пазнаёміўся з Аляксандрам Мілінкевічам. Грамадзкая арганізацыя «Ратуша» пераканала яго ў непазьбежнасьці зьменаў. З аднадумцамі-настаўнікамі Віталь выдаваў на Гарадзеншчыне газэту «Мястэчка». Сябра Алеся Сакалова звольнілі з працы, сталі прэсаваць іншых. Суседнюю паваскую школку разагналі, распусьцілі з фармальных падставаў. Калі Віталя Куплевіча звольнілі са школкі ў Воранаўскім раёне, то ён паехаў уладкоўвацца ў іншую. Але адзін тэлефонны званок начальства зачыняў для яго ўсе дзьверы.

«Цяпер у школе пануе шалёная ідэалягізацыя, гэта робіць немагчымым працу настаўніка-дысыдэнта. У такіх умовах застаецца займацца самаадукацыяй і пісаць кнігі. Вясковыя вучні спрабуюць шукаць адказы на хвалюючыя пытаньні, але сталіца — далёка, Бог — высока, і яны часам губляюцца. Акрамя таго, яны жывуць у цяжкіх умовах, часам ня маючы самага неабходнага для жыцьця. Адсутнасьць ідэі, асноўных інстытутаў духоўнага апірышча прыводзяць да паступовай дэградацыі. Людзі пачынаюць сьпівацца», — канстатуе Віталь.

У 2006 годзе Віталь з моладзьдзю быў на Плошчы, заставаўся начаваць у намёце зь юнакамі, каб засьведчыць ім, што пэдагогі разам зь імі і падтрымліваюць іх, што ёсьць выкладчыкі з дэмакратычнымі поглядамі, ня ўсе настаўнікі — рэакцыянэры. Разам з моладзьдзю настаўнік атрымаў 15 сутак арышту на Акрэсьціна.

Пасьля безвыніковых пошукаў заробку на радзіме, беларускі выкладчык уладкаваўся працаваць у польскага пана на куратніку. Давадзіцца яму некалькі разоў на дзень цягаць тачкі з кормам для птушак. Здабываючы на жыцьцё ўласным мазалём, настаўнік ня страціў выкшталцонасьці манераў і інтэлектуальнай вастрыні погляду. Віталь марыць абараніць дактарант у Польшчы.

«Уласнымі рукамі я зарабляю грошы на сваю кнігу. Працую ў бібліятэках і архівах. Там, дарэчы, можна знайсьці творы малавядомых у нас аўтараў. Я хачу стварыць падручнік па геаграфіі для сьвядомага беларускага патрыёта, так бы мовіць, беларускую геаграфічную альтэрнатыву. Падручнік прафэсара І. І. Пірожніка з БДУ, на жаль, цалкам адлюстроўвае геапалітычныя інтарэсы Расеі. Нашым юнакам патрэбны сучасны геаграфічны лікбез з пункту гледжаньня беларуса».

«Лічу, што нашай краіне ў будучыні варта разьвіваць у першую чаргу інфармацыйныя тэхналёгіі, банкаўскую сфэру, навуку, культуру, адукацыю і турызм, і ў меншай ступені займацца індустрыялізацыяй і аграрнай сфэрай. Да таго ж, у нас цяпер шалёны недахоп прадпрымальніцтва...»

Перад «Эўрапейскім маршам» Віталя Куплевіча зноў затрымалі. На тры дні яго кінулі ў ізалятар часовага ўтрыманьня, абвінавацыўшы ў крадзяжы 7 кілё бульбы, каб не паехаў у Менск. На голых дошках з прусакамі і клапамі бавіў час інтэлігент і патрыёт. Пасьля ў яго нарадзіліся наступныя радкі.

«Найбольшую трывогу выклікае стан беларускіх ізалятараў часовага ўтрыманьня. У нашы дні кожны можа быць кінуты на пэўны час у фантастычную камэру, дзе ўбачыць толькі дошкі, на якіх патрэбна будзе спаць. Сьцены камэры белыя, аднак яны больш чорныя ад дыму цыгарэт. У куце стаіць фантастычная сьметніца з пластыку. У камэры стаіць жудасны смурод. Праз маленькае вакенца часам даходзіць сонечны прамень, а сьвятла лямпачкі не хапае нават для таго, каб чытаць газэту. З раніцы затрыманым падаюць цэлы кубачак гарачай вады. У абед на першае і другое прыносяць нешта поснае зь мясцовай сталоўкі. А на вечар, каб не пераядаліся — аналягічны кубачак з такой ужо да глыбіні душы знаёмай гарачай вадою. Тэмпэратура ў камэры ўстановы амаль што не адрозьніваецца ад тэмпэратуры навакольнага асяродзьдзя. Так выглядае ізалятар часовага ўтрыманьня Воранаўскага РАУС. Сярэднявечча за 70 км ад прыстойнай эўрапейскай сталіцы Вільні».

**Э. Дзьвінская**

## Быў. Ёсьць? Буду?

**Нядаўна мы зь сябрам абмяркоўвалі, ці не шкада, што Караткевіч не дажыў да нашых дзён.** З аднаго боку, чалавек, які аддаў сябе Беларусі, ня бачыў, як яна, гаротніца, трывала сьпярша Чарнобыль, потым рэфэрэндум 1995 году ды шмат яшчэ якое навалы. Зь іншага боку, каб ён жыў, дык мо й ня страцілі мы мову, «гішторыю» ды шмат яшчэ чаго. Але ж ці ня страцілі б? Ці не пераацэньваў ён нас? Вядома ж, Караткевіч, кажуць тыя, хто яго ведаў, быў аптымістам. Але ж цяжка мне было ўявіць, што аптымістычны ён быў нават у радках «Сьвет шчодры. Сьвет мяне паўторыць… Ну, а ня сьвет, дык Беларусь. Мне — досыць…». Баюся я, таксама нязломны аптыміст, што Беларусь ужо ня здолее яго паўтарыць. Хіба толькі «шчодры сьвет»… Бо нават «Наша Ніва», якая ўзгадала пра народзіны Казуліна, ня ўспомніла пра народзіны славутага сына Беларусі, якому 26 лістапада споўнілася б 77. Што казаць пра астатніх? Нейк сумна…

**Аляксандар Чубрык, Менск**

## У Жодзіне будзе помнік Радзівілу

**Прыняцьце афіцыйнай датай нараджэньня Жодзіна 1643 год і зацьверджаньне сьцяга гораду было толькі першай часткай ушанаваньня яго гісторыі.** Цяпер і Савет дэпутатаў, і Краязнаўчы музэй разам з Аддзелам культуры пераходзяць да больш рашучых справаў. Цяпер галоўным для іх будзе стварэньне гістарычнай інфраструктуры ў горадзе. На 2008 год у межах сьвяткаваньня 365-годзьдзя Жодзіна з даты першага ўпамінаньня плянуецца перайменаваньне жодзінскай вуліцы Калініна ў Багуслава Поле, а таксама будаўніцтва рэканструкцыі вадзянога млыну на рацэ Жодзінка, пабудаванага ў 1663 годзе. Будаўнічыя працы ўжо выклікаўся аплаціць Жодзінскі водаканал. Будзе і кампанія па ўсталёўцы помніка заснавальніку горада — Багуславу Радзівілу.

**Гудзілін, Жодзіна**

## Ъ наступае

**Пакуль чыноўнікі вырашалі лёс беларускага мяккага знаку, цьвёрды знак расейскі ўжо пачаў муляць вочы, бо зь літары ператварыўся ў элемэнт маркетынгу.** Можна падумаць, што «Пломбіръ» у Мар'інай Горцы пачалі вырабляць раней, чым у Плёмб'ер-дэ-Бэнэ, а крэмам для галеньня «Монархъ» мазалі вакол барадаў расейскія імпэратары. Цьвёрды знак не ўвапхнеш у слова «молоко», дык ніжэй дадалі: «Рогачёвъ». Адна літара — і горад, старэйшы за Бэрлін, Стакгольм, Бухарэст, ператварыўся ў глухі закутак царскай Расеі. Шоры правінцыяналізму засьцяць нават друкарам, якія вывесілі на Савецкай вуліцы Гомелю плякат: «Возрожденіе традицій печатногно д(ЯТЬ)ла». Калі нават яны не адчуваюць повязь са Скарынам, дык што казаць пра майстроў «часовъ»! Гаспадары бару «Русскій трактиръ», прынамсі, адкапалі тую назву ў гомельскай гісторыі, а вось вытворцам піва «Бульбашъ» няма клопату, што за царскім часам гэтай мянушкі проста не існавала.

«Ты цёмны, сьляпы, нібы крот», — пісаў Багдановіч, дык, быццам насьміхаючыся з клясыка, у Гомелі ўсталявалі ажно чатырох бэтонных кратоў: сьляпыя істоты выкарасkваюцца на сьвятло зь вялізных кратавіньняў. Бусел і зубр мусяць пацясьніцца…

**Сяргей Баранаў, Гомель**

## Піша вам школьнік

**Чаму ўлада зьмяніла старыя падручнікі па гісторыі Беларусі на новыя? Чым Міністэрству адукацыі не падабаецца нашая гісторыя?**

Я прагледзеў новы і стары падручнікі. Я ўбачыў, што зьмянілі і мову, і зьмест. Як выявілася, падручнікі зьмянілі для таго, каб мы, падлеткі, ня ведалі нашую гісторыю. Ня ведалі пра пэрыяд сталінскіх рэпрэсіяў 1930-х гадоў, пра дыктатуру. У мяне такое ўражаньне, што гэта зрабілі, каб школьнікі не маглі супастаўляць рэпрэсіі і дыктатуру сёньняшняга часу з рэпрэсіямі і дыктатурай 1930-х гадоў. Адрозненьняў шмат. Добра, што цяпер можна набыць хлеб і малако за грошы, а не па картках. Але цэны ўсё растуць і растуць. Людзей, якія выступаюць супраць рэпрэсіяў, таксама ўсё больш. І гэта факты.

Улада таксама ня сьпіць. Яна знаходзіць усё новыя спосабы ўціску людзей, якія не падпарадкоўваюцца ўладзе.

Мы, Моладзь, расьцем. І праз некаторы час пераможам і дыктатуру, і рэпрэсіі, і хлусьню сёньняшняга часу!!!

**Стэсік Станіслаў**

## Чаму мы часта прастуджваемся

**Галоўная прычына гэтага, як кажуць, ляжыць на паверхні.**

Прыгадайце пачатак лістапада. Позьняя восень, але да зімы амаль цэлы месяц. І надвор'е адпаведнае: ноччу — 1—3 градусы марозу, удзень — каля 0. Мокры сьнег зьмяняецца дожджыкам і пад нагамі лужыны зь сьнега-лядовай кашай. А калі кінеш позірк на вуліцу, дык здаецца, што людзі ўжо сустрэлі сьцюдзёную зіму. На ўсіх мінаках кажушкі, так званыя «аляскі» і нават футры да пятаў, на рэдкіх адзінках (студэнтах) лёгкія курткі, і ня бачна ніводнага чалавека ў плашчы, лёгкім паліто ці ў іншым адзеньні, што адпавядала б сэзону .

Уладальнікам кажушкоў і футраў у такіх умовах ня толькі цёпла, але і горача. Ад гарачыні ім даводзіцца ўспацець, яны вымушаныя расшпільвацца да бялізны. Дастаткова хуткаплыннага халаднаватага ветрыка, каб у гэтых спацелых уладальнікаў футраў і кажушкоў заклала нос, схапіла горла або пачаўся кашаль, бо іхная прамоклая ад поту бялізна ўжо не трымае, а аддае цяпло. Людзям, якія не прызвычаіліся да ахаладжэньня, гэта пагражае захворваньнем.

Адна прастуда, другая, трэцяя — і прастуднае захворваньне ўжо ператвараецца ў хранічную хваробу. І ўсё — праз вельмі добрае, але неадпаведнае адзеньне.

Між іншага, ня толькі чалавеку, але і адзеньню нядобра. Няцяжка здагадацца, што дождж псуе футра, кажушкі з «аляскамі» таксама. Яны наагул прызначаныя для нашэньня толькі ў маразы пры тэмпэратуры паветра ад мінус пяць градусаў і ніжэй.

Выходзіць, што псуем вопратку дзеля здароўя, але здароўе псуецца праз гэтую вопратку. У любой вопратцы заўсёды павінна быць ня горача і ня холадна, а камфортна. Гэта значыць — зручна, утульна. Нават лепш, каб крышачку халаднавата. З пункту гледжаньня здаровага ладу жыцьця ў наш час у Беларусі, дзе ўзімку маразы звычайна ў межах 5—15 градусаў і частыя адлігі, а кожны наступны год цяплейшы за папярэдні (у сёлетнюю зіму сыноптыкі абяцаюць маразы ў межах 3 — 8 градусаў), кажушкі і футры ў асабістым гардэробе трэба вешаць у самым дальнім куце.

**Генадзь Шэршань**

# Беларусь tomorrow

## Напішы, што думаеш, і зьезьдзі ў Эўропу!

Калі табе да 26 гадоў і ты не абыякавы да будучыні Беларусі, то напішы эсэ і адпраў на электронны адрас belradio@mail.ru

**Што пісаць?**

Абяры адну з шасьці тэмаў або можаш пісаць па кожнай:

1. Нацыянальная ідэя
2. Высокія тэхналёгіі
3. Адукацыя
4. Культура
5. Зьнешняя палітыка
6. Палітычны лад краіны

**Колькі часу на роздум?**

На напісаньне эсэ даецца час да 10 сьнежня. Прадугледжаны памер працы — ня больш за 2000 знакаў. Тэматыка у межах буйной тэмы (напрыклад, адукацыя) можа быць якой заўгодна, ад пляну для канкрэтнага ўніверу да глябальнай ацэнкі сыстэмы адукацыі.

**А судзьдзі хто?**

У якасьці судзьдзяў выступяць вядомыя экспэрты ў розных галінах (па адным на кожную тэму).

У іх склад увайшлі:

**Сяргей Панькоўскі** — кандыдат філязофскіх навук, палітоляг, кіраўнік праекту «Наше мнение»

**Раман Якаўлеўскі** — аглядальнік міжнароднага Інтэрнэт-парталу «Wider Europe»

**Уладзімер Мацкевіч** — філёзаф і палітоляг

**Юры Зісер** — старшыня дырэктараў парталу tut.by

**Пётар Марцаў** — стваральнік газэты БДГ, журналіст, бізнэсмэн і аналітык

**Максім Жбанкоў** — кінакрытык, журналіст, выкладчык «Беларускага калегіюму»

**Як перамагчы і куды едзем?**

У выніку экспэрты вызначаюць 6 пераможцаў: па адным на кожную тэму. У дадатак, паводле вынікаў галасаваньняў вызначаюцца яшчэ 2, за працы якіх было аддана больш за ўсё галасоў. Гэтыя 8 асобаў паедуць ў 4-дзённае падарожжа па Польшчы, дзе сустрэнуцца з палітыкамі, эканамістамі, даведаюцца болей пра польскія рэформы.

І памятайце — чым раней прышлеце працу, тым большая колькасьць чалавек пасьпее за яе прагаласаваць.

Кожны тыдзень у нядзелю на хвалях «Эўрарадыё» і на сайце www.belradio.fm новы праект «Беларусь tomorrow» — цыкль дыскусіяў пра будучыню Беларусі.

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# Наступнае пашырэньне Эўрасаюзу

Эўраінтэграцыя засьцерагла краіны Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы ад спаўзаньня ў традыцыйны для іх стан — дыктатуру. Аб нашых эўрапейскіх і пазаэўрапейскіх альтэрнатывах піша **Сяргей Богдан**.

Амаль незаўважанай прайшла важная навіна аб больш чым скептычным стаўленьні ЭС да магчымасьці свайго новага пашырэньня. Такім чынам, калі балканскія краіны не прыкладуць больш намаганьняў у ажыцьцяўленьні прапанаваных Эўрасаюзам палітычных рэформаў, дык могуць разьлічваць на ўступленьне ў ЭС толькі ў «сярэдне- ці доўгатэрміновай» пэрспэктыве. Гэта — высноўа Гадавога дакладу аб дасягнутым прагрэсе, абнародаванага на пачатку месяца прадстаўнікамі Эўракамісіі. Аўстрыйская «Die Presse» кажа аб нязвыкла жорсткім тоне Брусэля ў дачыненьні да кандыдатаў на ўступленьне. Дзьверы Саюзу зачыняюцца?

## Толькі Харватыя набліжаецца да ЭС

Выразных посьпехаў на шляху эўраінтэграцыі, на думку Брусэля, дасягнула толькі Харватыя, якую складальнікі дакладу лічаць узорам для іншых. Харватыя з кастрычніка 2005 году зьяўляецца краінай-кандыдаткай, і зь ёй пасьпяхова вядуцца перамовы аб уступленьні. Альбанія, Македонія і Чарнагорыя ў эўрачыноўнікаў захапленьня не выклікаюць праз маруднасьць ці поўную адсутнасьць рэформаў дзяржаўнай сыстэмы і пананаваньне карупцыі.

Македонія зьяўляецца кандыдаткай на ўступленьне зь сьнежня 2005 году, але перамовы пра тое зь ёй яшчэ не пачыналіся.

Альбанія падпісала ў чэрвені 2006 году Пагадненьне аб стабілізацыі і асацыяцыі (ПСА), Чарнагорыя падпісала ПСА ў кастрычніку 2007 году. Згаданае Пагадненьне — гэта адзін зь першых крокаў на шляху інтэграцыі, калі мэта — сяброўства ў ЭС — ужо відаць на даляглядзе.

Асабліва ж незадаволеная Камісія Сэрбіяй ды Босьніяй. Брусэль перапаймаецца рэваншысцкімі дзеяньнямі сэрбскіх палітыкаў у Босьніі, а таксама правалам спробаў стварыць супольную паліцыю для ўсіх трох грамадаў краю, што дагэтуль жывуць паасобку ў дзьвюх дзяржаўках — сэрбскай і басьняцка-харвацкай. Палітычная сыстэма гэтай краіны апынулася на мяжы поўнага паралюшу і была ўратаваная ўмяшаньнем міжнароднага ўпаўнаважанага. Праўда, Босьнія скончыла ў сьнежні 2006 году перамовы па ПСА, хоць і не падпісала пакуль пагадненьня.

З Сэрбіяй праблемы іншага кшталту. Тая не сьпяшаецца выдаваць ваенных злачынцаў, чаго патрабуе ЭС. Брусэль таксама хоча ад Бялграду «канструктыўнейшага падыходу» ў косаўскім пытаньні. Сэрбія скончыла 10 верасьня перамовы па ПСА, але пагадненьня не падпісала.

Інтэрнэт-выданьне «euObserver» цытуе словы кампэтэнтных эўрачыноўнікаў, «рэфармацыйны працэс у шэрагу дзяржаваў запаволіўся». Гэта турбуе Эўракамісію, бо «наступны год будзе вырашальным для кансалідацыі трансфармацыйнага працэсу». Прасьцей кажучы, налета высьветліцца, ці стануць балканскія краіны больш выразнымі дэмакратыямі безь якіх-кольвечы прыставак, кшталту «пераходны» ці «сувэрэнны», альбо ўвойдуць у «шэрую зону» дзяржаваў, што трывала загрузьлі паміж дэмакратыяй і аўтарытарызмам (як большыня постсавецкіх краінаў). Праўда, усе шэсьць балканскіх краінаў дасягнулі значнага поступу ў эканамічным збліжэньні з ЭС.

Набліжэньне палітычных і эканамічных сыстэмаў балканскіх дзяржаваў да эўрасаюзаўскіх стандартаў ёсьць важнай часткай палітыкі пашырэньня Саюзу. Зь іншага боку, эўраінтэграцыя дае моцную палітычную матывацыю, якая падштурхоўвае краіны-кандыдаты да рэфармаваньня сваёй палітычнай культуры. Як зазначаецца ў дакладзе, «пэрспэктыва сяброўства ніколі не была важнейшаю, чым цяпер, бо яна дапамагае дзяржавам перамагаць крызісы, урадавую слабасьць і выклікі дэмакратычнаму ладу».

## Палітычная інжынэрыя

Эўраінтэграцыя праз прыняцце новых дэмакратычных стандартаў прапануецца балканскім кіраўнікам узамен на адмову ад старых мэтадаў панаваньня. Прытым, вядома, некаторым кіраўнікам, здаецца, лепш мець сваю невялічкую начальніцкую сініцу, але ў руках, чым эўражорава ў аблоках. Анягож, радыкальная зьмена палітычнай культуры можа прывесьці і да зьмены гіерархіі ды кадраў, бо чыноўнік, што прывык вырашаць грамадз-




1 — Харватыя. 2 — Сэрбія. 3 — Чарнагорыя. 4 — Босьнія. 5 — Альбанія. 6 — Македонія.

кія пытаньні за пляшкай сьлівовіцы, зусім не прагне працаваць паводле закону. Пытаньне, праўда, і ў тым, ці грамадзяне, чые справы ён вырашае, гатовыя перайсьці да новае мадэлі дзяржаўнага ладу, дый несьці чыноўнікам не сьлівовіцу, а заявы.

Удалыя прыклады кардынальнае перабудовы палітычнага ладу і, што важней, палітычнай культуры ёсьць. Паваенныя Японія і Нямеччына былі пастаўленыя ў жорсткія інстытуцыйныя рамкі у сваім палітычным разьвіцьці пасьля капітуляцыі ў 1945 годзе, створаныя амэрыканскімі штабамі. Сёньня ад сярэднеэўрапейцаў вымагаюць выкананьня Капэнгагенскіх крытэраў, а тады ад немцаў і японцаў вымагалі выкананьня імі новых нацыянальных Канстытуцыяў. Праўда, варыянту «не выконваць» у іх, у адрозьненьне ад сёньняшніх сярэднеэўрапейцаў, не было — пра гэта клапаціліся замежныя вайсковыя кантынгенты. Занадта важныя былі гэтыя краіны, каб у іх не было дэмакратыі.

Больш мяккімі варыянтамі палітычнае перабудовы была пазьнейшая эўраінтэграцыя краінаў Паўднёвай Эўропы, што не належалі да ліку стабільных дэмакратыяў — Грэцыі, Гішпаніі і Партугаліі. Яны былі ўцягненыя ў працэс эўраінтэграцыі неўзабаве пасьля заканчэньня ў іх дыктатарскіх панаваньняў. Фактычна, іх прымалі і дзеля таго, каб утрымаць гэтыя краіны ад вяртаньня да звыклай ім дыктатуры таго ці іншага колеру (сёньня ўжо забыліся, што тады гэта было зусім рэальна — гішпанскія путчысты стралялі ў парлямэнце яшчэ ў 1981 годзе).

Прыняць, абы ня мець пазьней праблемаў, — гэта датычыць і апошніх хваляў пашырэньня ЭС на ўсход і паўднёвы ўсход. Адной з галоўных ідэяў-фікс палітычнай эліты заходніх краінаў пры канцы 1980-х, нагадаем, была перакананасьць у непазьбежнасьці крывавага хаосу ва Ўсходняй і Цэнтральнай Эўропе пасьля заканчэньня Халоднае вайны. Сёньня гэта гучыць як адарваная ад рэальнасьці пужалка.

Але падставы для такіх прагнозаў былі! Пры ўсёй павазе да традыцыяў сярэднеэўрапейскіх змагароў за свабоду, зазначым, што эўраінтэграцыя (не кажу ЭС, бо эўраінтэграцыя мае на ўвазе нешта шырэйшае) не дала рэгіёну вярнуцца ў яго традыцыйны стан часоў незалежнасьці — дыктатуру.

Палітычная культура гэтых краінаў багатая на спадчыну зусім не дэмакратычнага характару. Вызваліўшыся з доўгае імпэрскае няволі, маладыя нацыі Ўсходняй і Цэнтральнай Эўропы вельмі хутка пачалі гнабіць меншых за сябе ды пераптварыліся ў адкрытыя дыктатуры. Пэтс, Ульманіс, Сьмятона, Пілсудзкі, Хорці, Антанэску, Мэтаксас, баўгарскія і югаслаўскія кіраўнікі, ня кажучы ўжо пра масавыя аўтарытарныя рухі — і камуністычнага кшталту, і харвацкіх усташоў ды румынскай Жалезнай гвардыі... Адзіным выняткам была дэмакратычная Чэхаславаччына, дый тая не патрапіла абараніць сябе.

Па Другой сусьветнай вайне палітычная культура Эўропы на ўсход ад Эльбы працягвала фармавацца ў савецкіх традыцыях «народнае дэмакратыі», што не дадало гэтым краінам дэмакратычных ідэалаў. Вядома, была хваля 1989 году, але яна хутка адхлынула і зноў на паверхню вылезьлі знаёмыя змрочныя постаці — ад посткамуністаў да фашыстаў. І толькі жорсткія ўмовы эўраінтэграцыі, калі нават у адказ на бяскрыўдныя адхіленьні ад «правільна-эўрапейскага» курсу Качыньскіх калябрусэльскія лібэралы ўсчыняюць вэрхал, не дазволілі рэгіёну вярнуцца назад — да ўласнай, «кіраванай» дэмакратыі, кшталту расейскай.

## Швайцарскі варыянт

Разам з тым, эўрасаюзаўскі шлях — не адзіны шлях да годнае мадэрнае дэмакратычнае дзяржавы. Гэта даводзяць прыклады Швайцарыі і Нарвэгіі. Ці маглі абраць такую дарогу сярэднеэўрапейскія дзяржавы? На жаль, наўрад ці. Справа ў тым, што функцыянаваньне сучаснай дзяржавы вымагае ня толькі «ажыцьцяўленьня манаполіі гвалту на вызначанай тэрыторыі» (адно з азначэньняў дзяржавы), але і падрыхтаванасьці элітаў дый разуменьня імі вельмі многіх рэчаў (як хаця б таго, што праблемы іншадумства не вырашаюцца шляхам яго фізычнага зьнішчэньня) ды валоданьня пэўнымі ўмельствамі (прыкладам, бачаньня ня толькі сёньняшніх выгодаў), і, перадусім — пэўнае сьмеласьці. Не фанабэрыстага хамства «а-ля Чавэс», а ўпэўненага і адказнага намеру разьвіваць свой край.

Ня будзьма забываць і пра тое, што функцыянаваньне сучаснае дзяржавы вымагае ня толькі адпаведнае інтэлектуальнае і кадравае базы (бо ў пэўных цьвёрдых інстытуцыйных рамках нават былыя гітлераўскія пракуроры плённа будавалі заходненямецкую дэмакратыю), але і інфраструктуры ды эканомікі. З гэтым на ўсходзе Эўропы відавочныя праблемы, як і з эканамічным разьвіцьцём.

Хутка стварыць інфраструктуру і сучасную эканоміку сваімі сіламі ва ўмовах дэмакратыі немагчыма. Проста ніводная дэмакратыя ня можа ўзяць ды правесьці ў краіне інтэнсіўную кампанію па разбудове інфраструктуры ці эканомікі — таго, што немагчыма адразу «прадаць» і атрымаць грошы. Індустрыялізацыя атрымлівалася ў Сталіна, сеткі аўтабанаў разгортваў Гітлер, Мусаліні сушыў багны і будаваў на пустым месцы гарады за лічаныя месяцы! Дэмакратыі, за выняткам выпадкаў вонкавага ўмяшаньня ці шчодрае падтрымкі (як то Ізраілю Захадам), такога зрабіць не давалі рады, ім на тое патрабаваліся многія дзесяцігодзьдзі.

Ня ёсьць выняткам з гэтага правіла і цэнтральнаэўрапейскія дзяржавы, што ўжо амаль усе ўвайшлі ў ЭС. За захаваньнем там пэўнай падставовай мадэлі дэмакратыі цяпер сочыць ЭС, які ня толькі забясьпечвае пэўную агульную палітыку гэтых краінаў, так бы мовіць, у інтэлектуальным сэнсе, але й бярэцца за перабудову тамтэйшай інфраструктуры і прамысловасьці, выдаткоўваючы на тое вялікія грошы. Часу гэту зойме нямала, калі згадаць, што нават Нямеччына дагэтуль ніяк ня скончыць перабудову інфраструктуры і эканомікі не такой ужо і адсталай, паводле нашых мерак, усходняй часткі краіны.

Бачыць у гэткай сытуацыі, калі ЭС «парадкуе» Ўсход кантынэнту, нешта абсалютна станоўчае ці адмоўнае — ня варта. Такая раскладка сілаў і такая роля Саюзу існуе аб'ектыўна, калі гаворка для сярэднеэўрапейцаў ідзе пра пабудову лібэральна-дэмакратычнай дзяржавы. Пабудаваць яе самастойна можна, але на тое пойдуць доўгія дзесяцігодзьдзі, пакуль будзе напрацаваная адпаведная база для яе ўвасабленьня. Пры ўмове, што яна сапраўды будзе напрацаваная, бо разьвіцьцё чалавецтва не было перадвызначаным у напрамку камунізму, і ня ёсьць перадвызначаным у напрамку дэмакратыі. Чалавецтва можа зноў павярнуць і да тыраніі, і да таталітарызму.

Складаныя фундамэнтальныя чыньнікі цяжка паддаюцца сьвядомым уплывам, і ва ўсякім разе вымагаюць вялікае сілы ад ахвотнага на іх паўзьдзейнічаць. Па вайне такую сілу меў СССР, які гвалтам перарабляў сярэднеэўрапейцаў на свой капыл. Сёньня ЭС, у адрозьненьне ад Сталіна, нікога не вядзе прымусам, кожны выбірае — ці пакласьціся на дапамогу Брусэлю, спрабуючы пераадолець часам не зусім прыемную спадчыну мінулага ці пайсьці старой савецкай дарогай усьлед за Масквой, ці проста нічога не рабіць, задаволіўшыся той самай сьлівовіцай і апраўдваючыся гутаркамі пра самастойны шлях.

На жаль, у адрозьненьне ад заможных Нарвэгіі ці Швайцарыі на Захадзе, ні балканскія краіны, ні Беларусь не даюць пакуль падставаў гаварыць пра магчымасьць такога трэцяга шляху ва ўмовах усходу Эўропы.

# Дзе Ірына Кужэльная?

Трагедыя беларускай вёскі праз драму адной дзяўчынкі зь вёскі Сёмкава Лагойскага раёну.

Ірына Кужэльная зьнікла 23 лістапада. Сямігадовая дзяўчынка пасьля ўрокаў, каля 13.30, выйшла са школы, але дахаты так і не прыйшла. Адлегласьць ад школы, што ў вёсцы Бяларучы, да дому ў вёсцы Алекшыцы — кілямэтры два. Маці надта не перажывала: «Яна доўга магла хадзіць пасьля ўрокаў — паўтары, дзьве гадзіны». Але Ірына не зьявілася і на наступны дзень. Вось ужо пятыя суткі ідуць пошукі. Міліцыянтам і вайскоўцам дапамагаюць мясцовыя жыхары, лесьнікі і паляўнічыя, школьнікі. Вадалазы безвынікова абсьледавалі дно возера ў Бяларучах. Задзейнічаная авіяцыя «Калі яна заблукала ў лесе — шанцаў, на жаль, ніякіх», — камэнтуе міліцыянт з пошукавай групы.

Бяларучы — вялікая і слаўная ў гісторыі вёска: у гэтай самай школе вучыўся Янка Купала. Сям'я Кужэльных тут нядаўна. «Яны за два месяцы двойчы пераехалі, а самі яны з Астрашыцкага Гарадку», — кажа аднавясковец. І дадае: «Нешчасьлівая сям'я».

Як распавялі карэспандэнту «НН» у пошукавым штабе, вэрсіі зьнікненьня школьніцы застаюцца ранейшымі — магчымасьць зьдзяйсьненьня ў дачыненьні да дзіцяці злачынства, дарожна-транспартнае здарэньне. Яшчэ адна верагодная вэрсія — Ірына магла проста заблукаць, бо сям'я пераехала ў Алекшыцы нядаўна.

Не выключаецца магчымасьць таго, што дзяўчынка сышла з дому: ёсьць сьведчаньні, што Ірына некалькі разоў казала пра гэта. Для гэтага ў яе былі нагоды, цьвердзіць міліцыянт: атмасфэра ў сям'і досыць напружаная.

Роднага бацькі ў Ірыны няма: ён чатыры гады як павесіўся. Са словаў міліцыянтаў, маці Ірыны часьцяком мяняла грамадзянскіх мужоў. Маці пайшла працаваць нядаўна, дагэтуль «сядзела ў мужыка на шыі». Цяперашні айчым працуе на рыбагаспадарцы, якраз калі зьнікла дзяўчынка, ён быў у камандзіроўцы. Ён, нібыта, расказваў аднавяскоўцам, што бачыў, як час ад часу маці біла і «жартам» прыдушвала дачку. І напярэдадні зьнікненьня ў сям'і адбыўся скандал. Як толькі айчым прыехаў, яго забралі ў міліцыю, але хутка выпусьцілі — жалезнае алібі. «Мо яна сама дачку задушыла, а на яго хоча зьвярнуць», кажа выпадковы суразмоўца-аднавясковец. Маці дапытваюць кожны дзень. Яна то рагоча, то плача падчас размоваў з дазнаўцам.

Яшчэ ўдалося высьветліць, што ў той самы дзень людзі бачылі Ірыну побач зь невядомым мужчынам — менавіта «побач», а ня «разам»: яны проста ішлі ў адным кірунку. Аднак і гэта вэрсія адпрацоўваецца міліцыяй.

Інфармацыя пра зьніклую перададзеная ва ўсе падразьдзяленьні міліцыі, на чыгунку. Дзяўчынка аб'яўленая ў рэспубліканскі вышук, па факце яе зьнікненьня пачатая крымінальная справа.

На выгляд Ірына мае сем–восем гадоў, рост 130 —135 см, хударлявага целаскладу, валасы сьветлыя. Была апранутая ў чорную шубу, чорную вязаную шапачку з аранжавым адваротам, сінія нагавіцы, фіялетавыя боты. Супрацоўнікі праваахоўных органаў просяць зьвязацца зь дзяжурным пошукавага штабу ўсіх, хто з 13-й па 15-ю гадзіну 23 лістапада знаходзіўся на маршруце, якім магла кіравацца са школы зьніклая дзяўчынка. Т. 229-05-90.

**Яраслаў Сьцешык, Сямён Печанко**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**150 міліцыянтаў і салдатаў прачэсвалі лясы вакол Бяларучаў.**

# Дзякуй

**Валеру П.** з Баранавіцкага раёну.
**Івану Ц.** з Зэльвенскага раёну.
**Аляксандру А., Андрэю Ч.** з Рагачоўскага раёну.
**Сьвятлане К.** зь Лідзкага раёну.
**Уладзіславу І.** зь Віцебску.
**Сяргею Р.** з Горадні.
**Алегу Дз.** з Магілёва.
**В.Ж.** з Барысава.
**Зьмітру К.** з Мастоўскага раёну.
**Аляксандру М.** зь Берасьця.
**Андрэю А.** зь Менскага раёну.
**Аляксандру Н., Т.Ш., А.Л., В.Г., Зьмітру Х., Ільлю А., І.М., Вячаславу Б., Натальлі Д., Крысьціне Л., А.С.** зь Менску.


з ь б я р ы «Кнігарню «Наша Ніва»




**Пётр Краўчанка.** Беларусь на ростанях: Нататкі дыпламата і палітыка




**Вясна народу:** Эсэістыка 1991—2007


ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП “Суродзічы”, УНП 190 786 828
МГД ААТ “Белінвестбанк”, вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3012 206 280 014** Асабовы рахунак: ______

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

ПВУП “Суродзічы”, УНП 190 786 828
МГД ААТ “Белінвестбанк”, вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3012 206 280 014** Асабовы рахунак: ______

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перабказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езду.**

Па пытаньнях атрыманьня газэты пытайцеся Рамана.

# Музыкі расставілі

У пятніцу 23 лістапада Беларуская асацыяцыя журналістаў арганізавала прэс-канфэрэнцыю з музыкамі, якія два дні да гэтага сустракаліся з галоўным ідэолягам краіны **Алегам Праляскоўскім**. Сустрэча з журналістамі задумвалася дзеля таго, каб канчаткова расставіць кропкі над «і» ў гэтым пытаньні.

Лявон Вольскі («NRM»), Піт Паўлаў, Ігар Варашкевіч («Крама»), Аляксандар Кульлінковіч («Нэйра Дзюбэль») і Алег Хаменка («Палац») зьявіліся перад журналістамі ў досыць добрым настроі. Шмат жартавалі і сьмяяліся.

Лідэр «Палацу» Алег Хаменка адразу адзначыў, што іхная сустрэча з Праляскоўскім — гэта не падзея.

«Падзея — тая рэакцыя, якая зьявілася пасьля сустрэчы. Тое, што пішуць на розных сайтах і форумах. Нас проста залічылі ў здраднікі. Мы даўно хацелі падобнай канструктыўнай размовы і цяпер адчулі, што яна магчымая», — сказаў А.Хаменка.

«Мне пляваць, што сёньня пра нас пішуць. Мы засталіся тымі, хто ёсьць. Нічога не зьмянілася», — адзначыў І.Варашкевіч.

Піт Паўлаў коротка расказаў, як адбывалася размова з ідэолягам:

«Сустрэча доўжылася прыкладна паўгадзіны. Праляскоўскі пачаў гаворку досыць прыязна, нават папрасіў прабачэньня за тое, што з гуртамі склалася такая сытуацыя. Ён выказаў поўную гатоўнасьць да дыялёгу. Паводле словаў чыноўніка, сустрэча праходзіла з асабістай ініцыятывы Лукашэнкі. Кожны з нас атрымаў слова, дзе мы выказвалі свае крыўды за апошнія тры гады. Музыкі гаварылі па-беларуску, чыноўнік таксама час ад часу ўжываў некаторыя беларускія словы. Мы ад пачатку ставіліся да гэтай сустрэчы досыць скептычна, бо ня верылі, што яна можа скончыцца нечым добрым. Праляскоўскі прапанаваў нам рыхтаваць перадачу для БТ, а таксама арганізаваць канцэрт «Рок за Беларусь». Мы, натуральна, адмовіліся ад апошняга, але можна зладзіць канцэрт пад назвай «Рок для Беларусі». Ня трэба крыўдзіцца на словы Кульлінковіча, што Праляскоўскі адэкватны чалавек — гэта сапраўды так. Падчас размовы асабіста я ўжываў такія выразы, як «крывавы рэжым» і



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Музыкі так і не сышліся ў адзіным меркаваньні, ці была прамоўленая Праляскоўскім фраза, што забарона на канцэрты зьнятая.**

# кропкі над «і»

ніхто не спрабаваў мне заткнуць рот. Здалося, што яны паважаюць нашу пазыцыю. Толькі ў самым канцы размовы Праляскоўскі ў рэкамэндацыйнай форме параіў нам ня граць на канцэртах апазыцыі. Але ніякіх пагадненьняў зь ім мы не заключалі», — сказаў Паўлаў.

Кульлінковіч паведаміў, што пра палітыку размова не вялася ўвогуле, калі не лічыць фразы «Хлопцы, ня лезьце ў палітыку, займайцеся музыкай».

«Незалежна ад выніку сустрэчы нас абвінавачваюць у нейкім крымінале. Але забываюцца, што мы тры гады не маглі нідзе нармальна даць канцэрт. Што даводзілася выступаць на няякасных пляцоўках, пасьля чаго ўсе казалі пра кепскі гук, пра тое, што канцэрт быў дрэнны. Так не магло працягвацца вечна», — лічыць Л.Вольскі.

Алег Хаменка расказаў, што на сустрэчы абмяркоўваўся лёс таксама маладзейшых гуртоў, якія таксама сутыкаюцца з праблемамі выступаў. Вялася гаворка і пра лёс фэстываляў «Рок-кола» і «Басовішча», якім дзяржава не аказвае ніякай падтрымкі.

«Мы гаварылі пра праблемы ва ўсім беларускім мастацтве, ня толькі ў музыцы, — у літаратуры, жывапісе, харэаграфіі. Нельга ўсё зводзіць толькі да нашых рок-гуртоў. Мы не палітыкі, мы — творцы, таму і надалей мы будзем займацца толькі культурнай палітыкай», — мяркуе А.Хаменка.

На пытаньне, ці будзе мяняцца рэпэртуар гуртоў пасьля гэтых падзеяў, Л.Вольскі адказаў у жартаўлівай форме:

«Уявіце, што «NRM» выконвае песьню «Маё пакаленьне» разам з Анатолем Ярмоленкам, а «Нас да халеры» — з хорам БРСМ».

Адносна таго, дзеля чаго ўладам была патрэбная гэтая сустрэча выказаўся Піт Паўлаў:

«Фінансавая і эканамічная каньюнктура дыктуе такія крокі. Улады гатовыя пайсьці на нейкія саступкі Эўропе, хай хоць зноў дазволіўшы «NRM» і «Краму». Мы разумеем, што нас запрасілі, каб выкарыстаць, але мы не пасунуліся ні на сантымэтар. Мы засталіся на ранейшых пазыцыях».

Пры канцы прэс-канфэрэнцыі музыкі так і не сышліся ў адзіным меркаваньні, ці была прамоўленая Алегам Праляскоўскім фраза, што забарона на канцэрты зьнятая. Нехта казаў, што чуў яе, іншыя — што не. Аднак ідэоляг даў нумар тэлефону сваёй прыёмнай Піту Паўлаву і сказаў тэлефанаваць яму, адразу як у музыкаў узьнікнуць праблемы.

**Зьміцер Панкавец**

# Лявон Вольскі: «Ніхто з тых музыкаў на гандаль ня пойдзе»

«Калі меркаваць па некаторых камэнтарах у інтэрнэце, то можна падумаць, што здарылася нейкая трагедыя! — гаворыць лідэр «NRM» пра візыт рок-музыкаў да шэф-ідэоляга Праляскоўскага. — Насамрэч нічога незвычайнага не адбылося. І такая бурлівая рэакцыя проста паказвае, што ў нас наагул нічога не адбываецца, што ў нас бракуе падзеяў. Ну, што за падзея: некалькі музыкаў схадзілі да чыноўніка, хай сабе і досыць высокага рангу. Мне дык было проста цікава схадзіць у Адміністрацыю прэзыдэнта. Я там ніколі ня быў і, можа, ніколі, больш не пабываю. Цікава было паглядзець, што там і як. Думаў, пасяджу, памаўчу. Памаўчаць не ўдалося».

**«Наша Ніва»: Гэта была нечаканая сустрэча ці яна рыхтавалася?**

**Лявон Вольскі:** Размовы пра сустрэчу вяліся даўно, яна адкладалася, пераносілася. Нарэшце нам патэлефанавалі, у вельмі карэктнай форме прапанавалі прыйсьці ў пэўны час. Так што сустрэча адбылася з ініцыятывы музыкаў.

**«НН»: Пра што ішла гаворка?**

**ЛВ:** Музыкі наперабой выказвалі свае крыўды, якія назапасіліся. Спадар Праляскоўскі нас уважліва выслухаў. З свайго досьведу кантактаў з чыноўнікамі ведаю, што сярод іх ёсьць абсалютна неадэкватныя, непрабівальныя для лёгікі людзі. Гэты чалавек не такі, ён адэкватны: можа, гэта і дрэнна.

**«НН»: Вы маеце на ўвазе, што лепш бы ён ня быў такім разумным?**

**ЛВ:** Гэтага я не камэнтую.

**«НН»: Вам нешта прапаноўвалі?**

**ЛВ:** Быў дыялёг, з боку музыкаў досыць эмацыйны. Хаменка трымаў вялікую прамову, мусіць, загадзя падрыхтаваную. Ён жа найбольш пацярпеў: працаваў у дзяржаўнай установе і страціў працу. Ніхто нічога нікому не абяцаў, ні з аднаго боку, ні з другога. Была парада, якую мы выслухалі. Не было ніякага гандлю. Гандаль — гэта непрымальна для творцы, і ніхто з тых музыкаў, што бралі ўдзел у сустрэчы, на гандаль ня пойдзе.

Самае галоўнае, прагучала, што забароны на канцэрты — гэта дзіка, і такога не павінна быць і ня будзе. Калі сапраўды так, то магчымасьць вольна даваць канцэрты на працягу году, двух — для нас сапраўдны прарыў. А тое, што нас не пускалі на тэле- і радыёканалы — гэта, калі шчыра, ня вельмі мяне і абыходзіла. Гэта справа саміх каналаў. Мяне, скажам, узровень Беларускага тэлебачаньня не задавальняе, і тут трэба яшчэ добра падумаць, ці варта пагаджацца, каб твая песьня гучала побач зь нейкай адыёзнай перадачай. Гэта можа дрэнна адбіцца на рэпутацыі.

**Працяг на старонцы 28.**

# Лявон Вольскі: «Ніхто з тых музыкаў на гандаль ня пойдзе»

**Працяг са старонкі 27.**

**«НН»: Але гэта дало б магчымасьць дайсьці да большай колькасьці слухачоў, а высновы наконт якасьці той ці іншай перадачы яны і так робяць. Дык паводле вынікаў размовы можна сказаць, што хутка вашыя галасы будуць гучаць па радыё і тэлебачаньні?**

**ЛВ:** Гаварыць пра гэта рана.

**«НН»: Ці заходзіла гаворка пра Ваш удзел у перадачах «Белсату»?**

**ЛВ:** Не, ні словам, хаця, шчыра кажучы, я чакаў гэтага. Але ў гэтым выпадку размова стала б вельмі цяжкай, і для мяне прыкмета адэкватнасьці якраз у тым, што гэтай тэмы не закраналі. Ня ведаю, як яны будуць рэагаваць на наш удзел у «Белсаце», думаю, што ніяк.

**«НН»: У Вас склалася ўражаньне, што нешта мяняецца ў стаўленьні дзяржавы да альтэрнатыўнай музыкі?**

**ЛВ:** Магчыма, паглядзім.

**«НН»: Вам падалося, што гэта вынік нейкай зьмены ў агульнай сытуацыі?**

**ЛВ:** Мне цяжка меркаваць, я не экспэрт.

**«НН»: Значыць, Вы будзеце працягваць сьпяваць свае непадцэнзурныя песьні, рабіць тое, што рабілі?**

**ЛВ:** Слухайце, я ўжо сталы, складзены чалавек, які займаецца сваёй справай ня першы год і нават ня першае дзесяцігодзьдзе. Сьмешна было б, калі б я раптам адмяніўся і перакінуўся на нешта іншае. Зь цягам часу чалавек мяняецца, але не ад таго, што ідзе на прыём да Праляскоўскага.

**«НН»: Не крыўдуйце! Проста агучваю пытаньне, якое задаюць Вашыя слухачы, якія Вас вельмі любяць... Ну, а як яно там, усярэдзіне Адміністрацыі прэзыдэнта?**

**ЛВ:** Падобна, як заходзіш у амбасаду. Мэталашукач на ўваходзе... А ўсярэдзіне — бы ў нейкім выканкаме. Дывановыя дарожкі, кветкі ў вазонах.

**«НН»: Што ў бліжэйшых плянах?**

**ЛВ:** Вялікіх канцэртаў на Радзіме бліжэйшым часам не плянуецца. А 10 сьнежня «N.R.M.» выступіць у Варшаве.

**Гутарыла Наталка Бабіна**

## АПЫТАНЬНЕ НА NN.BY

**Ці дазволяць лукашэнкаўцы канцэрты «NRM»?**

| | |
|---|---|
| так | 37 (17.0%) |
| не | 36 (16.5%) |
| дазволяць раз на два гады і будуць гэтым хваліцца | 145 (66.5%) |

Усяго прагаласавала: 218

# Кульлінковіч: За гэтыя два дні на нас вылілі багата г…а

Вечарам у чацьвер лідэр гурту «Neuro Dubel» Аляксандар Кульлінковіч сустрэўся ва ўправе Партыі БНФ са сваімі фанамі. Гаворка ў асноўным ішла пра сустрэчу музыкаў з галоўным ідэолягам краіны Алегам Праляскоўскім. Кульлінковічу давялося выслухаць нямала крытыкі ў свой бок.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

«За гэтыя два дні на нас вылілі вядро г…а, прычым рабілі гэта людзі, якія яшчэ ўчора нібыта зьяўляліся нашымі адданымі фанатамі. Я і сёньня скажу, што Праляскоўскі цалкам адэкватны чалавек, а ня нейкі там чорт з рагамі. Няхай на мяне і крыўдзяцца за гэтыя словы. Мы перамаглі, бо дыялёг прапанавалі менавіта ўлады, а ня мы прыпаўзьлі да іх на каленях. Сустрэча адбывалася з асабістай ініцыятывы Лукашэнкі. Мы адразу сказалі, што нічога пад іхным сьцягам рабіць ня будзем, бо наш сьцяг — бел-чырвона-белы. Перад сустрэчай я стаяў каля ўваходу ў сядзібу пад бел-чырвона-белым сьцягам і адчуваў рэальны гонар за краіну. І нават той факт, што я сёньня прыйшоў да вас сьведчыць, што мы нікому не прадаліся», — сказаў А.Кульлінковіч.

Лідэр «Neuro Dubel» таксама паведаміў, што заўтра мае намер ізноў патэлефанаваць Алегу Праляскоўскаму.

«Я выступлю з ініцыятывай канцэртаў «Цукеркі і дзеці». Мы іх ужо праводзілі гады тры назад, грошы з выступаў ішлі на падарункі дзецям зь дзіцячых дамоў. Цяпер я хачу арганізаваць нешта падобнае. Лявон [Вольскі] таксама даў сваю згоду на такія выступы. Мне балюча і крыўдна, што мяне назвалі здраднікам фактычна на пустым месцы. Нас не атрымаецца скарыстаць, бо мы вялікія і разумныя хлопчыкі».

**ЗП**

### Дырэктар «Рок-кола»: «Я вымушаны звольніцца з працы»

Мэр Полацку Ўладзімер Тачыла пастанавіў, што правядзеньне фэсту «Рок-кола» ў горадзе больш немэтазгодна. Стваральнік і дырэктар «Рок-кола» Сяргей Анішчанка: «Цяпер у родным горадзе я ізгой».

Гарадзкое начальства Полацку на адной з сваіх нарадаў паслухала начальніка полацкай міліцыі Мікалая Асушчэнку і пастанавіла: «Рэкамэндаваць адказным асобам, што адказваюць за духоўнае выхаваньне моладзі ўстрымацца ад правядзеньня падобных мерапрыемстваў» (як фэст «Рок-кола»). У дырэкцыі фэстывалю кажуць: «Самае цікавае, што няма прычыны зь якой прычыны забаранілі наш фэстываль».

Са словаў прадусара «Рок-кола» Аляксандра Рагачова, «абстаноўка ў горадзе падчас правядзеньня апошняга фэсту была болей чым спакойная» — алькаголю ў Палацы культуры, дзе праходзілі канцэрты, не прадавалася, ніякіх боек не было, у выцьвярэзьніку ня трапіў ніхто з рокераў. Адзінае, што на адным з будынкаў гораду зьявіўся бел-чырвона-белы сьцяг. «Пэўна, што трэба было гэта на кагосьці павесіць», — мяркуюць у дырэкцыі «Рок-кола». Цікава, што надпісы «Жыве Беларусь!» у Полацку зьявіліся і 7 лістапада, калі фэстываль даўно прайшоў.

У сувязі з гэтымі падзеямі заснавальнік і дырэктар «Рок-кола» Сяргей Анішчанка мяркуе звольніцца з пасады рэжысэра палаца культуры «Полацак-Шкловалакно». «Я аказаўся ізгоем, мне зьнізілі заробак і я тут больш не зараблю ні фэстывалю, ні нават проста канцэрту «Крамы». Буду зарабляць іншым, лепш у мастакі пайду», — кажа ён.

**Сяргей Будкін**

# Віталь Супрановіч: «Ніколі не кажыце ніколі»

Шэф лэйблу «БМА–груп», арганізатар рок–канцэртаў **Віталь Супрановіч** выклаў на просьбу «Тузіну Гітоў» свае думкі што да сустрэчы музыкаў у Адміністрацыі прэзыдэнта.




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Мне звоняць людзі і пытаюцца што адбываецца… Нехта выкідвае дыскі, нехта кажа, што ніколі ня пойдзе на канцэрты… Ніколі не кажыце ніколі, кажуць мудрыя.

Пазыцыя ўладаў не зьмянілася. Яны па-ранейшаму ня могуць згадзіцца з тым, што ў грамадзтве можа існаваць паралельная ідэалёгія, што людзі могуць разважаць, думаць, памыляцца, кахаць, любіць, ненавідзець… Адным словам проста СВАБОДНА жыць. Жыць для Беларусі, як калісьці проста жыла для Беларусі Ларыса Геніюш.

Выступайце, але не займайцеся палітыкай… Палітыка, аказваецца, у нас таксама ёсьць правільная і няправільная. Дарафеева і кампанія, агітуючы за пэўнага кандыдата, атрымліваецца, не займаюцца палітыкай? Мо і іх варта забараніць? А рок-музыкі на канцэрце «Песьні свабоды» ўжо займаюцца. Мы ня ведаем, як адбывалася гэтая сустрэча, хто што каму абяцаў ці не абяцаў. Але што значыць палітыка для ўладаў? Немагчыма ў нашай краіне быць нэўтральным. Таму калі ты ня там і ня там, ты усё роўна супраць іх. І ты ня маеш права на сваю думку! Палітыка для ўлады гэта і «Басовішча», і канал «Белсат», і нават, як бачым, «Рок-кола». Пайсьці на гэтую сустрэчу для ўладаў таксама пэўны крок. Але мы ня ведаем, што стаяла за гэтым крокам.

Другое гэта музыкі. Якія тры гады як у рэзэрвацыі жывуць. Музыка мусіць мець сувязь са сваім слухачом. Калі няма канцэртаў і ратацыі на ФМ-станцыях, то нахера тады пісаць новыя песьні, шукаць грошы на запіс і гэтак далей? Я іх разумею…

Пакуль нічога ні добрага ні дрэннага не адбылося.

Адзінае ясна, што ні заўтра, ні праз месяц «N.R.M.» не загучыць на дзяржаўным радыё і ня дасьць канцэрту ў Палацы спорту.

Музыкам далі час. Час выбіраць. Калі ўлады ўбачаць, што яны прыслухаліся, то, магчыма, будзе палёгка. Калі ж не, то ўжо другой сустрэчы ня будзе. Ясна дадзена зразумець: ці вы з намі, ці супраць нас. Нэўтралку ці дурня ня ўключыш. І мне цяжка паверыць, што Вольскі адмовіцца ад удзелу ў праекце да 90-х угодкаў БНР, Варашкевіч ня дасьць кампазыцыю на «Песьні свабоды», Кульлінковіч не сустрэнецца з фанатамі на Ўправе БНФ, Хаменка ня выступіць, як некалі, на фоне бел-чырвона-белага на канцэрце беларускай дыяспары ў Расеі… Бо гэта пакуль яшчэ для ўладаў палітыка! Палітыка варожая.

Трэба час, каб улады зразумелі, што у грамадзтве жывуць людзі з рознымі думкамі, якія слухаюць розную музыку, але разам з гэтым гэта ня ворагі, а яны ўсе жыхары АДНОЙ краіны і маюць на гэта права. Гэтая сустрэча — паўкроку да гэтага разуменьня. ЯНЫ мусяць успрыняць НАС сваімі жыхарамі, а МЫ — што яны НАШАЯ ўлада. Цяжка. Ведаю… Законная—незаконная, добрая—дрэнная, правільная—няправільная, але рэальная ўлада. Кажу не пра пэрсаналіі, а пра саму фактуру.

Мы б з радасьцю правялі наступны фэст «Права быць свабодным» у Беларусі, дзе былі б і чырвона-зялёныя і бел-чырвона-белыя, дзе б выступілі і дазволеныя і забароненыя. А сярод слухачоў былі б амніставаныя палітвязьні, адміністрацыя ў поўным складзе… КДБ б не забірала сьцягі, а разам зь міліцыяй ганяла п’яных і забірала фашыстоўскую сымболіку…

І гэта б быў першы крок да прымірэньня, бо ад супрацьстаяньня стаміліся ўсе. Найбольш музыкі. Таму бяз панікі. Усё будзе добра, як сьпявае Сьвета Сугака! Хочацца верыць што ўсе людзі мяняюцца і што калісьці ўсё стане на свае месцы.

# Як прадавацца Праляскоўскаму

Прыкалоў пачын Праляскоўскага, які паабяцаў «N.R.M.» поўную легалізацыю, у тым ліку трансьляцыю па БТ, папрасіўшы ўзамен адну дробязь — «трымацца далей ад апазыцыйных зборышчаў». Уявіў як будзе выглядаць сетка праграмаў БТ, калі б ўлады маглі купіць усіх культавых фігур апазыцыйнай субкультуры.

**29 лістапада**

Праграма Першага нацыянальнага (БТ)

**6.00.** Гімн РБ.

**6.10.** Навіны

**6.45.** Слова пастара зь лесу. Пропаведзь і малітва за Беларусь Паўла Севярынца, які трымаецца пры гэтым далёка ад апазыцыйных зборышчаў.

**7.15.** Паўтор запісу Рок-канцэрту на плошчы Бангалор 18.03.2006 г., удзельнікі якога трымаюцца далёка ад апазыцыйных зборышчаў.

**8.00.** Праграма для падлеткаў. Маладыя апазыцыянэры распавядаюць, як насіць значкі «За Свабоду» і трымацца пры гэтым далёка ад апазыцыйных зборышчаў.

**9.00.** Час паэзіі. Славамір Адамовіч чытае верш «Забі прэзыдэнта», трымаючыся пры гэтым далёка ад апазыцыйных зборышчаў.

**10.00.** «Гаспадарка і мы». Яраслаў Раманчук чытае лекцыю пра тое, як прыватызаваць менскі аўтобусны маршрут №100, трымаючыся пры гэтым далёка ад апазыцыйных зборышчаў.

**12.00.** Дакумэнтальны фільм «Звычайны прэзыдэнт» рэжысэра Хашчавацкага, які трымаецца далёка ад апазыцыйных зборышчаў.

**16.00.** «Гісторыя». Анатоль Сідарэвіч распавядае пра барацьбу БНР супраць бальшавікоў, трымаючыся пры гэтым далёка ад апазыцыйных зборышчаў.

**18.00.** Экстрым-шоў. Мірон вешае бел-чырвона-белы сьцяг на трубу віцебскага малаказаводу, трымаючыся пры гэтым далёка ад апазыцыйных зборышчаў.

**19.00.** Фільм «Гуд бай, бацька» — групы «Навінкі», сябры якой трымаюцца далёка ад апазыцыйных зборышчаў.

**21.00.** Навіны.

**21.30.** Постскрыптум. Аўтарская праграма Зянона Пазьняка «Факс з Варшавы», вядоўца якой трымаецца далёка ад апазыцыйных зборышчаў.

**22.00.** Шоў «Выбар». Кандыдаты на пост старшыні БНФ спрачаюцца паміж сабою, трымаючыся пры гэтым далёка ад апазыцыйных зборышчаў.

**23.45.** Навіны.

**24.00.** Гімн РБ.

**Лёлік Ушкін**




PHOTO.BYMEDIA.NET

# Люфт-мэнч Вольф Рубінчык

У дзень, калі я выправілася на сустрэчу з Вольфам Рубінчыкам, пайшоў першы сьнег. А мо, і апошні — мы ж жывем у эпоху глябальнага пацяпленьня. Досыць даўно першы сьнег стаў выпадаць у лістападзе, і я асабіста выявіла для сябе прыкмету: чым раней ў лістападзе выпадае сьнег, тым цяплейшая потым зіма. Сьнег ішоў, і ціхія двары рэстаўраваных пяціпавярховікаў на вуліцы Матусевіча выглядалі чыста і сьвежа. Гэты раён абжыты і надыханы: ён ужо на мяжы таго, каб укараніцца ў гісторыю. Тут ужо вырасла пакаленьне, вось і рэстаўрацыю дамоў ужо пасьпелі зрабіць. Адшукваючы патрэбны дом, я раздумвала, якое пытаньне задаць першым. Што я ведаю пра гэтага Рубінчыка: палітоляг, шахматыст... А я ж і ў палітыцы не кумекаю, і ў шахматах дакладна ведаю толькі ход е2—е4 (і то дзякуючы Астапу Ібрагімавічу Бэндэру)... Што яшчэ: беларускамоўны яўрэй, выдае бюлетэнь «Мы яшчэ тут!». З пытаньня пра беларускасьць і яўрэйства і пачалася размова.

Спадар Вольф гаворыць ціха, разважліва, нясьпешна.

## «Да беларускасьці прыйшоў у ЭГУ»

— Вы пытаецеся, як прыйшоў да беларускасьці. Беларускасьць гэта, па-Вашаму, што?

— Найперш тое, што Вы карыстаецеся беларускай у жыцьці і ў вашым бюлетэні, цікавіцеся беларускай гісторыяй і літаратурай.

— А, ясна. Бачыце ўва мне нейкую «экзатычную птушку» (гэтак пісаў Віталь Зайка ў 2000 г. пра яўрэйскую культуру ў Беларусі). Насамрэч гэта нармальна: быць яўрэем і гаварыць па-беларуску. Што я яўрэй, я ведаў заўсёды... А наконт беларускасьці, якая, па-мойму, ня зводзіцца да мовы, гісторыі, літаратуры... У сям'і маёй размаўлялі звычайна па-расейску. Але куплялі беларускія кніжкі, слухалі беларускія перадачы па радыё і тэлебачаньні. Калі вучыўся ў Эўрапейскім гуманітарным унівэрсытэце, там быў беларускі асяродак. Алесь Лагвінец упарта і паўсюль размаўляў па-беларуску, і ня толькі ён, была цэлая плынь беларушчыны. Хаця ЭГУ быў пераважна расейскамоўны. Але там талерантна ставіліся да тэзісу, што трэба размаўляць пабеларуску. І вось у канцы навучаньня мяне пацягнула да беларускасьці, і цяпер я пішу пераважна па-беларуску.

— А на ідыш, на іўрыце Вы можаце размаўляць і пісаць?

— Пісаць магу, з размовай — складаней. Мама мая не валодае гэтымі мовамі. Іўрыт я вывучаў у 16—17 гадоў на курсах Сахнуту, потым меў практыку ў Ізраілі. А ідыш — гэта ў большай ступені маё ўнутранае я, чым іўрыт. У бюлетэні даю нешта на ідышы, нават свае крыжаванкі, але не такі ўжо я вялікі ідышыст. Словаў 500 цьвёрда ведаю.

## Чаму выдаецца «Мы яшчэ тут!»

— А як Вы вырашылі выдаваць гэты бюлетэнь?

— Нейкі час я быў бібліятэкарам ў менскім аб'яднаньні яўрэйскай культуры імя Ізі Харыка. Загадвала бібліятэкай Дзіна Харык — удава Ізі Харыка, паэта, расстралянага ў 1937 годзе. У 2001 годзе аб'яднаньне было выселенае з Інтэрнацыянальнай, 6, дзе знаходзілася шмат гадоў. Мяне асабліва турбавала, што будзе зь бібліятэкай і яе загадчыцай. Спадарыню Дзіну гэтая праца трымала. Калі яе закрылі, яна адразу засумавала і неўзабаве памерла. Я тады быў упэўнены, што кіраўніцтва аб'яднаньня паводзілася не зусім карэктна і спрабаваў спрачацца, але ня быў пачуты. Можа, ня змог правільна гэтага зрабіць. Урэшце зразумеў, што трэба неяк даносіць да яўрэяў свае меркаваньні. Мне было што сказаць. Потым была яшчэ гісторыя з сынагогай на Дзімітрава, 3. Я тады зьбіраў подпісы за тое, каб захавалася бібліятэка, каб будынак на Дзімітрава быў перададзены адной зь яўрэйскіх суполак. Але гэта натыкалася на нейкі мур. Тады і зьявілася думка, што варта неяк разбудзіць народ. Таму што сытуацыя была супярэчлівая, шмат хто са службоўцаў быў за нас... Але будынак абараняла літаральна тры чалавекі. Каб нас было сто, то яго і ня зьнеслі б. Мне здалося, што варта мець самвыдатаўскую газэту. Назваў яе «Анахну кан» — «Мы тут». Яна выходзіла штомесяц у 2002 г., цяпер замест газэты выходзіць бюлетэнь з падобнай назвай накладам 150 экзэмпляраў. Як распаўсюджваю? На сходах, калі зьбіраюцца яўрэі. Вось каля Ямы на 9 траўня я звычайна стаю, там бывае шмат людзей, сярод іх нямала маіх добраахвотных памочнікаў. Частку накладу рассылаю па Беларусі, частку — за мяжу. Раблю бюлетэнь амаль цалкам за свае сродкі. Добра, што ёсьць такі Гена Пекер, кіраўнік ерусалімскай філіі беларускага зямляцтва ў Ізраілі. Ён разьмяшчае тэксты бюлетэню ў інтэрнэце.

— Вы адчуваеце запатрабаванасьць?

— Калі б не адчуваў, не рабіў бы.

— А ўкладзеныя сродкі вяртаюцца?

— Не. Бюлетэнь распаўсюджваецца бясплатна. Проста лічу, што мушу гэтым займацца, бо ў наяўных яўрэйскіх выданьнях выказацца мне праблематычна.

— Чаму? Іх цікавяць іншыя рэчы? Чым, па-Вашаму, жыве яўрэйская грамада ў Беларусі?

— Я наогул не лічу, што яўрэйская грамада ў Беларусі існуе. Так, дзейнічае шэраг суполак. Ёсьць «яўрэйскія лідэры», занадта залежныя ад таго, што ім скажуць ва ўладных структурах, ёсьць спажыўцы гуманітарнай дапамогі, ёсьць разрозьненыя энтузіясты, а ці ёсьць грамада як форма самаарганізацыі — гэта яшчэ пытаньне. Што да згаданых выданьняў — яны выходзяць па-расейску, не арыентуюцца ні на беларускую, ні на ідыш, ні нават на іўрыт.

— Многія беларусы падпісаліся б пад словамі Восіпа Мандэльштама «Мы жывем, пад сабою не адчуваючы краіны»... Вы таксама не адчуваеце пад сабою краіны?

— Алесь Марачкін пісаў: «Крычу ў пустэчу — цішыня. Ніхто ня чуе, як ні пніся»... На яўрэйскім фронце, на шахматным я раблю тое, што мне цікава. Можа, мяне чуе нямнога людзей, але раблю тое, што магу і мушу.

## Чалавек паветра

— Такім чынам, Вы робіце тое, што лічыце цікавым ды карысным. А як Вы стычваеце канцы з канцамі ў фінансах? Вы працуеце недзе, атрымліваеце заробак?

— Раблю пераклады на замову, балазе ведаю французскую, ангельскую (дзякуй школьным настаўнікам і выкладчыкам ЭГУ). Мала каму цяпер патрэбныя пераклады з ідышу, але калі-нікалі выпадае рабіць і іх. Складаю крыжаванкі для розных выданьняў.

— Досыць нестабільны заробак.

— Відаць, я па натуры «люфт-мэнч» — чалавек паветра.

— Які прыгожы вобраз!

— Гэта вобраз Шолам-Алейхема. Вы ня ведаеце? Вось, калі ласка, — зьнімае з

**Пра што піша «Мы яшчэ тут!»**

Што ж друкуецца ў бюлетэні «Мы яшчэ тут!»? Частку матэрыялаў рэдакцыя разьмяшчае на ідыш, частку — па-беларуску, нешта і па-расейску. Вялікае месца займаюць рубрыкі «Далоў белыя плямы!» ды «Памяць жывая» — успаміны пра знаных яўрэяў, якія маюць дачыненьне да Беларусі (напрыклад, пра кіраўніка менскага джаз-аркестру Эдзі Рознэра), кранальныя ўспаміны пажылых людзей пра Беларусь іх дзяцінства, урыўкі твораў ізраільскіх пісьменьнікаў у перакладзе на беларускую, гумар, нязьменныя шахматы і шашкі, крыжаванкі... З бюлетэню я даведалася пра «Жыдовішча» — аналяг «Басовішча», фэстываль яўрэйскай музыкі, што праводзіўся сёлета ля кавярні «Стары Менск».

150 экзэмпляраў — гэта не 550 тысячаў (ці колькі там?) «Советской Белоруссии» (паводле словаў А. Лукашэнкі, яе рэдактар — таксама яўрэй), але, з другога боку, «Мы яшчэ тут!» не выпісваюць пад прымусам, і палова тыражу ня сьпісваецца ў макулатуру, а што да колькасьці наведваньня ў інтэрнэце, то, упэўненая, у выпадку «Мы яшчэ тут!» яна будзе большай.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

паліцы том Шолам-Алейхема па-беларуску, — калі Вы хочаце больш ведаць, якія мы... Для мяне важна захаваць сябе як асобу, а зрабіць гэта, працуючы ў дзяржаўных установах, дзяржаўных газэтах ці часопісах цяпер амаль немагчыма. Там твая тоеснасьць пастаянна ставіцца пад пытаньне. Я стараюся захоўваць аўтаномнасьць. Напрыклад, ніколі не бяру грошай ад замежных арганізацыяў, адно што часам на выданьне бюлетэню ахвяруюць прыватныя асобы.

— А якое месца ў захаваньні сябе займае рэлігія? Вы рэлігійны чалавек?

— Ня дужа рэлігійны, але ведаю, што Бог ёсьць, і юдаізм адыгрывае пэўную ролю ў маім жыцьці. На Шабас не пляную ніякіх справаў, адпачываю. Сьвяткую і іншыя юдэйскія сьвяты. Лічу, што няма кнігі лепшай за Тору.

## «Янка Купала і яўрэі»

— Я натрапіла ў інтэрнэце на Ваш артыкул «Янка Купала і яўрэі», у якім Вы робіце выснову, што беларускі клясык ня быў свабодны ад антысэмітызму. Я з Вамі ня згодная. Па-мойму, ляйтматыў верша ў радках «Слава вам, усебеларускія жыды!» ды «Нявольнікі вы сёньня разам з намі на беларускай змучанай зямлі».

— Я напісаў артыкул гадоў дзесяць таму. Магчыма, цяпер я напісаў бы яго іначай. Але на той час мяне дзівіла, што беларускія дасьледчыкі замоўчвалі некаторыя радкі зь верша. Яшчэ зачапілі купалаўскія словы «Таго ж Хрыста прыбілі вы да крыжа…» і «жыды, паны ўсяго сьвету». Я і цяпер лічу, што на час напісаньня вершу (1919 г.) Купала быў пад уплывам пэўных стэрэатыпаў... А хіба клясыкі ня маюць права на памылку? Увогуле, не люблю штучных абагульненьняў і ня думаю, што Вам было б прыемна прачытаць у яўрэйскага клясыка што-небудзь кшталту: «Вы, беларусы, брудныя сяляне, аднак давайце пойдзем разам» і да т.п.

— Я зьвярнула ўвагу, у сваім артыкуле Вы пішаце, што слова «жыд» у беларускай мове не абразьлівае. Цалкам так, але тыя, хто ня бачыць розьніцы паміж расейскай і беларускай культурай (ці наогул ня бачыць беларускай культуры) абураюцца, калі выкарыстоўваецца слова «жыд». Беларускае тэлебачаньне некалькі гадоў таму ва ўласьцівай яму манеры нават зрабіла рэпартаж, дзе з таго, што «НН» напісала «З Новым годам, жыды!» рабілася выснова, што газэта фашысцкая.

— Я глядзеў той рэпартаж і тады адгукнуўся на форуме «НН». Мяне ня крыўдзіць выкарыстаньне «Нашай Нівай» (і Янкам Купалам, Зьмітраком Бядулем ды інш.) такога этноніму. Пакрыўдзіць можна і словам «яўрэй», сказаным ў адпаведным кантэксьце, як гэта нядаўна атрымалася ў аднаго небезьвядомага палітыка. Але ў сваім бюлетэні выкарыстоўваю часьцей слова «яўрэй», пакідаючы слова «жыд» толькі ў тэкстах гістарычнага характару.

## «На шахматныя тэмы»

— Нядаўна выйшла Ваша кніжка «На шахматныя тэмы». Раскажыце пра яе.

— Вызначаю яе як «ненавукова-папулярнае выданьне». Кніга па-беларуску, 200 асобнікаў. Сабраў матэрыялы, якія друкавала «Наша Ніва» у шахматнай рубрыцы на працягу двух з паловай гадоў, артыкулы і крыжаванкі зь бюлетэню для шахматных кампазытараў «Альбино» (выдаецца ў Лунінцы сіламі Вадзіма Жылка), сам зьвярстаў, выдаў… Прапаную шахматыстам новы варыянт у дэбюце Сакольскага (слынны беларускі майстар, якому ў 2008 г. споўнілася б 100 гадоў). Адзін з тэкстаў называецца «Шахматызацыя палітыкі» — пра Каспарава, Казуліна, Мілінкевіча... Я далёкі ад таго, кабнаўпрост зьвязваць уменьне гуляць у шахматы з посьпехамі на палітычным полі. Але вось Павал Севярынец пісаў мне, што ў Сітне гуляў у шахматы зь міліцыянтамі і перамагаў іх, гэта ж пра нешта гаворыць?

— А што для Вас шахматы?

— Ня спорт і не мастацтва. Гэта, зноў-такі, сродак самазахаваньня асобы. У майго добрага прыяцеля, мастака-рэстаўратара Аляксандра Астравуха — ідыш-беларускі слоўнік на 1000 старонак, у мяне — шахматы.

## «Шаную Крымінальны кодэкс!»

У вечнасьці інтэрнэту застаўся і выпадак, калі спадара Рубінчыка арыштавалі і пасадзілі на суткі за ўдзел у пікеце ў памяць забітых нямецкімі фашыстамі менскіх падпольшчыкаў.

— Раскажыце пра гэты выпадак падрабязней, — прашу я.

— Гэта было ў 2001-м, у 60-ю гадавіну пакараньня сьмерцю групы менскіх падпольшчыкаў, сярод якіх былі Кірыла Трус, Валодзя Шчарбацэвіч, Маша Брускіна. Мы зь сябрамі, сярод якіх былі хлопцы з «Маладога фронту», вырашылі нагадаць мянчанам пра гэта. Выйшлі з партрэтамі павешаных падпольшчыкаў, са сьвечкамі, да турмы на Валадарскага — адтуль пачаўся апошні шлях барацьбітоў. Пайшлі ў бок Кастрычніцкай вуліцы — там, ля дражджавога заводу, нацысты іх павесілі. Нехта нёс плякат «Не фашызму ў Беларусі». На нашым шляху праз колькі мэтраў стаў АМАП... Скончылася пятніца 26 кастрычніка ўжо на Акрэсьціна, дзе мы прабавілі «ўік-энд», потым нас павезьлі ў суд. Павал Севярынец атрымаў 10 начаў адміністрацыйнага арышту, іншыя (і я ў тым ліку) — тры ночы. Хочацца верыць, што ня марна мы тады сядзелі, што надоечы вуліцу ў Ерусаліме назвалі ў гонар Машы Брускінай не бяз нашага ўплыву. Аднак гэта быў ня першы і не апошні мой суд...

— Дык вы рэцыдывіст?

— Не, чаму? Рэцыдывіст — гэта чалавек, які паўторна парушае Крымінальны кодэкс, а я, усьлед за Вашым любімым Астапам Бэндэрам, крымінальны кодэкс шаную! Нават выкладаў яго ў рамках курсу «Асновы права» ў адной дзяржаўнай ВНУ. У судох у якасьці ўдзельніка працэсу давялося быць чатыры разы, двойчы паводле адміністрацыйных справаў (першы раз судзілі за пікет ля Менгарвыканкаму супраць зносу сынагогі на Дзімітрава ў верасьні 2001 г., але праваабаронца Валянцін Стэфановіч пераканаў судзьдзю абмежавацца «вуснай заўвагай»), двойчы паводле цывільных.

Тры месяцы я рэдагаваў часопіс «Шахматы». Заснавальнік, дзяржаўнае выдавецтва, звольніў мяне за няўзгодненае зь ім інтэрвію для «Народнай волі», і за тое, что ў часопісе выкарыстоўвалася «ня тая» лексыка. Паспрабаваў аднавіцца праз суд. Аляксандар Лукашанец, тады ён быў яшчэ в.а. дырэктара Інстытуту мовазнаўства, рабіў экспэртызу і пастанавіў, што словы *найвялікшы, пагатоў, тамака, гулец, унёсак, досьвед* — «няправільныя». Нават да *«выканкаму»* замест *«выканкому»* прыкляпаўся. Пры гэтым у тэксьце экспэртнага заключэньня меўся пасаж пра «*форзац абложкі*», а замест *«наконадні»* праф. Лукашанец рэкамэндаваў «*напярэдадні*». У мяне мова не была ідэальная, прапусьціў колькі карэктарскіх памылак, але чаго мае «сябры» дабіліся звальненьнем? Першы нумар часопісу (зь беларускай мовай як асноўнай) выйшаў накладам 700 асобнікаў, цяпер расейскамоўныя «Шахматы» выходзяць накладам 300...

### Чалавек сьнегу

Сьнег на іўрыце — шэлег, а шэлег на іўрыце — шэкель.

Астатак дню, блукаючы па людным кірмашы, чытаючы дома Шолам-Алейхема, я час ад часу пaглядала на мяцеліцу за вакном і думала: як цудоўна, што ў наш час грошай, уласнасьці і ўлады хлусьні, ёсьць яшчэ ў Менску людзі кшталту Вольфа Рубінчыка. Людзі паветра і сьнегу, людзі, для якіх самае галоўнае у жыцьці — захаваць сябе.

**Наталка Бабіна**

Пытайцеся ў распаўсюднікаў новы нумар




падпісны індэкс 00345

# Утопія і рэальнасьць

Раман Артура Клінава прымушае задумацца: ці можна падзяляць эстэтыку і злачынства?

**Артур Клінаў — адзін зь нямногіх беларускамоўных літаратараў, якія актыўна «раскручваюць» сябе на Захадзе. «Малая Падарожная Кніжка па Горадзе Сонца» ўжо выйшла ў нямецкім выдавецтве «Suhrkamp». З ініцыятывы і пры падтрымцы разьмешчанага ў Брусэлі Офісу за дэмакратычную Беларусь, Артур Клінаў прэзэнтаваў сваю кнігу ў Парыжы і Брусэлі.**

Прэзэнтацыя «Малой Падарожнай Кніжкі па Горадзе Сонца» ў Парыжы адбылася 7 лістапада пры спрыяньні францускіх асацыяцыяў Belprojet і Perspectives Biélorussiennes. Сваімі чытаньнямі Артур Клінаў адкрыў месяц беларускай культуры ў «Доме Эўропы і Ўсходу», разьмешчаным у самым цэнтры францускай сталіцы, непадалёк ад Плошчы Бастыліі. Гэты культурны цэнтар спрабуе з дапамогай разнастайных праектаў зьвесьці разам культуры Эўропы ды Азіі. Найбольшую ўвагу «Дом Эўропы і Ўсходу» надае тэатру (менавіта пры падтрымцы «Дому Эўропы і Ўсходу» былі выдадзеныя па-француску «Тутэйшыя» Янкі Купалы, а таксама пераклады п'есаў драматургаў, якія працуюць са «Свабодным тэатрам»). У пэўным сэнсе праект Артура Клінава таксама мае повязь з тэатрам — у сваёй кніжцы аўтар называе фасады савецкіх будынкаў дэкарацыямі для грандыёзнага спэктаклю, прэм'ера якога адбывалася ў «Краіне Шчасьця». Прыклады гэтых «дэкарацыяў» упрыгожвалі сьцены залі ў выглядзе фотавыставы.

Імпрэза ў Парыжы нагадвала імправізаваны беларускі літаратурны салён у францускай сталіцы. Выступаў ня толькі Артур Клінаў, але і арганізатары імпрэзы ды госьці. Слова давалі ўсім, хто хацеў. Нехта чытаў вершы, іншыя распавядалі пра свае ўражаньні ад Беларусі. Слухачы сілкаваліся салёнымі гуркамі, кіслай капустай ды хлебам з салам, каштавалі квас ды віно. На імпрэзе было шмат беларускай моладзі, якая вучыцца ў Парыжы, што дужа ажывіла атмасфэру.

Прэзэнтацыя «Малой Падарожнай Кніжкі па Горадзе Сонца» ў Брусэлі адбылася 12 лістапада ў Hanse-Office (прадстаўніцтве Гамбургу і фэдэральнай зямлі Шлезвіг Гольштайн у ЭС). У адрозьненьне ад Парыжу, у бэльгійскай сталіцы на чытаньні Артура Клінава прыйшлі збольшага замежнікі. Многія зь іх прафэсійна займаюцца пытаньнямі Ўсходняй Эўропы ў разнастайных інстытуцыях, разьмешчаных у Брусэлі. Для іх, стомленых стандартнымі палітычнымі паведамленьнямі, было сапраўды цікава зірнуць на Менск вачыма мастака.

Не паспрачаесься з тым, што кан-


АРТУР КЛІНАЎ

# «Гораду Сонца»

цэпцыя Артура Клінава сапраўды прыцягвае ўвагу заходняга чытача. Але — як ацэньваць яе з боку беларуса? Ідэі Артура Клінава ў нечым перагукаюцца з апошнімі дыскусіямі на старонках «НН». Ці можна разглядаць камуністычную ідэю як чыстую абстракцыю, асобна ад ахвяраў, да якіх прывяло яе ажыцьцяўленьне? Ці здольная таталітарная сыстэма спарадзіць нешта, вартае мастацкага захапленьня? Увогуле — ці магчыма адасабляць ідэі ад плёну, які яны прыносяць?

Адказаць на гэтыя пытаньні варта яшчэ і таму, што Артур Клінаў разглядае свой праект ня толькі як чыста літаратурны. Ён не хавае, што хацеў бы бачыць сваю канцэпцыю ўвасобленай у жыцьці — ператварыць савецкі архітэктурны ансамбль Менску, «Горад Сонца», у «нацыянальны культурны брэнд».

Але ці можна абстрагавацца ад мінулага? Ці варта спрабаваць стварыць нацыянальны сымбаль, грунтуючыся на савецкай эстэтыцы, якая мела на мэце найперш адлюстроўваць «веліч» сыстэмы, дзякуючы якой мільёны людзей зьніклі ў «жоўтым пясочку»? Ці можна падзяліць архітэктуру і гісторыю, палітыку і эстэтыку, мастацтва і злачынства?

Пераводзячы свой праект зь літаратурнага ў рэальнае вымярэньне, ці не трапляе Артур Клінаў на той самы кручок, які праглынулі ствараальнікі «Гораду Сонца», паспрабаваўшы ажыцьцявіць свае ўтапічныя ідэі? Цікава, што ў Нямеччыне, краіне, дзе пабачыла сьвет першае выданьне раману Артура Клінава, нацысцкая архітэктурная спадчына (у эстэтычным пляне — сястра савецкай) нават блізка не выкарыстоўваецца для стварэньня нацыянальных мітаў. Для немцаў амбітныя пабудовы Альбэрта Шпэера ды іншых архітэктараў-дэміюргаў «Трэцяга Райху» — сымбаль ганьбы і нацыянальнай катастрофы, але ніяк не «турыстычны брэнд».

Было цікава назіраць за рэакцыяй наведнікаў фотавыставы Артура Клінава ў Парыжы. Калі замежнікаў найбольш цікавілі гмахі Праспэкту ды бязьлюдныя ляндшафты Кастрычніцкай плошчы (адзін з наведнікаў радасна ўсклікнуў, паказваючы пальцам на «саркафаг» Палацу Рэспублікі: «А ў Альбаніі, у Тыране стаіць такі самы!»), то беларусы найдаўжэй угледаліся ў засыпаныя мяккім сьнегам пэйзажы рэштак старасьвецкага раёну Нямігі.

Натуральна, аўтар ня мае ілюзіяў наконт сутнасьці «Імпэрыі Зла», якая «падарыла Менску «Горад Сонца». Чытаючы раман Артура Клінава, немагчыма не заўважыць і таго, зь якой бясконцай сымпатыяй ён апісвае стары, несавецкі Менск. Зь некаторымі ідэямі Клінава можна пагаджацца, зь іншымі — спрачацца. Кожны погляд — яшчэ адна цаглінка ў пабудову вобразу Менску, які, урэшце, ствараецца кожным з нас.

**Алесь Кудрыцкі**

# Артур Клінаў: «Кожная ўнікальнасьць, адкуль бы яна ні вырастала, мае вартасьць»

Аўтар «Малой Падарожнай Кніжкі па Горадзе Сонца» мяркуе, што за саветамі ў Менску паўстаў унікальны архітэктурны ансамбль, які мусіць зрабіцца нацыянальным турыстычным брэндам.



**«Наша Ніва»: Распавядзіце, калі ласка, пра кніжку, якую Вы прэзэнтавалі ў Парыжы і Брусэлі.**

**Артур Клінаў:** Гэта спроба міталягізаваць Менск. Калі параўнаць кніжку з выдадзеным раней фотаальбомам «Горад СОНца», то ў кніжцы міт значна пашыраецца, вэрбалізуецца, прапрацоўваецца ў дэталях, нюансах. Мне здаецца, даўно была патрэба ў такой кніжцы, бо горад, па-свойму вельмі дзіўны, доўгі час быў нейкім безаблічным. Быццам бы і вялікі, два мільёны жыхароў, мэгаполіс, але вось нечага большага сказаць пра гэты горад нельга было. Не было тэксту. У прынцыпе, гэта павінен быць не адзін тэкст, гэта павінен быць цэлы корпус тэкстаў. Але іх проста не было, нават мінімальнай нейкай колькасьці такіх тэкстаў. І гэты раман — гэта спроба стварыць, напісаць міт гэтага гораду. І спроба гэтая адбываецца на падставе найноўшай гісторыі апошніх ста гадоў. Мне цяжка акрэсьліць жанр кнігі. Гэта, хутчэй, вялікае эсэ. Але, зь іншага боку, «Малая Падарожная Кніжка па Горадзе Сонца» ўжо выходзіць за рамкі эсэ. Ну, няхай гэта будзе раман.

**«НН»: Пра што Вы распавядаеце ў сваім творы?**

**АК:** Кніжка складаецца з трох лініяў, з трох лягічных ланцужкоў. Першая лінія — гэта ўспаміны хлопчыка,

**Працяг на старонцы 36.**

# Дэльфіна Паер: «Культура — добры сродак, каб зацікавіць людзей»

Ідэя правесьці чытаньні Артура Клінава ў Парыжы належыць **Дэльфіне Паер**, сузаснавальніцы асацыяцыі Belprojet.



**«НН»: Як Вы ацэньваеце чытаньні Клінава?**

**Дэльфіна Паер:** Праект быў цікавы, таму што гэта іншы погляд на Менск. Мы ўжо рабілі ў Парыжы выставу пра Менск, дзе паказвалі фота Аляксея Андрэева, які здымае горад у адлюстраваньнях. Таксама мы паказвалі працы Джэфа Баніфацыно — гэта таксама быў іншы погляд на беларускую сталіцу. Клінаў нестандартна, па-свойму «прачытаў» Менск.

**«НН»: Раскажыце крыху пра вашую асацыяцыю.**

**ДП:** Сябрамі асацыяцыі Belprojet зьяўляюцца прыкладна 40 чалавек. Але яны не працуюць стала, а проста дапамагаюць раз-пораз. Актыўнае ядро нашай арганізацыі невялікае. Мы займаемся толькі культурніцкімі праектамі. На наступны год, увесну, таксама будзем спрабаваць зрабіць яшчэ раз беларускі фэстываль. Магчыма, зладзім пару беларускіх канцэртаў, напэўна, будзем рабіць яшчэ выставы. У нас штогод 9 траўня адзначаецца Дзень Эўропы. Але мы заўважылі, што цяпер у Францыі гэтае сьвята фактычна ператварылася ў дзень Эўрасаюзу. Мы ня згодныя з гэтым, бо Эўропа — гэта кантынэнт, а ня проста Эўрасаюз. Налета «Дом Эўропы і Ўсходу» плянуе адзначыць Дзень Эўропы, паставіўшы на вуліцы намёты, якія будуць прэзэнтаваць краіны, якія не ўваходзяць у ЭС. Мы зь Віржыняй Шыманец будзем займацца беларускім намётам, дзе можна будзе атрымаць інфармацыю пра краіну.

**«НН»: Чаму ваша асацыяцыя надае ўвагу культурніцкім праектам?**

**ДП:** Стаўленьне французаў да Беларусі мяняецца. Таму мы і вырашылі займацца культурай, бо лічым, што гэта добры сродак, каб зацікавіць людзей. Каб многія, наведаўшы нашы імпрэзы, падумалі: «О, гэта цікава». А потым захацелі больш даведацца пра Беларусь. Гэта нашая мэта.

**Гутарыў АК**

# «Кожная ўнікальнасьць... мае вартасьць»

**Працяг са старонкі 35.**

які нарадзіўся ў Горадзе Сонца, яго ўспаміны пра дзяцінства ў Краіне Шчасьця. На тле гэтых успамінаў паказваецца горад. Другая лінія — хлопчык вырастае, ён дарослы мужчына, займаецца архітэктурай, горадабудаўніцтвам, і ўжо зь сьвядомых і прафэсійных пазыцыяў аналізуе гэты горад, яго міталёгію, філязофію, вядзе чытача праз гэты горад, нешта тлумачыць свайму спадарожніку. А трэцяя лінія — гэта гісторыя. Гістарычны ланцужок мусіць, з аднаго боку, патлумачыць, чаму Горад Сонца зрэалізаваўся менавіта ў Менску, а зь іншага боку — улічваючы, што кніга пісалася для эўрапейскага чытача, — у гэтай гістарычнай лініі трэба было даць максымальна шмат гістарычных фактаў пра Беларусь, пра горад, пра краіну. Гістарычныя зьвесткі — гэта не навуковае паглыбленьне ў гісторыю. Яны падаюцца ў даступнай, міталягізаванай, спрошчанай форме — спрошчанай не да коміксу, натуральна, а да нейкіх знакаў, вобразаў, мітаў.

**«НН»: Ці лічыце Вы чытаньні ўдалымі?**

**АК:** Мне здаецца, абедзьве прэзэнтацыі, што ў Парыжы, што ў Брусэлі, прайшлі вельмі файна, душэўна, і зь вялікай увагай і цікаўнасьцю публікі. У прынцыпе, калі прэзэнтуеш эўрапейскай грамадзкасьці міт пра Горад Сонца, звычайна гэта выклікае вялікую ўвагу, добрую рэакцыю. Бо калі б ты прыязджаў і зноўку прэзэнтаваў зьбітыя беларускія брэнды — скажам, пра тое, як цяжка беларускай апазыцыі, — рэакцыя, натуральна, іншая. Але калі ты прывозіш міт пра Горад Сонца, заяўляеш, што на тэрыторыі Менску знаходзіцца абсалютна ўнікальны горадабудаўнічы помнік, якога няма ні ў Эўропе, ні ў сьвеце, то, натуральна, гэта ня можа ня выклікаць зацікаўленьня эўрапейскай публікі.

**«НН»: А, можа, няма сэнсу падымаць на шчыт гэтую савецкую спадчыну? Ці вартая яна тае ўвагі?**

**АК:** Я думаю, што такое меркаваньне — абсалютная лухта. Тое, што страчана, тое страчана. А страчаны ў нас практычна ня толькі Менск, страчаныя ўсе гарады беларускія, іх няма, не засталося. І трэба на гэта глядзець рэальна, не будаваць нейкіх ілюзіяў. А што тычыцца Гораду Сонца, то казаць, што ён ня мае каштоўнасьці, можа толькі чалавек, недасьведчаны ў архітэктуры. Як прафэсіянал, архітэктар, горадабудаўнік паводле адукацыі, я заяўляю, што няма ў сусьветнай архітэктурнай практыцы ніякіх аналягаў такога горадабудаўнічага ансамблю. Гэта ўжо па сабе ёсьць безумоўная каштоўнасьць, нават унікальнасьць. Ну няхай яна савецкая, няхай са сталінскімі рысамі ды адпаведнай аўрай, але, тым ня менш, у сэнсе культуры кожная ўнікальнасьць, адкуль бы яна ні вырастала, мае вартасьць. Па-другое, трэба паглядзець, што для Беларусі можа даць гэты праект. Калі ўдасца яго вывесьці на ўзровень нацыянальнага праекту і раскруціць як рэальны турыстычны брэнд. А гэта і магчыма, і трэба рабіць. У пэрспэктыве, калі ён раскруціцца, гэты брэнд будзе даваць краіне мільярды даляраў даходу (праўда, на той час гэта ўжо можа быць эўра). Натуральна, не на працягу году, а цягам пэўнага пэрыяду. Чаму, сыходзячы з пункту гледжаньня нацыянальных інтарэсаў, чаму мы павінныя адмаўляцца ад такога дзіўнага падарунку гісторыі і лёсу, які пэўным чынам апынуўся ў Менску? Гэты унікум прызямліўся ў Менску, чаму мы павінныя ад гэтага адмаўляцца? Трэба проста гэта прызнаць і пачаць на гэтым зарабляць грошы, што абсалютна рэальна і будзе слушна.

**Гутарыў АК**

# Сяргей Харэўскі: «Гарады мусяць існаваць для тых, хто ў іх жыве»

Гісторык архітэктуры і культуроляг **Сяргей Харэўскі** лічыць, што савецкую спадчыну ня варта выкарыстоўваць для стварэньня вобразу Менску.

**«Наша Ніва»: Ці сапраўды Менск ня мае ўласнай міталёгіі?**

**Сяргей Харэўскі:** Сакрат мне сябар, але ісьціна — даражэйшая. У Менску была свая міталёгія, шматкроць апрацаваная — каталіцкая, часоў Рэчы Паспалітай (Менск Сыракомлі), праваслаўная, часоў імпэрыі (Менск Шпілеўскага), уласна фальклёрная XIX ст. («Менскія легенды» Бохана), уласна гарадзкія міты XX ст. (ад Кульбака, Пясэцкага й Юстапчыка да жудзікаў Францішка Хлуса й Глёбуса), а таксама ў кнігах Пазьняка, Дзянісава, Шыбекі. Урэшце, і Клінаў стварае новы міт. Іншая рэч, што гэтымі мітамі не прасякнуліся самі менчукі. Беларуская культурная прастора хворая на склероз — што ні раніца, то навіны… Мне не падабаецца слова «імідж». Я лічу, што важней сутнасьць. Сёньня яна, сутнасьць, на жаль, сталінска-брэжнеўская. І ня трэба тут быць Клінавым, каб гэта заўважыць… Трэба мяняць гэты стан рэчаў, адраджаючы куды больш глыбокія, сутнасныя міты ад часоў балцкіх і да несавецкага андэграўнду XX ст.

**«НН»: Ці гэта слушная ідэя — рабіць савецкую горадабудаўнічую спадчыну «турыстычным брэндам» Менску?**

**СХ:** Можа, яшчэ й у Курапаты на расстрэльныя атракцыёны турыстаў вазіць? Памойму, гэты «брэнд» нікуды ня дзеўся. Гэта магістральная дзяржаўная лінія! І вуліцы носяць імёны катаў нашага народу, і пачварныя леніны-калініны-дзяржынскія ў кожным раёне засталіся. І куды ўжо далей з тымі «брэндамі», пасьля «Лініі Сталіна»?



Урэшце, нашыя гарады, нашыя помнікі, нашыя магілы, як і ва ўсім сьвеце, мусяць існаваць, перадусім для тых, хто тут жыве. А не для турыстаў-разявак. Хіба Рым існуе для турыстаў? Гэта наш лад жыцьця, нашая культура, наш кшталт цывілізацыі й рупнасьць пра свае сьвятыні можа прыцягнуць цікаўных. І тады даход ад турызму будзе бонусам.. Калі ж усё наадварот, то ня будзе наагул нічога.

**«НН»: Ці сапраўды савецкі архітэктурны ансамбаль Менску (Праспэкт і г. д.) унікальны?**

**СХ:** Падобныя ансамблі, а часам і больш каштоўныя, у матэрыяльным сэнсе, ёсьць у Кіеве і Харкаве, Валгаградзе й Баку, у розных буйных гарадах Расеі, Казахстану, Украіны. Хіба што ўражвае яго даўжыня: асноўная частка складае 7 км, а агульная працягласьць і яшчэ большая… Ну, з гэтым паказчыкам рэкардсмэнам Менск не застанецца…

**«НН»: Якое месца павінна займаць савецкая архітэктурная спадчына ў сьвядомасьці саміх беларусаў?**

**СХ:** Да некаторых ансамбляў таталітарных Бэрліна, Масквы, Пэкіна й Пхеньяну нават Менск не дацягвае. Але ТАМ ёсьць ня толькі гэта. У нас жа, чапляючыся за савецкасьць, толькі гэтым і ганарацца. Гэтую спадчыну трэба пераасэнсоўваць! Ну, што стала скарынаўскага на праспэкце Скарыны, пакуль ён насіў гэтае імя? Нуль! Варта самім нешта зрабіць, наблізіць наш урбаністычны асяродак да чалавечага вымярэньня, напрыклад, сьцерці ўсе бальшавіцка-чэкісцкія памяткі, ушанаваць уласна нашых герояў, пакласьці прыгожы брук зь мікашэвіцкага ці глушкевіцкага граніту, перакрыць дахі керамічнай якаснай дахоўкаю, зрабіць ліўнёвую каналізацыю, урэшце, каб вада з дахаў не цякла пад ногі мінакам! Архітэктура ад гэтага толькі выйграе!

**«НН»: Ці лічыце Вы, што старыя Менск і іншыя беларускія гарады незваротна страчаныя?**

**СХ:** Тое, што «страчана», можна ацэньваць па-рознаму. Мне да сардэчнага болю шкада таго барочнага Менску канца XVIII — пачатку XIX стст. Гэта быў самы арыгінальны архітэкурны ансамбль у нашым краі. Вельмі адметны, унікальны… А хтосьці сумуе па Менску губэрнскім, бяз Ратушы, але з помнікам Аляксандру ІІ, з тузінам сабораў а la russe. А хтосьці хоча бачыць Менск увасабленьнем задумаў Лянгбарда… Я вось бачыў сёлета, як абышліся з савецкімі пачварамі ў Батумі — пусьцілі ў паветра! Разьбілі там, на месцы бяздарна-шэрых спаруд, зялёныя бульвары й паркі. Стала нават дыхаць лягчэй! У Менску трэба разваліць тузін найбольш брутальных горадабудаўнічых памылак у цэнтры гораду і, паверце, яго вобраз зьменіцца радыкальна. У лепшы бок. З эстэтычных, экалягічных і (sic!) этычных прычынаў.

Няма сэнсу шукаць леташні сьнег. Трэба ствараць сабе камфортны, свойскі, грунтоўны асяродак.

**«НН»: Ёсьць такая думка — калі зьменіцца ўлада, «мы ўсё савецкае зруйнуем і адбудуем старое» — калі ня ўвесь Менск, то, прынамсі, раён Нямігі. Ці гэта рэальна? Ці гэта патрэбна?**

**СХ:** Абсалютна рэальна і патрэбна. Навошта захоўваць гэты хаос? Сёньня гэта самая кудодымная, экалягічна праблемная частка гораду. У двары гэтых пачварных спарудаў не трапляе сонца. Аўтэнтычныя каштоўнейшыя помнікі дойлідства літаральна «раздушаныя» гэтымі тонамі бязладна нагрувашчанага бэтону. Скажоны натуральны краявід, перарваныя візуальныя повязі Траецкага і Ракаўскага прадмесьця зь Верхнім горадам… Пры сёньняшніх тэхналёгіях кампэнсаваць людзям жыльлё, а нават палепшыць, не вялікая праблема.

**«НН»: Тыя навінкі горадабудаўнічыя, што ствараюцца цяпер, — Нацыянальная бібліятэка, падземныя гандлёвыя комплексы і г. д., карацей, архітэктурная спадчына нашага часу, — ці мае яна нейкую вартасьць? Ці зробіцца яна помінкам у будучыні? Прынамсі, Эйфелеву вежу таксама ўсе спачатку ганілі...**

**СХ:** Гэтыя «навінкі» былі задуманыя й спраектаваныя ў сярэдзіне 1980-х. У рэчышчы тагачасных уяўленьняў. У сьвеце такога дабра нарабілі нямала. Нацыянальную бібліятэку ці міні-копію маскоўскае Манежнае плошчы няма чаго ганіць. То бок, тут няма пра што гаварыць.

**Гутарыў АК**

# Захар Шыбека: «Вобраз места зьяўляецца сам па сабе, яго ня трэба прыдумваць»

**Захар Шыбека**, гісторык, знакаміты дасьледчык менскай гісторыі, аўтар кнігі «Минскъ сто гадоў таму», разважае пра месца савецкай архітэктурнай спадчыны ў сьвядомасьці беларусаў.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**«НН»: Як Вы ставіцеся да праекту Артура Клінава «Горад СОНца»?**

**Захар Шыбека:** Я лічу Артура вельмі арыгінальным, таленавітым і сучасным чалавекам. Адзіны ягоны недахоп — што ён часта курыць цыгарэты (*сьмяецца*). А што тычыцца яго прапановаў — натуральна, я стаўлюся да гэтага трошку са скептыцызмам. Жыцьцё немагчыма ператварыць у арт-мастацтва і экспэрымэнты розныя праводзіць, хоць гэта, можа, і зьяўляецца блакітнай марай такіх мастакоў, як ён. Па-першае, адразу ўзьнікаюць пытаньні, дзеля чаго Артур такую прапанову зрабіў — пакінуць Менск савецкім, і нават назвы вуліцаў захаваць (*выступаючы 26 кастрычніка на радыё «Свабода», А.Клінаў выказаў меркаваньне, што савецкія назвы ў межах савецкай архітэктуры мусяць захавацца — заўв. рэд.*). Дзеля памяці пра савецкую эпоху? Я лічу, «найлепшай» памяцьцю пра савецкую эпоху зьяўляюцца Курапаты. Можа, гэта экспэрымэнт, каб надаць вобраз нашай сталіцы? Але калі дзеля гэтага ідэалізаваць цяперашні савецкі горад, то чаму тады не аднавіць квартал гета? Вось вам сталінскі ідэальны горад, а побач — гета. Можна зьдзейсьніць шмат падобных ідэяў, але дзе тады жыць мянчанам? Гэта музэізацыя гораду. Захаваньне памяці павінна быць у выглядзе мэмарыялізацыі, нейкіх памятных дошак, распаўсюду інфармацыі.

**«НН»: Ці можна сказаць, што Менск ня мае адметнага вобразу?**

**ЗШ:** Менск пакуль што мае надта савецкі вобраз. Аднастайная архітэктура паўсюль, на плошчах помнікі Леніну. Аднак у нас і цэрквы ўсе некалі былі перанобленыя на склады. Але ж гэта ня значыць, што іх варта было захаваць у такім выглядзе для памяці пра савецкую эпоху. Цяпер яны крыху адрадзіліся. Менск — горад савецкі, але ён знаходзіцца ў трансфармацыі, вяртае старыя адметнасьці. Трэба шанаваць цэнтар гістарычны, але захоўваць яго трэба ня толькі ад бальшавіцкага мінулага, але і ад актыўнай атакі капіталу. Адзін архітэктурны праект, распрацаваны ў Маскве, робіцца ўнівэрсальным для ўсёй постсавецкай прасторы. Ён пераймаецца без сваіх традыцыяў горадабудаўнічых, архітэктурных, без сваіх культурных адметнасьцяў. Вазьміце, скажам, архітэктуру Лацінскай Амэрыкі, Кітаю, Арабскіх Эміратаў — паўсюль ёсьць асаблівасьці. А ў нас няма сувязі зь мясцовымі архітэктурнымі традыцыямі, ні кроплі яна не выяўляецца.

**«НН»: Якога падыходу варта трымацца ў адносінах да беларускіх местаў?**

**ЗШ:** Галоўнае — захоўваць гістарычныя цэнтры і вызваляць будынкі ад савецкага наслаеньня, вяртаць іх да першапачатковага функцыянальнага выкарыстаньня. Калі будынкі перароблены іншым стылем, савецкім, трэба рабіць іх такімі, якія яны былі ў часе свайго будаўніцтва. Сучасную забудову праводзіць у нацыянальным стылі.

Для мяне Менск — горад парадоксаў, для кагосьці ён горад спатканьняў. Магчыма, ён зробіцца некалі горадам каханьня, хто ведае. Але не савецкім.

Такія прапановы, як робіць Артур Клінаў, патрэбныя — яны прымушаюць задумацца, распачаць дыскусію. Погляды могуць быць іншыя, гэта нармальна. Думаю, Артур на мяне не пакрыўдзіцца.

**Гутарыў АК**


АРТУР КЛІНАЎ

# Вольга Стужынская: «Прыйшоў час, калі краіну трэба паказваць зь іншага боку»

Вольга Стужынская — дырэктарка разьмешчанага ў Брусэлі Офісу за дэмакратычную Беларусь, на запрашэньне якога Артур Клінаў зладзіў чытаньні ў Парыжы і Брусэлі.

**«НН»: Офіс за дэмакратычную Беларусь і літаратурныя чытаньні — гэта спалучальна?**

**Вольга Стужынская:** Сярэднестатыстычны заходнеэўрапеец часта зусім ня ведае, што паміж Польшчай і Расеяй існуе незалежная краіна. Гэты праект я лічу вельмі важным, бо ён прадстаўляе менавіта беларускамоўную беларускую культуру. Апошнім часам на нас стаіць кляймо дыктатуры. Калі пра Беларусь кажуць, то толькі ў вельмі нэгатыўным кантэксьце: пра палітвязьняў, нізкі ўзровень жыцьця і г. д. Так, усе мы хочам дэмакратычных зьменаў, але прыйшоў час, калі краіну трэба паказваць зь іншага боку — у тым ліку праз культурніцкія праекты. Паказваць, што, нягледзячы на самаізаляцыю, мы сочым за працэсамі, якія адбываюцца ў супольнай Эўропе і хочам быць яе часткай, што ў нас шмат таленавітых людзей, і што такія прадстаўнікі нашай культуры, як Артур Клінаў, маюць такі ж прафэсійны ўзровень, як творцы з Заходняй Эўропы.



**«НН»: Якую ролю адыгрываюць культурніцкія праекты ў працы Офісу за дэмакратычную Беларусь?**

**ВС:** Узрасла значнасьць менавіта культурніцкіх праектаў, бо сёньня мы маем новую палітычную сытуацыю ў краіне, якая адрозьніваецца ад той, якая была некалькі год таму. Мы перайшлі на іншы ўзровень. Паралельна з палітычнай, асьветніцкай, інфармацыйнай, каардынацыйнай працай культурніцкія праекты ўжо займаюць і будуць займаць у будучыні вельмі важнае месца ў дзейнасьці Офісу за дэмакратычную Беларусь.

**Гутарыў АК**

# Псыхолягі: нявробства і беднасьць робяць чалавека нешчасьлівым

Зналыя навукоўцы сьвету на сымпозіюме, які адбыўся 11 лістапада ў Бэрліне, паспрабавалі вырашыць праблему хуткаплыннасьці пачуцьця шчасьця і адказаць на пытаньне: як зрабіць усіх эўрапейцаў шчасьлівымі?

## Багатыя эўрапейцы шчасьлівейшыя

Вядомую мудрасьць, што грошы не прыносяць шчасьця, навукоўцы пацьвердзіць ня здолелі, бо падчас эўрапейскага сацыялягічнага апытаньня прадстаўнікі найбольш багатых краінаў Эўрасаюзу часьцей пазначалі сябе шчасьлівымі, чым жыхары бедных. Самымі шчасьлівымі сталі датчане, самымі няшчаснымі — баўгары.

Наагул, і задаволенасьць жыцьцём у багатых краінах вышэйшая — 80—90 % (для параўнаньня, у Расеі задаволеныя жыцьцём толькі 50 %).

Прычына задаволенасьці — у якасьці жыцьця і абслугоўваньня, наяўнасьці альбо адсутнасьці карупцыі і іншых фактараў. Але і ў багатых краінах хапае няшчасных людзей.

Асабліва няшчасным чалавека робіць нявробства, сьцьвярджаюць псыхолягі. Неістотна, ці зьяўляецца яго прычынай адсутнасьць працы, бессэнсоўная праца альбо тое, што ў чалавека столькі грошай, што працаваць няма сэнсу.

## Што ж такое шчасьце?

«Пачуцьцё шчасьця зьвязанае з разьдзельнымі сыстэмамі чаканьня ўзнагароды і яе атрыманьня — гэта меркаваньне спэцыяліста па вывучэньні чалавечага мозгу з Брэмэну Герхарда Рота. Фізыялёгія мозгу такая, што радасьць ад прадбачаньня ўзнагароды — самая моцная. Атрыманьне ўзнагароды выключае пачуцьцё шчасьця толькі тады, калі яно нечаканае, але заслужанае, інакшай узнагарода проста ня будзе ўспрымацца ўзнагародай.

Навукоўцы адзінадушныя ў адным: дадатныя сацыяльныя ўзаемадачыненьні — сябры, сям'я, спадарожнік жыцьця, прыязныя суседзі, — асабліва важныя для шчасьця. Прычына гэтага ў тым, што матэрыяльныя даброты, кар'ерны посьпех радуюць толькі адзін раз. Паўтараючыся, яны перастаюць прыносіць пачуцьцё шчасьця. Мозг разумее: гэта ўжо было. Выключэньне — прыемныя сацыяльныя кантакты. Яны дораць радасьць зноў і зноў. І чым менш задаволеныя жыцьцём навакольныя, чым больш агрэсіўнае асяродзьдзе, тым менш шанцаў адчуваць сябе шчасьлівым. Цяжка ўсьміхацца, калі ў транспарце адтапталі ногі, начальнік азначыў, хто з вас дваіх дурань, і хатнія, пераж'ыўшы такі самы дзень, зрываюць злосьць адно на адным…

Удзельнікі сымпозіюму ў Бэрліне здолелі адказаць на ўсе пытаньні, акрамя аднаго: як забясьпечыць устойлівае адчуваньне шчасьця ў краінах, дзе невысокі агульны ўзровень задаволенасьці жыцьцём.

**Чым менш задаволеныя жыцьцём навакольныя, чым больш агрэсіўнае асяродзьдзе.**

## Нешчасьлівыя, але аптымісты

Эўрапейскі банк рэканструкцыі і разьвіцьця правеў у 28 краінах з пераходнай эканомікай дасьледаваньне на тэму «Жыцьцё ў пераходны пэрыяд». Беларусы таксама бралі ўдзел. Ім прапаноўвалася параўнаць задаволенасьць ад жыцьця цяпер з адчуваньнямі ад рэаліяў 1990-х. Выявілася, што 70 % беларусаў задаволеныя сваім жыцьцём.

Эксьпэрт аналітычнага цэнтру «Стратэгія» Валеры Карбалевіч у камэнтары, дадзеным калегам-журналістам, тлумачыць гэта тым, што 1989 год быў пачаткам сур'ёзнага эканамічнага крызісу і бясконцых чэргаў па дэфіцыт, да якога адносіліся практычна ўсе катэгорыі тавараў. На думку экспэрта, гэта «не найлепшы год для параўнаньня».

Колькасьць задаволеных не зьдзіўляе Валер'я Карбалевіча яшчэ й таму, што ў апошнія гады ў Беларусі вырас узровень жыцьця, людзі пачалі актыўна браць крэдыты, пачаўся спажывецкі бум.

Зрэшты, беларусы калі і ня вельмі шчасьлівая, то вельмі аптымістычна настроеная нацыя. Дастаткова прыгадаць, які пераважны адсотак людзей залічвае сябе да сярэдняй клясы. Прытым, што, паводле Нацбанку, на кожнага беларуса прыпадае толькі па-500 даляраў ашчаджэньняў на рахунках.

Дадзеная публікацыя падрыхтаваная пры спрыяньні Эўрасаюзу і не абавязкова адлюстроўвае афіцыйны пункт гледжаньня ЭС.
По дадатковую інфармацыю зьвяртайцеся на сайт www.delblr.ec.europa.eu

# Менск разэнкрайцэра Эйзэнштэйна

«Дарагая Матуля! Тут — проста Эўропа!... Не чакаў я столькі ад Менску!..» — пісаў у 1920 г. у Пецярбург малады чалавек, які неўзабаве стане найзнакамiцейшым у сьвеце кінарэжысэрам.

Сяргей Эйзэнштэйн нарадзіўся 10 студзеня 1898 г. у Рызе ў сям'і архітэктара Міхаіла Эйзэнштэйна й Юліі Канецкай, якая паходзіла з багатага купецкага роду. Як узгадваў будучы мастак, ягоны бацька быў «прадстаўніком каляніяльнай адміністрацыі», а на рыскіх дамах красаваліся нязграбныя імпэрскія статуі ад Міхаіла Эйзэнштэйна.

Дзяцінства Сяргея было азмрочанае разводам бацькоў — матуля пераехала ў Пецярбург. Пасьля Рыскай вучэльні туды падасца й сын — каб кшталтавацца ў Петраградзкім інстытуце грамадзянскіх інжынэраў.

Але інжынэрную адукацыю ён ня скончыць.

Спачатку Эйзэнштэйна мабілізуюць на фронт, каб ён кіраваў будаўнічымі працамі, а пазьней расьпісваў цягнікі. А ў 1920 г. лёс закіне яго ў Менск, дзе «хлопчык з Рыгі» ўвойдзе ў патаемную ложу разэнкрайцэраў — і зробіць выбар, вызначальны для ўсёй гісторыі кіно.

### Разэнкрайцэры ў Невелі

Да свайго зьяўленьня ў Менску, разэнкрайцэры атабарыліся пад Невелем, у Віцебскай губэрні (цяпер Пскоўшчына, на мяжы зь Беларусяй).

Кіраўнік ложы Барыс Зубакін (ордэнскае імя — Богары) у 1918 г. уцёк на Віцебшчыну зь Пецярбургу, ратуючыся ад голаду, безграшоўя і сямейных няшчасьцяў.

Як распавядаў Зубакін у ОГПУ, спрабуючы зарэгістраваць (!) гурток містыкаў-анархістаў, арганізаваная на Ўсходзе школа разэнкрайцэраў зьявілася ў Эўропе ў XII ст. «Эмблема — Ружа і Крыж — азначае сумяшчэньне «Ружы» — ведаў, культуры — з крыжам рэлігійнага падзьвіжніцтва, містычных досьведаў і пошукаў», — тлумачыў Богары галоўныя сымбалі руху. Але да царквы містыкі-анархісты ставяцца рэзка адмоўна.

У нашчадкі разэнкрайцэраў былі залічаныя рыцары Мальты, тампліеры і масоны, «якія напладзілі процьму цемрашальных школаў». Сярод сваіх духоўных папярэднікаў Зубакін узгадваў Вільгельма Постэля, Марцінэса-Паскваліса (які ў XVIII ст. заснаваў ордэн марціністаў), ягонага вучня Сэн-Мартэна дый Жэрара-Экаса.

Непасрэдным настаўнікам Зубакіна быў чэх Аляксандар фон Кордыг, службовец аптэкарскай фірмы «Штоль і Шміт» у Пецярбургу. На працягу году, да 1916, стары Кордыг, які быў ужо пры сьмерці, вучыў 21-гадовага адэпта Кабале, арканам Таро і містычнай філязофіі. Вучань абараніў дысэртацыю «Пра імёны Божыя ў кабалістычных сэктах» — і атрымаў дыплём тайнага інстытуту свабодных мастацтваў.

З 1918 году Барыс Зубакін атабарыўся на хутары Зацішша, пад Невелем, у старой Пелагеі Вярбіцкай. Сьціпла працаваў вясковым настаўнікам і завяршаў дысэртацыю па філязофіі рэлігіі.

У 1919 г. на Віцебшчыну прыехаў яго сябар па гімназіі Валошынаў з хворай маці — і Ордэн аднавіўся. У суседняй сядзібе Атраднае жыў яшчэ адзін іхны гімназічны сябра, Уладзімер Ругевіч, які вёў узорную гаспадарку. Побач, на сваім гародзе, атабарыўся мастак Ян-Рафаіл Буйніцкі, які толькі-толькі вярнуўся з Італіі з жонкай, былой сьпявачкай Адэляідай Крунэк. Дзед Буйніцкага быў масонам — і старога мастака абралі ганаровым кіраўніком, Гросмайстрам і Вярхоўным справаводцам «LA».

На прыродзе невельскія разэнкрайцэры займаліся тэорыяй акультызму, тэхнікай дыханьня, сьпявалі й пісалі паэмы. Зь Невелю да гуртку далучыўся Іван Цурыкаў і бактэрыёляг Георгі Кульбін, які калісьці слухаў лекцыі Барыса Зубакіна. Сярод іншых удзельнікаў сустрэчаў Богары таксама ўзгадваў «каморніка Кражэвіча, які прыязджаў у Атраднае, ды прыяцеля Вярбіцкай хутараніна Ластоўскага. Філёзаф Міхаіл Бахцін — слынны стваральнік тэорыі дыялёгу й карнавалу — да раніцы заседжваўся ў Богары за кубкам гарбаты.

Але ў іерафанта разэнкрайцэраў былі ўсе падставы крыўдаваць на свайго віцебскага сябра. Бахцін зьвёў з гуртка калегу й найлепшага вучня Зубакіна Валянціна Валошынава. Пад імём Валошынава выйдуць дзьве кнігі Бахціна «Фрайдызм» і «Марксізм і філязофія мовы», якія ня будуць мець нічога супольнага з акультнымі экспэрымэнтамі Ордэну.

У ліпені 1920 невельская ложа канчаткова распалася, калі хворага Зубакіна мабілізавалі ў Чырвоную армію лектарам.

### Менск, 1920

Менск 1920 году, дзе сустрэліся будучы рэжысэр Сяргей Эйзэнштэйн і іерафант разэнкрайцэраў Богары, быў маленькім, чысьценькім, эўрапейскім горадам.

Эйзэнштэйн, захлёбваючыся, пісаў пра электрычнасьць, парыскія моды, багацьце тавараў і нізкія цэны.

Як узгадвала Вера Нікіціна (жонка мастака Леаніда Нікіціна), якая ў гэты самы час трапіла ў горад, «тады яшчэ існаваў менскі кірмаш, на якім гандляркі-габрэйкі хапалі мінакоў за крысо паліто і пінжакоў, каб навязаць свой тавар. У адзін са сваіх рэдкіх шпацыраў я прыйшла на бераг ракі, што працякала праз горад. Маю ўвагу прыцягнуў вялікі натоўп народу. Паабапал ракі чынна, шэрагамі стаялі габрэі ў даўгіх сурдутах, у кацялках, усе з пэйсамі і мармыталі штосьці па сваіх малітоўніках. Потым я даведалася, што гэта было сьвята, калі яны ўзгадвалі свой «плач на рэках Бабілёнскіх». Горад быў амаль суцэльна з габрэйскім насельніцтвам, паўсюль гучала характэрная гутарка…»

У Менску Эйзэнштэйн пасьпяхова

вылечыў зубы й набыў боты, якія ў Пецярбургу каштавалі ў тры разы даражэй.

Неўзабаве пасьля прыходу Чырвонай арміі цэны падскочаць, а тавары зьнікнуць, а пакуль Эйзэнштэйн, які быў неблагім графікам, расьпісаў пяць цяплушак «усялякімі папамі, Антантамі й ідэалізаванымі чырвонаармейцамі», рабіў дэкарацыі для тэатру ды падпрацоўваў карыкатурыстам у Літаратурным выдавецтве. Матулі Сяргей скардзіўся на неспрыяльныя міжнародныя абставіны, пры якіх карыкатуры на Польшчу не праходзілі: «Маленькіх газэтных карыкатураў прынята ад мяне на 6.000 (8 малюнкаў!), але толькі на 1.500 дапушчальна пры добрых з Польшчай стасунках!»

Галоўнага тэатральнага рэжысэра (найхутчэй, гэта быў кіраўнік франтавой трупы Дняпроў, але мог быць і Еўсьцігней Міровіч) Эйзэнштэйн хваліў і хадзіў на ўсе ягоныя рэпэтыцыі («у нас цудоўны рэжысэр!»).

Ягоныя выказваньні пра актораў сьціплейшыя: «Праз гадзіну пасьля пачатку рэпэтыцыі я шалею ад гэтых гнюсаў-актораў (у нас толькі 2—3 добрыя), такіх неўспрымальных, нячулых... Часам зайздрошчу, што ў мяне няма голасу для сцэны».

У тэатры ставілі забытую сёньня п’есу «Вера Мірцава». І менавіта ў будынку гарадзкога тэатру чытаў лекцыю пра сьмех прафэсар Зубакін.

У 1917 г. тут адбыўся Першы Ўсебеларускі сход, які прывёў да абвяшчэньня БНР, а незадоўга да прыходу чырвоных на сцэне выступалі з дакладам сябры Богары па Рэлігійна-філязофскім таварыстве Дзьмітры Меражкоўскі й Зінаіда Гіпіус.

У мэмуарах, складзеных у 1946 г., Эйзэнштэйн зь вялікай іроніяй піша пра свайго акультнага выхаваўцеля. Але ў лістах да матулі інтанацыя яшчэ іншая:

«Меў тут вельмі цікавую сустрэчу, якая перайшла ў блізкае сяброўства нас траіх з асобай цалкам незвычайнай: вандроўным арцыбіскупам Ордэну Рыцараў Духу... Ён бачыць астральнае цела ўсіх і па ім можа пра чалавека гаварыць самыя патаемныя думкі. Мы ўсё выпрабавалі гэта на сабе. Цяпер заседжваемся да чацьвёртай, пятай раніцы над вывучэньнем кніг мудрасьці Старажытнага Эгіпту, Кабалы, Асноваў Вышэйшай Магіі, акультызму... Веды яго проста бязьмежныя...».

Узгаданыя ў лісьце браты Эйзэнштэйна па Ордэну — гэта мастак, тэарэтык нэавіталізму Леанід Нікіцін і маскоўскі пісьменьнік Павал Арэнскі (у мэмуарах — «сын аднаго з другасных рускіх кампазытараў»). Калегамі па лёжы таксама былі авантурнік Барыс Плетнэр («здэгенэраваны расейскі арыстакрат зь нямецкім прозьвішчам») і актор Іван Смолін, з казанскіх стараабрадцаў.

Эйзэнштэйн хацеў займацца мастацтвам — і разьлічваў на маскоўскія сувязі Паўла Арэнскага; прыкрыцьцём для вандроўкі ў Маскву былі курсы японскай мовы пры Генэральным штабе, на якія паступілі Арэнскі, Эйзэнштэйн і Нікіцін.

«Зь Менскам разьвітваюся бяз жалю — цэны тут неверагодна падняліся: учора ўжо апячаталі ўсе крамы. Гандаль замірае. Пытаньне дроваў будзе жахлівым... » — пісаў Эйзэнштэйн у лісьце ад 20 верасьня.

## Пралетарская практыка сацыялістычнага акультызму

У Маскве акультныя заняткі аднавіліся ў новым складзе.

«Сярод новых адэптаў — Міхаіл Чэхаў і Смышляеў. У халоднай гасьцёўні, дзе я сплю на куфры, — гутаркі.

Цяпер яны набываюць хутчэй філязофскі ўхіл. Усё часьцей узгадваецца Рудольф Штайнэр. Валя Смышляеў спрабуе намаўленьнем паскорыць рост маркоўных калівaў. Павал Андрэевіч [Арэнскі] захоплены гіпнозам. Усе трызьняць ёгамі. Міхаіл Чэхаў сумяшчае фанатычны празэлітызм з блюзьнерствам», — узгадвае Эйзэнштэйн у сваіх мэмуарах. (Неўзабаве актор і рэжысэр Міхаіл Чэхаў эмігруе з савецкай Расеі.)

«Я то гатовы лопнуць ад нуды, то разарвацца ад сьмеху, — падсумоўвае акультны досьвед Сяргей Эйзэнштэйн. — Нарэшце, мяне абвяшчаюць «вандроўным рыцарам» — выдаюць мне вольную — і я стараюся раскінуць маршруты сваіх вандровак надалей ад разэнкрайцэраў, Штайнэра, Блавацкай».

Але менавіта сябры па лёжы рэжысэр Смышляеў і мастак Нікіцін склалі пратэкцыю Эйзэнштэйну на спэктаклі «Мэксіканец», які ён дэкараваў. У сваім майстэрстве Эйзэнштэйн перарасьце й Смышляева, і Нікіціна (і новага настаўніка — Мэерхольда), але старыя веды нікуды не падзенуцца.

Цырымонія разэнкрайцэраўскага «пасьвячэньня ў рыцары» ператворыцца ў жартаўлівы рытуал «дабраслаўленьня рэжысэраў», які будзе даваць

Працяг на старонцы 38.



**«Разэнкрайцараўскае» дабраслаўленьне рэжысэраў.**

# Менск разэнкрайцэра Эйзэнштэйна

**Працяг са старонкі 37.**

Эйзэнштэйн сваім ВГІКаўскім вучням. А акультныя штудыі — разам з падручнікам эмбрыялёгіі, «Духоўнымі практыкаваньнямі Ігнація Ляёлы», кітайскай філязофіяй, статыстыкай колераў у Гогаля дый іншымі энцыкляпэдычнымі зьвесткамі — пойдуць у падмурак для выхаваньня маладых творцаў. (Курс распрацаваны самім Эйзэнштэйнам.)

Атрыманыя ў Менску акультныя навыкі саступяць месца авангардным экспэрымэнтам, і Эйзэнштэйн выйдзе на тэрыторыі, дасюль невядомыя ані мастацтву, ані патаемным таварыствам.

*Але актыўная апрацоўка псыхікі гледача, мізансцэны, у якіх чалавек — толькі гіерогліф агульнага рытму, непрыязнасьць да царквы — і небясьпечная ўвага да архаікі супадаюць са старымі захапленьнямі.* Ад дэбютнай стужкі **«Страйк»** (1924) да рэвалюцыйнага **«Браняносца «Пацёмкіна»**, 1925 (фільм справакаваў бунт на галяндзкім караблі, а былы жаўнер, які ў 1905 разгаляў дэманстрацыю, «плакаў за свае злачынствы на Адэскай лесьвіцы»), кананічнага **«Кастрычніка»** (1927), кадры зь якога ўвайшлі ў савецкія пад ручнікі па гісторыі, як сапраўдныя дакумэнты.

У 30-ыя гады Эйзэнштэйн шакаваў савецкую публіку прызнаньнем, што для стварэньня «вяршыннага» рэвалюцыйнага мастацтва трэба выкарыстоўваць «нізінную» *першабытную сьвядомасьць*. (Выкрыцьцё каштавала Эйзэнштэйну сталінскага ордэну, які ён мусіў атрымаць.) Між тым, правіла «тое, што наверсе, тое і ўнізе» ёсьць падставовым акультным прынцыпам. Прыгнечаны Эйзэнштэйн, які зноў наткнуўся на знаёмыя «рэгрэсіўныя зьявы», нават хацеў кінуць мастацтва, але знаны псыхоляг Леў Выгоцкі (ураджэнец Воршы) яго адгаварыў.

У 1929 годзе Эйзэнштэйн зьехаў за мяжу, каб вывучаць гукавое кіно. У Эўропе каманда Эйзэнштэйна, Аляксандрава й Цісэ, падпрацоўваючы халтуркай, зьняла першы ў сьвеце **музычны кліп** (з палюбоўніцай жамчужнага караля Марай Гры) і выпусьціла **прапагандовую стужку пра карысьць абортаў**.

Галівуд быў зьляканы ідэямі Эйзэнштэйна па экранізацыі «Амэрыканскай трагедыі» (у 60-я ўвасобяцца распрацаваныя Эйзэнштэйнам прыёмы «ўнутранага маналёгу» ў кіно). Затое ў Мэксыцы Эйзэнштэйн адарваўся напоўніцу.

Стужка **«Жыве Мэксіка!»**, якая нагадвала рэжысэру пра тэатральны дэбют пад апекаю сяброў-разэнкрайцэраў, была нястрыманым карнавалам, калі ў Дзень памерлых (аналяг нашых Дзядоў) жыцьцё перамагае сьмерць. Каталіцкае барока, ацтэкскія піраміды, танец карыды, экстаз Веры — і пачуцьцёвасьць. Карціна мусіла стацца найлепшай у творчасьці Эйзэнштэйна, але яна так і не была змантажаваная.

Сталін, разьюшаны чуткамі, што Эйзэнштэйн, маўляў, здымае фільм пра Сталіна, ультыматыўна загадаў рэжысэру неадкладна пакінуць Мэксіку.

Карціна **«Бежын луг»**, зьнятая ў разгар сталінскіх рэпрэсіяў (1935—37), сталася самым адыёзным, самым асабістым і самым разэнкрайцэраўскім фільмам Сяргея Эйзэнштэйна. Стужка зьнятая паводле гісторыі Паўліка Марозава.

Цэнтральная сцэна фільму — разгром царквы. Хруст выдранага алтара, зьнятыя абразы — і шчасьлівыя твары людзей, якія зьзяюць праз садраныя аклады. Вызваленая зграя белых галубоў, якая ўздымаецца над спляжанаю царквой.

Падчас здымак Эйзэнштэйн нечакана захварэў. Лекары, якія баяліся чумы й воспы, пасадзілі рэжысэра ў ізалятар і «кармілі, як арангутанга, праз краты».

Неўзабаве фільм быў працягнуты — і забаронены «за містыцызм і фармалізм». Сталіну асабліва не спадабалася, што параненый піянэр забірае ў бацькі вінтоўку і дарue ўласнае забойства.

«Мы ня можам дапусьціць, каб кожнае дзіця рабіла, як савецкая ўлада!» Стужка не захавалася — і ў 1967 годзе па зрэзках быў створаны фотафільм.

За «містыцызм» Эйзэнштэйн мусіў публічна каяцца, зьняўшы **«Аляксандра Неўскага»** (1938).

У фінальнай карціне **«Іван Жахлівы»** (1944—45) Эйзэнштэйн з трагедыйнай велічу паказаў, як тыран губляе душу, апантаны абсалютнай уладай.

Першую сэрыю дыктатар праглынуў, як нажыўку, і прывеціў сваім ордэнам. Бізантыйская раскоша, змовы, палац ворага-Жыгімонта, як шахматная дошка… Але стары сябра па лёжы, Міхаіл Чэхаў, раскусіў небясьпечную задуму й даслаў Эйзэнштэйну натхнёнае віншаваньне.

Другая сэрыя выклікала шал. «Ня ведае гісторыі!» — крычаў Сталін, разлляваны асуджэньнем апрычніны і лютым царом-марыянэткай. «Гэта проста нейкія хлыстоўскія скокі!» — дадаваў Берыя, пакрыўджаны фінальнаю сцэнай.

Трэцяя сэрыя была скасаваная. Другую было загадана перарабіць.

Ад арышту Эйзэнштэйна выратавала толькі сьмерць.

Памёр Сяргей Эйзэнштэйн ад сардэчнага прыступу, пад агромністай выявай ацтэкскага бога Кецалькаатля, у 50 гадоў, — як і насурочыў рэжысэру галівудзкі хірамант Кіру.

**Андрэй Расінскі**



**Ложа разэнкрайцараў у Менску. Зьлева направа: Іван Смолін, Барыс Плетнэр, Барыс Зубакін, Павел Арэнскі і Сяргей Эйзэнштэйн.**

**Разэнкрайцэры**

таемнае таварыства для заняткаў акультызмам і алхіміяй, што зьявілася ў Нямеччыне ў 1614 г. Самі разэнкрайцэры называюць заснавальнікам брацтва нейкага Хрысьціяна Разэнкрайца, які быццам бы жыў у XIV ст. Але маніфэст 1614 г. быў складзены пастарам Іаганам Андрэ, як пародыя на таемныя таварыствы. Пародыя атрымалася настолькі ўдалай, што зьвіўся сапраўдны ордэн, якому была прыдуманая доўгая біяграфія — з часоў эгіпецкіх фараонаў. Важную ролю ў разэнкрайцэрстве займаюць акультныя практыкі па кантакце з «іншаплянэтнымі апекунамі». Сучасныя «адкрыцьці» пра прышэльцаў–выкрадальнікаў ці касьмічныя фантазіі Язэпа Драздовіча нясуць на сабе адбітак разэнкрайцэраўскай філязофіі.



Эйзэнштэйн на здымках «Івана Жахлівага».

**Зь менскага ліста Эйзэнштэйна**

«Менск, 4/VIII–20 Гатэль Лівадыя

<…> Тут — проста Эўропа. Зусім свабодна прадаюцца, напрыклад, лімоны (і толькі 350 р. штука!), бульбяная мука (200 р.!), рыс (1400 р.), міндаль, чарнасьліў, грэцкія арэхі, цыкоры, шакаляд (ад 600 р. («хатні» нямецка–польска–ваенны–какава–мёд) да 4.000 р. — сапраўдны Cailer!), эмаляваны посуд, падцяжкі, бялізна (ідэальная), булкі (200 р. штука) etc. Ёсьць «кава», сапраўдная, сельтэрская, з экстрактам (15 р. шклянка). Сода ледзьве ня ў кожнай краме (1000 р. фунт). Агулам — усё, акрамя грошай. Але, мабыць, будзе магчымасьць добра зарабіць, хаця мой асноўны аклад вельмі маленькі — 3.600 р. (бо я не атрымліваю 100% на касьцюмы, як акторы). Уваходжу ў Прафэсійны Зьвяз Работнікаў Мастацтва, прафэсія — мастак, спэцыяльнасьць — дэкаратар, майстар пастановак! <…>

Ехалі са Смаленску — тыдзень. Тры дні стаялі ў знакамітым спаленым Барысаве. Усе станцыі на шляху (і вакзал Менску) спаленыя дашчэнту, масты разбураныя — паўсюль часавыя. Сам Менск, акрамя ўсіх апісаных «атракцыёнаў», сам па сабе, — чароўны: чысьцюткі эўрапейскі гарадок, нават з «архітэктурай», таксама новай — імпэрыя ў Эўропе. Ці доўга працягнуцца ўсе гэтыя цуды й вабноты — ня ведаю. (Прыпіска на палях: Днём і ўначы электрычнасьць! Эўропа! Ёсьць нават <…> Парыскія моды лета 1920 г.) <…>

**Пераклад зроблены з выданьня: Никитин А.Л. Московский дебют Сергея Эйзенштейна (1920-1921). М.: «Интеграф Сервис», 1996, с.21-23.**

**Пераклаў Андрэй Расінскі**

**З мэмуараў**

Я ніколі не забуду памяшканьня «ложы ў Менску»!

У прахадным двары — аднапавярховы дом, заняты пад чырвонаармейскі пастой.

Некалькі пакояў з ложкамі, анучамі, абмоткамі, гармонікам і балалайкай.

Чамусьці заклапочаныя й задумлівыя чырвонаармейцы.

Маленькія дзьверы далей.

За дзьвярыма штосьці кшталту былога кабінэту зь пісьмовым сталом з адарванымі дзьверцамі.

Далей яшчэ дзьверы ў зусім маленькі пакойчык.

Мы прыходзім туды — некалькі чалавек.

Агромністага росту, былы анархіст, здэгенэраваны расейскі арыстакрат зь нямецкім прозьвішчам. Няўдачнік — сын аднаго з другасных расейскіх кампазытараў. Актор Смолін зь перасоўнай франтавой трупай. Паміж выкананьнем ролі Мірцава ў п'есе «Вера Мірцава» (той п'есе, што распачынаецца са стрэлу ў цемры, якім жонка пракурора забівае палюбоўніка, і п'еса будуецца на тым, як крок за крокам пракурор упэўніваецца, што забойца — ягоная жонка) — ён лечыць мігрэні накладаньнем рук і гадзінамі глядзіць у крышталёвы шар у сваім нумары гатэлю.

Трэнькае за дзьвярыма балалайка.

Грукаюць кацялкі зь вячэраю з паходнай кухні ў двары.

А тут — накінуўшы белую кашулю на гімнасьцёрку і абмоткі — тройчы жазлом ударае ў падлогу цыбаты анархіст.

Апавяшчае, што «біскуп Богары гатовы нас прыняць».

Абмываньне ног пасьвячоным рукамі самога біскупа.

Дзіўная парчовая мітра і кшталту эпітрахілі на ім.

Нейкія словы.

І вось мы, узяўшыся за рукі, праходзім каля люстэрка.

Люстэрка пасылае саюз наш у… астрал.

Балалайку за дзьвярыма зьмяняе гармонік.

Чырвонаармейцы ўжо вясёлыя.

Іхная туга была чаканьнем вячэры.

А мы ўжо… рыцары.

Разэнкрайцэры.

**Пераклад зроблены з выданьня: Эйзенштейн С.М. Мемуары. Том первый. М.: Редакция газеты «Труд», Музей кино, 1997, с. 61-63.**

**Пераклаў Андрэй Расінскі.**

# У марах аб дэмакратычнай школе

Сёлета легендарны настаўнік **Віктар Шаталаў** адзначыў 80-годзьдзе.



Шаталаў праводзіць сэмінар у Магілёўскай мэдвучэльні. У 1983 годзе яе выкладчыкі прапанавалі органам адукацыі Магілёва запрасіць В.Шаталава, але атрымалі адмову. Тады яны сабралі складчыну і запрасілі вядомага настаўніка, аплаціўшы яму камандзіровачныя сваімі грашыма.

АЛЕСЬ ГАЙКОЎ

Вядомасьць ягоная была даволі скандальнай. Хоць ён называў сваю сыстэму навучаньня найбольш стасоўнай менавіта да сацыялізму, стырнавыя таго самага сацыялізму адчувалі разбуральнасьць ягоных ідэяў і агрэсіўна супраціўляліся. І яму даводзілася працягваць новыя ідэі неймавернымі высілкамі.

Уявіце, што ў школе, у якой прадвызначана і прадпісана ўсё — і як сядзець на ўроку, і колькі старонак «адсюль — дасюль» прачытаць на заўтра, і якую прычоску мець, — прыходзіць настаўнік на ўрок і абвяшчае: «Я сёньня задам вам хатняе заданьне і больш у гэтым годзе задаваць ня буду». У клясе ажыўленьне і радасныя воклічы. «Але ў гэтым заданьні чатырыста задачаў». — «Уууу!..» — «І вы можаце разьвязваць іх, як захочаце: або ўсе за месяц і далей адпачываць, або па дзьве—тры ў дзень, а можна і ўвогуле не разьвязваць, бо на тройку я вас навучу і на ўроках».

Вучні — ці не ўпершыню за сваё жыцьцё — атрымлівалі свабоду дзеяньняў, як быццам дакраналіся да дэмакратыі. Было цікава назіраць за імі. Можна не разьвязваць — і натуральна знойдуцца тыя, хто на пачатку скарыстае такую мажлівасьць. Але гэта прыводзіць да невысокай адзнакі, а вышэйшая адзнака дасягальная, бо настаўнік так добра ўсё тлумачыць з выкарыстаньнем такіх зразумелых і запамінальных малюнкаў, што не зразумець немагчыма. А на ўроках разьвязваюцца падобныя задачы, і яны ўжо не здаюцца складанымі.

Акрамя таго, у клясе вісіць ведамасьць, дзе разьвязаныя задачы адзначаюцца зафарбаванымі клетачкамі. І ўсім бачна, хто колькі задачаў змог разьвязаць. І тут праяўляецца статкавасьць чалавечай псыхалёгіі: быць адным з апошніх нястрашна, а быць самым апошнім вельмі непрыемна. А ведамасьць якраз і паказвае, хто самы апошні. І калі настаўнік добразычліва прапануе такому «адставальніку» пасьляўрочную дапамогу, той ахвотна яе прымае. Стыхійныя спаборніцтвы сярод лепшых вучняў — асобная гаворка.

Вынікам становяцца высокаякасныя веды і надзейна засвоеныя ўменьні. Гэта было настолькі непадобна на шэрасьць нацягнутых савецкіх троек, што не магло ня выклікаць агрэсіі кіроўных вярхоў Міністэрства адукацыі. А Шаталаў яшчэ падражніў іх кніжкай з нахабнай назвай «Куды і як зьніклі тройкі».

Публікацыі 1970-х пра яго былі настолькі супярэчлівымі, што не маглі не ўзбудзіць цікавасьці. Адны скептычна крывілі вусны і папракалі «скандаліста» ў пахвальбе і пошуку таннай славы. Іншыя, ня здолеўшы нічога зразумець з прэсы, ехалі ў Данецк, каб убачыць на ўласныя вочы.

Мне, на той час маладому настаўніку, аднойчы трапілі на вочы дзьве публікацыі. «Знамя юности» надрукавала ўражаньні дырэктара Менскага элекратэхнікуму сувязі Жукава, які вярнуўся з трохдзённага сэмінару Шаталава (гэты артыкул не ўзяліся друкаваць ні «Советская Белоруссия», ні «Звязда»). А маскоўская «Учительская газета» ці ня ў той жа дзень выбухнула зьедліва-крытычным опусам пра «данецкія цуды». Я выпрасіў у дырэктара тыдзень адпачынку і паехаў у Данецк. Гэтая паездка рэзка зьмяніла мае як настаўніцкія, так і чалавечыя погляды. Я далучыўся да змагароў за новую пэдагогіку.

«Калі гэтая партыя вас не разумее і не падтрымлівае, чаму б вам не стварыць новую партыю?», — пацікавіўся я неяк у Шаталава. Ён усьміхнуўся: «Калі б камары лёталі радочкам, зь імі было б вельмі лёгка змагацца». Але, фактычна, ягоная партыя існавала. Той, хто прыяжджаў у Данецк, станавіўся прыхільнікам новых ідэяў і калі хацеў надалей атрымліваць інфармацыю, дасылаў лісты і ўкладаў капэрту з зваротнай адрэсай. У капэрце ён атрымліваў скапіяваныя падборкі публікацыяў з самых розных выданьняў мясцовай, цэнтральнай ці замежнай прэсы і кароткія прыпіскі самога В.Шаталава. Такіх капэртаў спадар Віктар рассылаў штодзень па некалькі дзясяткаў. І калі нейкаму настаўніку, які ўзяўся працаваць «паводле Шаталава», чынавенства пачынала перашкаджаць, той паведамляў пра гэта ў Данецк, копія паведамленьня рассылалася — і з розных куткоў вялікай краіны пачыналі ісьці лісты ў мясцовыя органы кіраваньня, мясцовую і цэнтральную прэсу. Зьбянтэжаныя націскам чыноўнікі на нейкі час пакідалі «нестандартнага» настаўніка ў спакоі.

Гэткую сытуацыю давялося перажыць і мне. Калі кіраўніцтва пэдінстытуту, дзе я працаваў, пераканалася, што зьмяніць мае погляды не выходзіць, мяне з грубымі парушэньнямі закону звольнілі. Хутка гнеўныя настаўніцкія лісты пачалі прыходзіць і ў ЦК КПСС, і ў ЦК КПБ, а таксама ў «Праўду», «Труд», «Литературную газету»... «Известия» даслалі ў Магілёў карэспандэнтку, вывучэньнем сытуацыі заняўся ЦК КПБ, і рашэньне аб звальненьні было адмененае.

Думаю, гэты досьвед быў бы вельмі карысным для сёньняшняй Беларусі.

80-гадовы Віктар Шаталаў працягвае працаваць прафэсарам Данецкага інстытуту сацыяльнай адукацыі і праводзіць свае сэмінары (пераважна ва Ўкраіне і Расеі). Да юбілею ўкраінскі ўрад узнагародзіў яго найвышэйшай настаўніцкай узнагародай — залатым мэдалём Ушынскага, Акадэмія пэдагагічных навук Украіны абрала яго ганаровым доктарам. Але самым істотным ён лічыць тое, што афіцыйная газэта «Голос України» прынесла яму прабачэньні. «Не пасьмяротна, а жывому», — зь непрыхаваным задавальненьнем напісаў ён мне.

**Міхась Булавацкі, Магілёў**

# Дружа Жук

ВОЛЬГА КЛЯЗОВІЧ



Ж-жу-жжу-жы-ж-ж-ж!!!
Жук, ёсьць у цябе крылцы?
Ты ўмееш уласны колер зьмяняць?
А куды ты паўзеш?
І чаму так суцішыўся на далоньцы маей?
Можа, ты мой?
Мой сябар з далёкай-далёкай зямлі
Ўсё поўз, усё імчаў і шукаў,
І нарэшце... сустрэліся мы!
Ну, куды ж папаўзём-паляцім
Мы з табой, даўгачаканы
Дружа мой?
Ж-жу-жы-жж-жу-у-у-у...

# Фолк у Казе


«Госьціца».

8 сьнежня малая заля к/з «Мінск» запрашае ўсіх аматараў беларускага фолку на фэст з удзелам гуртоў «Госьціца», Guda, «Ліцьвіны». Фэст зьмесьціць у сабе канцэртную частку, а таксама прэзэнтацыю перавыданьняў альбомаў «Архаічныя абрадавыя сьпевы» Guda, «Неба і Зямля», «5 сакавіка» «Ліцьвінаў» і дзьвюх частак «Каляды. Рожство. Шчодрэц» Юр'я Выдронка.

«Госьціца» — адзіны ў Беларусі тэатар аўтэнтычнай і архаічнай музыкі і харэаграфіі, які перайшоў мяжу этнаграфізму і зьвяртаецца да гледача на сучаснай мове танцу мадэрн. Яго кампазытар, харэограф і рэжысэр Ларыса Сімаковіч: «Мы плянуем прэм'еру новай кампазыцыі! Гэта будзе невялічкі спэктакль на 15—20 хвілін у жанры фолк-мадэрн-балет пад назвай «Зацірка» (працоўная падназва «Стварэньне матэрыі»). У пастаноўцы, акрамя непасрэдных удзельнікаў — А.Варахоўскай, С.Зелянкоўскай, С.Яфімавай, — будуць задзейнічаныя такія «пэрсанажы», як цымбалы, посьцілкі, каровіны званочкі і — стол, на якім і будзе замешвацца зацірка. Таксама слухачоў чакае аўтэнтычны фальклёр у выглядзе загавораў, прыгавораў, песень і, канечне ж, плястыка!»

Выканаўцы гурту Guda практыкуюць гарлавы сьпеў, які паходзіць ад гучнага сьпеву на адкрытым паветры. Аснову рэпэртуару складаюць абрадавыя песьні — найбольш архаічны пласт традыцыйнай народнай культуры. На канцэрце Guda прадставіць песьні, добра вядомыя слухачам, а таксама творы зь вясельнай праграмы, што раней не агучвалася альбо агучвалася часткова. Вікторыя Міхно, салістка гурту Guda: «Канцэптуальным падмуркам плыты «Архаічныя абрадавыя сьпевы» зьяўляецца беларускі абрадавы каляндар. Альбом — вынік амаль 10-гадовай працы гурту, дзе прадстаўленыя сапраўдныя пярліны беларускага фальклёру. А яшчэ слухачы стануць сьведкамі сапраўднай падзеі ў жыцьці гурту — у нас чатыры новыя ўдзельніцы!»


«Юры Выдронак».

Фолк-гурт «Ліцьвіны» грае аўтэнтычны беларускі фолк. Саліст гурту, фальклярыст і дудар Уладзімер Бярбераў: «8 сьнежня — гэта ўжо ня восень, але яшчэ і не сапраўдная зіма. Таму мы выканаем колькі восеньскіх і зімовых песень».

Юры Выдронак спрычыніўся да дзейнасьці гуртоў «Палац» і «Крыві», ачольваў гурт «Юр'я», быў арганізатарам фэстывалю сучаснага фальклёру «Таўкачыкі» (2000, 2004 гг.). Выдронкам рэстаўраваныя больш за 50 гадзінаў гучаньня аўдыё- і відэазапісаў каляндарна-абрадавай песеннасьці Чарнобыльскага рэгіёну. «Альбом у дзьвюх частках «Каляды. Рожство. Шчодрэц» сабраў у сабе матэрыял з экспэдыцыяў і рэстаўрацыйных фондаў, а таксама тое, што прыносілі нам людзі на касэтах. Але найцікавейшае ў ім — самі выканаўцы, самабатныя народныя сьпявачкі,» — гаворыць Юры Выдронак.

Даведкі пра канцэрт і замова квіткоў: (029) 649 08 88; (029) 766 24 25

**Дар'я Гарошка, фота Андрэя Лянкевіча**


«Гуда».

«Ліцьвіны».


## ВЫСТАВЫ

### Новая архітэктура Бэрліну

**Да 1 сьнежня ў кінатэатры «Перамога» (Інтэрнацыянальная, 20)** працуе выстава «Горад і дом. Новая архітэктура Бэрліну». На выставе можна ўбачыць 40 праектаў, зьдзейсьненых пасьля аб'яднаньня Нямеччыны: ад ратушы, гарадзкога гатэлю да жылых комплексаў з офісамі.

### Гравюры Ота Дыкса

**Да 16 сьнежня ў музэі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр. Незалежнасьці, 47)** працуе выстава «Ота Дыкс. Крытычная графіка 1920—1924». У сваіх гравюрах мастак рэалістычна паказвае паваеннае грамадзтва: вэтэранаў і інвалідаў, маргіналаў пасьляваеннага часу. Сваімі працамі мастак не спрабаваў зьмяніць людзей — ён проста імкнуўся паказаць рэчаіснасьць.

### Жодзінцы

**30 лістапада 2007 году а 16-й гадзіне ў Полацкай мастацкай галерэі (Полацак, вул. Карла Маркса, 2а)** адбудзецца літаратурна-мастацкая імпрэза і адкрыцьцё выставы «Жодзінцы». Удзел возьмуць Алесь Аркуш, Аляксей Марачкін, Уладзімер Сіўчыкаў, Валер Славук, а таксама творцы-палачане. Выставу, якая экспанавалася ў Жодзіне з 8 кастрычніка і рэпрэзэнтавала дваццаць мастакоў, мяркуецца паказаць у наступным годзе ў Горках, Лагойску і Менску.

### Жывапіс, вершы, пазлы

**Да 2 сьнежня ў арт-галерэі «Падземка» (пр. Незалежнасьці, 43)** працуе выстава твораў Андрэя Бурсава, менскага фатографа, мастака, паэта.




## ПРЭЗЭНТАЦЫЯ

### Narodny Albom

**18 сьнежня ў клубе «Фартуна» (вул. Смаленская,15)** адбудзецца юбілейны канцэрт супольнага музычнага праекту «NARODNY ALBOM» — 10 гадоў. **Пачатак а 19-й.** Квіткі ад 20 000 да 27 000. Даведкі: 194-88-87, 710-39-04.

### Вершы Алеся Камоцкага

**29 лістапада ў Музэі Багдановіча (Траецкае перадмесьце)** пройдзе прэзэнтацыя кнігі выбраных вершаў Алеся Камоцкага «Глыбіня дажджу». **Пачатак у 15.30.** Даведкі па т.: (029) 253-25-04.

### Новы фільм пра Плошчу

**7 сьнежня на Ўправе Партыі БНФ (пр. Машэрава, 8)** — прэм'ерны паказ дзьвюх частак фільму рэжысэра Сержука Патаранскага **«Ў сьнягах драмае вясна»**, які распавядае пра падзеі Менскай вясны-2006. У імпрэзе возьмуць удзел героі Плошчы і, адпаведна, прэзэнтаванага фільму.

## ТЭАТРЫ

### Купалаўскі тэатар

**1 (сб)** — «Ромул Вялікі».
**2 (ндз)** — «Паўлінка».
**3 (пн)** — «Ідылія».
**4 (аўт)** — «Камэдыя».
**5 (ср)** — «Сымон-музыка».
**6 (чц)** — «КІМ».
*ранішнія спэктаклі*
**2 (ндз)** — «Паўлінка».
*малая сцэна*
**1 (сб)** — «Востраў Сахалін».
**2 (ндз)** — «Маці».
**5 (ср)** — «Варшаўская мэлёдыя»
**6 (чц)** — «Беларусь у фантастычных апавяданьнях».

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# «Імгла» і «Бэавулф»

Карціна Фрэнка Дарабонта паводле Стывэна Кінга і кампутарызаваны міт Робэрта Зэмэкіса

**Імгла** (Mist)

ЗША, 2007, каляровы, 127 хв.

**Рэжысэр:** Фрэнк Дарабонт

**Ролі выконваюць:** Томас Джэйн, Марсіа Гэй Гардэн, Натан Гэмбл, Алекса Давалас

**Жанр:** Фантастыка паводле апавяданьня Стывэна Кінга і сцэнару Фрэнка Дарабонта

Пасьля буры на мястэчка спускаецца туман. А разам з туманам у горад прыходзяць жудасныя істоты. Невялічкая група людзей барыкадуецца ў супэрмаркеце…

Карцінаў пра нашэсьце пачвараў на маленькія амэрыканскія гарадкі існуе незьлічоная колькасьць, дый Стывэну Кінгу рэдка шанцавала на добрыя экранізацыі. Але рэжысэр Фрэнк Дарабонт, творца «Зялёнай мілі», пераўтварае звыклы сюжэт у замаскаванае сацыяльнае пасланьне.

Ізаляваная група — мадэль грамадзтва, а вусьціш высьвечвае чалавечую натуру. Зацятыя бойкі за аўтарытэт, рэлігійны фанатызм (рэй вядзе калярытная Марсія Гэй Гардзін). Небясьпека хаваецца ня столькі ў тумане, колькі ў позірках суайчыньнікаў, гатовых прынесьці ў ахвяру бліжняга. А нестандартны фінал стужкі — падкоп пад «суцяшальніцкі» жанр кашмараў і падрыў амэрыканскае мары. Галоўная імгла — у сэрцы.

**Бэавулф** (Beowulf)

ЗША, 2007, каляровы, 115 хв.

**Рэжысэр:** Робэрт Зэмэкіс

**Ролі выконваюць:** Рэй Ўінстан, Энтані Гопкінз, Джон Малкавіч, Крысьпін Гловэр, Анджэліна Джолі

**Жанр:** Кампутарна-іграві міт паводле аднайменнай легенды

Землі караля Хродгара спусташаюцца тролем Грэндэлем. Герой Бэавулф прыходзіць на дапамогу каралю, але ў пачвары ёсьць яшчэ маці…

Робэрт Зэмэкіс пераўтварае актораў у кампутарныя лялькі. На целы актораў усталёўваліся датчыкі, рухі лічбаваліся — адылі атрымаліся віртуальныя макеты Джолі, Гопкінза, Малкавіча. Падобная тэхніка дазволіла стварыць цалкам міталягічны сьвет з быццам бы жывымі акторамі.

Бойка аголенага Бэавулфа з пачварай атрымала 6 у іграрым кіно жорсткае цэнзурнае абмежаваньне, што адсекла б мэтавую аўдыторыю падлеткаў. Але выратоўваюць кампутарныя тэхналёгіі. А галоўная прынада фільму — аголеная Анджэліна Джолі ў ролі спакусьлівай дэманіцы.

Але гаварыць пра акторскую гульню — дый, увогуле, пра кіно не выпадае. Стужка Зэмэкіса — сама шыкоўны рэклямны ролік кампутарнае гульні, што распрацоўнікамі й не хаваецца.

**Андрэй Расінскі**

# пра-бел / пра-сьвет

Эсэістыка • Крытыка • Рэфлексіі


Музыкі расставілі кропкі над «і» .... 26
Лявон Вольскі: «Ніхто з тых музыкаў на гандаль ня пойдзе» .... 27
Кульлінковіч: За гэтыя два дні на нас вылілі багата г…ўна .... 28
Дырэктар «Рок-Кола»: «Я вымушаны звольніцца з працы» .... 28
Люфт-мэнч Вольф Рубінчык. Піша Наталка Бабіна .... 31
Утопія і рэальнасьць «Гораду Сонца». Раман Артура Клінава прымушае задумацца: ці можна падзяліць эстэтыку і злачынства? .... 34
Артур Клінаў: «Кожная ўнікальнасьць, адкуль бы яна ні вырастала, мае вартасьць» .... 35
Дэльфіна Пае: «Культура — гэта добры сродак, каб зацікавіць людзей» .... 36
Сяргей Харэўскі: «Гарады мусяць існаваць для тых, хто ў іх жыве» .... 37
Захар Шыбека: «Вобраз места зьяўляецца сам па сабе, яго ня трэба прыдумваць» .... 38
Вольга Стужынская: «Прыйшоў час, калі краіну трэба паказваць зь іншага боку» .... 39
Менск разэнкрэйцэра Эйзэнштэйна. Піша Андрэй Расінскі .... 40
У марах аб дэмакратычнай школе. Сёлета легендарны настаўнік Віктар Шаталаў адзначыў 80-годзьдзе. Піша Міхась Булавацкі .... 44


## КАЛІ Б…

**…пасьля «Маршу нязгодных» у Маскве пад кіраўніцтвам Гары Каспарава ўлады падумалі, што апазыцыйныя настроі выклікаюцца гульнёй у шахматы.**



**Вядучы:** Па просьбах працоўных саўмін Саюзу Беларусі і Расеі зьмяніў правілы гульні ў шахматы: цяпер замест «мат» трэба казаць «пераабраньне караля на наступны тэрмін».


«Нашу Ніву»
пытайцеся на сядзібе ТБМ кожны будні дзень ад 17.00 да 19.00.





# А ты падпішыся!

Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву», проста падпішыце дамову. Дэталі — **старонка 17.**


## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Віншуем спадара Генадзя Вінярскага** з Днём народзінаў. Супрацоўнікі

### СПАЧУВАНЬНІ

**Памёр Раман Фрыдман.** Шчырыя спачуваньні родным і блізкім.

### КНІГІ

**Зарыян Далэнга-Хадакоўскі** «Выбранае» і Якуб Колас «Выбранае» — 38 і 39 кнігі сэрыі «Беларускі кнігазбор» ужо ў кнігарнях і распаўсюднікаў.

**Адам Мальдзіс** «Выбранае» і Аляксей Карпюк «Выбраныя творы» з сэрыі «Беларускі кнігазбор» пабачаць сьвет у сьнежні гэтага году. Кнігі на беларускай, ангельскай мовах. Для падарунка сябрам і іншаземцам, тым, хто вывучае бел., англ. мовы, цікавіцца гісторыяй. Філафанія, нумізматыка. Т.: 753-91-96. alesknigi@mail.ru

**Набор, рэдагаванне**, інтэрвію, аналітыка, падбор, апрацоўка інфармацыі, матэрыялу, падрыхтоўка рукапісу да друку, пераклад, выдавецкія праекты, распаўсюд. Т.: 753-91-96. alesknigi@mail.ru

### ФАРСІ

**Урокі фарсі** і пэрсыдзкага танцу. Зімой вучымся, летам едзем у Іран. Т.: 798-03-42

### ДОМ

**Прадам** за 54 т. цагляны дом плошчай 100 кв.м. (зроблены на 90 %) з участкам (6 сотак), побач зь Менскам (1,5 км). Ёсьць электрычнасьць, вада , печка, падводзіцца газ. Т.: 8-029-576-74-29

### КАЦЯНЯТКА

**Аддамо беларускамоўнае** кацянятка ў добрыя рукі. Т.: 798-03-42



Дзікара і Джулію
віншуем
з народзінамі сына
Сябры

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Пэрсія. 31 акцябра Шах (цар пэрсыдзкі) прысягнуў перад сваім народам, што будзе верным канстытуцыі.
**«Наша Ніва». № 33. 1907**


**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**



© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.



12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2270. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 28.11.2007.
Замова № 6510.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.